*17 чэрвеня 1973 года — усенароднае свята — дзень выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных.*

ГАЛАСУЮЧЫ ЗА КАНДЫДАТАЎ НЕПАРУШНАГА БЛОКУ КАМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ, САВЕЦКІЯ ЛЮДЗІ ЯШЧЭ РАЗ ПРАДЭМАНСТРУЮЦЬ СВАЁ МАРАЛЬНА-ПАЛІТЫЧНАЕ АДЗІНСТВА, СВАЮ ЗГУРТАВАНАСЦЬ ВАКОЛ РОДНАЙ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ.

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Літаратура і Мастацтва

ВЫДАЕЦЦА З 1932 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 24 (2655) • Пятніца, 15 чэрвеня 1973 года • Цана 8 кап.

**Барыс Эмерыкавіч Шабуневіч — адзін з лепшых машыністаў Беларускай чыгункі. Вось ужо трынаццаць гадоў водзіць ён поезды на ўчастку Мінск—Брэст. Шлях складаны, скарасны. Але не было яшчэ выпадку, каб Барыс Эмерыкавіч выбіўся з графіка, каб поезд, які ён вядзе, спазніўся.**

**Б. Шабуневіч не толькі заслужаны працаўнік, ён і грамадскі дзеяч — дэпутат Кастрычніцкага раённага Савета дэпутатаў працоўных г. Мінска, намеснік старшыні пастаяннай камісіі па камунальнай гаспадарцы.**

**Па сваіх дэпутацкіх справах Барысу Эмерыкавічу даводзіцца нярэдка бываць на розных прадпрыемствах, вырашаць там сур'ёзныя і складаныя пытанні. Часта сустракаецца ён і са сваімі выбаршчыкамі, у якіх карыстаецца вялікім аўтарытэтам. Вось чаму і на гэты раз Б. Шабуневіч вылучаны кандыдатам у дэпутаты Кастрычніцкага райсавета.**

**Уважлівы і засяроджаны — такі Барыс Эмерыкавіч і ў кабіне цеплавоза (верхні здымак) і за выкананнем грамадскіх абавязкаў — на ніжнім здымку Б. Шабуневіч (справа) разам з інструктарам райвыканкома Л. Буркіным знаёміцца з пісьмамі працоўных.**

Фота І. ЗМІТРОВІЧА. БЕЛТА.

## ГАСТРОЛЬНАЕ ЛЕТА

З поспехам прайшлі на Смаленшчыне гастролі Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. У рэпертуары гастролей — тры п'есы А. Макаёнка: «Трыбунал», «Зацюканы апостал», «Таблетку пад язык», камедыя В. Вольскага «Несцерка». Смаленская дзетвара цёпла прыняла казку «Пунсовая кветачка».

З творчасцю беларускіх артыстаў пазнаёміліся шматлікія сельскія гледачы. Коласаўцы выступалі ў калгасах і саўгасах Духаўшчынскага, Смаленскага, Пачынкаўскага раёнаў, а таксама ў горадзе Вязьме. Усюды артыстаў сустракалі кветкамі, хлебам-соллю.

Смаленскі глядач высока ацаніў майстэрства народных артыстаў БССР І. Матусевіча, З. Канапелькі, маладых артыстаў Б. Сяўко, С. Акружной і іншых...

Гастрольныя выступленні артыстаў Віцебскага тэатра з 1-га чэрвеня пачаліся на Украіне. Яны працягнуцца ўвесь месяц.

**А. ПАЛОНСКІ.**

●

Спектаклем «Таблетку пад язык» па п'есе А. Макаёнка пачаў свае гастролі ў Магілёве Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы. Магіляўчане цёпла сустрэлі артыстаў, паднеслі ім букеты кветак. Ад імя артыстаў гледачоў вітаў дырэктар тэатра заслужаны дзеяч культуры БССР І. Ф. Міхалюта. Ён адзначыў, што за апошнія пяць гадоў калектыў тэатра прыязджае ў Магілёў трэці раз. У гэты раз купалаўцы пакажуць «Паўлінку», «Хто смяецца апошнім», «Трыбунал», «Амністыю», «Без віны вінаватыя», «Безыменную зорку», а таксама прэм'еру па п'есе Б. Васільева «Вясёлы тракт».

Многія спектаклі тэатр пакажа працаўнікам сяла, артысты выступяць у сельскіх дамах культуры вобласці.

Гледачы горада на Дняпры пазнаёмяцца з усім рэпертуарам тэатра, убачаць усе тыя п'есы, якія ставяцца на мінскай сцэне.

**Ул. БЕЛЕНЬКІ.**

## ВЫСТАЎКА ЎКРАІНСКАГА МАСТАКА

У мастацкім салоне Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза мастакоў БССР адкрылася персанальная выстаўка ўкраінскага мастака Аляксандра Байдукова, на якой дэманструецца звыш 40 работ. У асноўным гэта акварэльныя лісты, прысвечаныя прыродзе Валыні. Аляксандр Байдукоў з майстэрствам перадае паэтычнасць Валыні з яе таямнічымі, казачнымі лясамі і азёрамі, з помнікамі старажытнасці. Увагу прыцягваюць работы «Казка Белага возера», «Палессе», «Кіеўская Русь», «Багатая восень», «Нацюрморт з грыбамі» і шмат іншых.

**Р. БАКІЕВІЧ.**

## ПАМЯЦІ КАМПАЗІТАРА

*Савет Міністраў Беларускай ССР прысвоіў імя народнага артыста БССР Мікалая Ільіча Аладава дзіцячай музычнай школе № 2 г. Мінска. У далейшым яна будзе называцца: дзіцячая музычная школа № 2 імя М. І. Аладава.*

*Школа — адна з лепшых музычных навучальных устаноў рэспублікі. Дзеці рабочых аўтамабільнага і падшыпнікавага заводаў вучацца тут больш чым па дваццаці інструментах.*

*На доме № 30 па Ленінскім праспекце ў Мінску, дзе жыў кампазітар, будзе ўстаноўлена мемарыяльная дошка.*

**БЕЛТА.**

## НОВЫЯ НАЗВЫ НА АФІШАХ

П'есу М. Анкілава «Салдацкая ўдава» паставіў Магілёўскі абласны драматычны тэатр. Рэжысура заслужанага артыста БССР А. Раеўскага і выпускніка Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута А. Кукшынскага, афармленне мастака В. Гараднякова.

На здымку — сцэна са спектакля.

Фота В. КАРАЛЕВА.

Калектыў Брэсцкага тэатра імя Ленінскага камсамола Беларусі паказаў камедыю-рэпартаж «Таблетку пад язык» А. Макаёнка ў пастаноўцы рэжысёра М. Кавальчыка. Дэкарацыі мастака Ю. Тура.

На здымку — сцэна са спектакля. Злева направа: народны артыст БССР А. Логінаў (Каравай), К. Перапяліца (Паляніца) і заслужаны артыст БССР С. Юркевіч (Цыбулька).

Фота В. ЧАВЯРКУСА.

## АДРАСЫ БЕЛАРУСКАГА ОПЕРНАГА

Поспехам азнаменаваліся выступленні харэаграфічнай трупы Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР на сталічнай сцэне. Масквічам падабаліся ўсе спектаклі гастрольнага рэпертуару — «Раймонда», «Бахчысарайскі фантан», «Лебядзінае возера», вечар аднаактавых балетаў, у праграме якога была і «Альпійская балада» Я. Глебава.

Оперная трупа на гэтым тыдні дае спектаклі ў Віцебску. Працоўныя горада над Дзвіной знаёмяцца з класічнымі і сучаснымі музычнымі творамі асноўнага рэпертуару тэатра, сярод якіх і папулярныя оперы Рымскага-Корсакава, Расіні, Вердзі, Пучыні. Прыедзе ў Віцебск і балет. Ён пакажа «Пер Гюнта» Грыга, «Дон Кіхота» Мінкуса і іншыя творы.

У гастрольнае падарожжа выправіліся народная артыстка СССР Т. Ніжнікава, народная артыстка Украінскай ССР Г. Паліванава, народныя артысты БССР Л. Галушкіна, І. Сарокін, В. Глушакоў, В. Чарнабаеў, заслужаныя артысты рэспублікі І. Шыкунова, В. Ганчарэнка, А. Саўчанка, В. Кірычэнка, творчая моладзь трупы. Адбудуцца сустрэчы артыстаў з працоўнымі ў заводскіх цэхах і палацах культуры.

## ДАРОГІ ФЕСТЫВАЛЮ

На Алтаі працягваецца фестываль беларускага мастацтва і літаратуры. Яго дарогі пралеглі ў многія гарады і вёскі краю.

Цёпла і сардэчна сустрэлі пасланцоў брацкай рэспублікі жыхары Рубцоўска. Гэта адзін з маладых цэнтраў сельскагаспадарчага машынабудавання краіны. Добра вядома прадукцыя яго заводаў: трактарнага, «Алтайсельмаша», запасных частак.

Госці пабывалі ў музеі Алтайскага ордэна Леніна трактарнага завода, дзе пазнаёміліся са слаўнай гісторыяй прадпрыемства, агледзелі горад. Вечарам пісьменнікі Генадзь Бураўкін, Васіль Зуёнак, Аляксей Гардзіцкі і артысты Ганна Рыжкова і Леанід Бражнік сустрэліся ў палацы культуры з трактарабудаўнікамі.

— Нам было прыемна даведацца, — сказаў паэт, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць» Генадзь Бураўкін, — што ваш Народны тэатр ставіць п'есы беларускага драматурга А. Макаёнка, што наш артыст Віктар Вуячыч некалі ўдзельнічаў тут у мастацкай самадзейнасці.

З глыбокай увагай слухалі прысутныя раздзел з паэмы лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Беларусі Генадзя Бураўкіна «Хатынскі снег», выступленне Аляксея Гардзіцкага, расказаўшага аб беларускай літаратуры, вершы Васіля Зуёнка.

Не патрабавалася перакладчыка, усе было зразумела слухачам. І не толькі таму, што вельмі блізкія руская і беларуская мовы. У зале сядзелі былыя воіны, якія вызвалялі брацкую рэспубліку ў гады вайны і перадалі любоў да яе мужнага народа сваім сынам.

У Слаўгарадзе ўжо некалькі дзён госціць эстрадная група Беларускай дзяржаўнай філармоніі пад кіраўніцтвам заслужанага артыста БССР Эдуарда Міцуля. Гледачы цёпла прымаюць выступленні цымбалісткі Таццяны Данілкінай, артыстаў балета Людмілы і Вадзіма Родзіных, салісткі Людмілы Шапегінай, вакальна-інструментальнага ансамбля «Верасы».

Госці пабывалі ў калгасах «Радзіма» і «Шлях Леніна», у саўгасе «Кастрычніцкі», сустрэліся з сельскімі працаўнікамі, далі для іх некалькі канцэртаў.

Дзяржаўны народны хор Беларускай ССР выступіў у палацах культуры хімікаў, катлабудаўнікоў і меланжавага камбіната.

Эстрадная група пры ўдзеле лаўрэата міжнароднага і ўсесаюзнага конкурсаў, заслужанага артыста БССР Віктара Вуячыча з вялікім поспехам выступіла перад працаўнікамі горада Бійска, Бійскага, Смаленскага і Савецкага раёнаў.

**БЕЛТА.**

Барнаул.

## СУСТРЭЧЫ СЯБРОЎ

У цэнтральным кіналекторыі Херсонскага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры адкрыта фотавыстаўка «Хатынь». На яе адкрыццё былі запрошаны госці з Беларусі — аўтар выстаўкі Я. Казюля, былая партызанка А. Захарава і паэт А. Зарыцкі.

Яны расказвалі ўкраінскім сябрам аб гераічных подзвігах беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, аб зверствах фашызму на тэрыторыі Беларусі, аб дружбе народаў Краіны Саветаў, якая дапамагла адстаяць мір на зямлі.

Пасланцоў братняй Беларусі цёпла сустракалі на Херсонскім электрамашынабудаўнічым заводзе, тэкстыльным камбінаце, у санаторыі горада Гопры і іншых.

**М. БАЯНЖУ.**

г. Херсон.

## РАДКІ З ПІСЕМ

*У канцэртнай зале новага будынка Маладзечанскай музычнай школы адбылася сустрэча з вядомым беларускім кампазітарам, заслужаным дзеячом мастацтваў БССР П. Падкавыравым. З уступным словам пра яго творчую дзейнасць выступіла музыказнаўца В. Сізко. Кампазітар расказаў пра здабыткі сучаснай беларускай музыкі, пра свой творчы вопыт, падзяліўся новымі задумамі. У канцэртнай частцы вечара выконваліся вакальныя творы П. Падкавырава. Саната для флейты і фартэпіяна і фартэпіяннае трыо.*

**В. ЗІНЬКЕВІЧ.**

●

*З калектывам Мазырскага музычнага вучылішча замацоўваюць творчую дружбу выкладчыкі Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. Луначарскага. Яны выступаюць з метадычнымі лекцыямі, даюць практычныя парады, расказваюць аб новых метадах навучання. Цікава вядуць такія заняткі Б. Сінецкі, Р. Назарэнка, С. Савікоўская, В. Мінянкоў, Р. Грышаеў. Лекцыі суправаджаюцца канцэртнымі праграмамі, у якіх удзельнічаюць выкладчыкі з Мінска і іх вучні.*

**А. СІДАРЧАЎ.**

## СВЯТА Ў ВІЦЕБСКУ

Святочным шэсцем многіх тысяч энтузіястаў мастацкай самадзейнасці пачалося ў Віцебску гарадское свята мастацтваў.

Яркія веснавыя кветкі ляглі да помніка У. І. Леніну. У галоўным парку горада — «Мазурына» загучала музыка, песні. Тут выстраіўся зводны хор. У яго складзе — паўтары тысячы спевакоў. Велічна прагучалі песні аб партыі, Радзіме.

Сваім мастацтвам парадаваў віцяблян вядомы калектыў — лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, самадзейны ансамбль песні і танца «Маладосць». У гэты дзень у яго складзе выступалі і ўдзельнікі іншых танцавальных калектываў.

У парку гучыць песня «Не старэюць душой ветэраны». Яе спявае не зусім звычайны хор. У складзе гэтага калектыву — ветэраны працы, стваральнікі першых пяцігодак, людзі, якія стаялі ля вытокаў масавага самадзейнага мастацтва. Маладыя ўдзельнікі свята ўручылі ветэранам кветкі.

Урачыстасць была своеасаблівай справаздачай многіх тысяч удзельнікаў мастацкай самадзейнасці Віцебска маючаму адбыцца ў будучым годзе тысячагоддзю свайго горада.



Вось яна, новая вуліца ў вёсцы Заськавічы.

# ЛЕБЕДЗЕВА—ВЁСКА СТАРАЖЫТНАЯ, ВЁСКА МАЛАДАЯ

*Расказ старшыні Лебедзеўскага сельскага Савета Маладзечанскага раёна А. В. МАЖУЦЯ.*

ЛЕБЕДЗЕВА наша вёска называецца. Адкуль назва такая? Мо калісьці ў гэтых мясцінах лебедзі гнездаваліся, а мо пайшла яна ад прозвішча першага пасяленца... Вядома толькі, што ў старажытных дакументах Лебедзева ўпамінаецца яшчэ ў 1519 годзе. Так што мала не пяць стагоддзяў пранеслася над нашай вёскай. І каб хто ўзяўся пісаць яе гісторыю, дык атрымаўся б не адзін том. І было б у тых кнігах нямала старонак пра ранейшае гаротнае жыццё мясцовых сялян. Сам я тутэйшы і добра помню, хоць і быў падлеткам, як жылі людзі пры белапанскай Польшчы. Дрэнна жылі, галодна, бескультурна.

Не раз па зямлі нашай тупалі чужынцы, сеючы гора і смерць. Вось вам прыклад з нядаўняга мінулага. У час акупацыі фашысты спалілі ў Лебедзеве палову дамоў, забілі некалькі сот чалавек.

Расказваюць дакументы і пра тое, як мужна змагаліся лебедзеўцы супраць прыгнятальнікаў. Тут не раз узнікалі сялянскія хваляванні ў часе царызму, белапольскай улады. А ў Айчынную вайну ў нашых мясцінах мужна змагаўся з ворагам не адзін партызанскі атрад.

Нешта кінуўся я ў мінуўшчыну. Хаця ўспамінаць мінулае ніколі не шкодзіць. Успамінаць і параўноўваць з сённяшнім днём і расказваць пра ўсё гэта моладзі. Бо некаторыя маладыя людзі часам успрымаюць сваё вольнае, шчаслівае жыццё, як належнае. Забываюць, што заваявана яно іх бацькамі і дзядамі ў цяжкай і мужнай барацьбе.

Ну, а цяпер пра наша жыццё, нашы справы. Старшынствую я ў Лебедзеўскім сельскім Савеце з 1958 года. Сем скліканняў ужо. Не для пахвальбы кажу пра гэта. Проста ганаруся даверам землякоў. А давер гэты да многага абавязвае.

Я тут усё пра Лебедзева расказваў. Дык Лебедзева — гэта толькі цэнтр сельсавета. А наогул у нас не адна вёска. Калі мераць тэрыторыю па дыяметру, дык набярэцца кіламетраў пад сорак. Жыве на тэрыторыі сельсавета больш за 6 тысяч чалавек.

Шмат я пакалясіў па свеце, а, дальбог, такіх прыгожых мясцін, як нашы, не бачыў. Дзве ракі ў нас—прыгажуня Вілія і Уша, якія тут зліваюцца. А вакол бары хваёвыя. Гэта, так сказаць, геаграфічны аспект. Што датычыць сацыяльна-эканамічнага, дык на тэрыторыі Савета — дзве вялікія гаспадаркі: калгас «Светлы шлях» і саўгас «Маліноўшчынскі». Ды яшчэ камбінат будаўнічых матэрыялаў, спіртзавод, лясніцтва. Адным словам, рабочы клас і сяляне.

Неяк прыязджаў да мяне карэспандэнт з радыё. Назавіце, кажа, кола пытанняў, якімі займаецца ваш сельскі Савет. Пачаў я пералічваць, ды збіўся з ліку. Савецкай уладзе да ўсяго ёсць справа, пра ўсё яна павінна клапаціцца. Ад добраўпарадкавання сядзіб (іх у нас больш за дзве тысячы) і арганізацыі мастацкай самадзейнасці да выканання буйных гаспадарчых задач.

*Дзверы кабінета старшыні Савета амаль не зачыняюцца. Ідуць і ідуць наведвальнікі. Вось зайшла загадчыца адной з пачатковых школ. Трэба пачынаць рамонт, няма цэглы і лесу. Анатоль Васільевіч некуды звоніць, дамаўляецца. За ёй на парозе — дырэктар васьмігадовай школы. З тым жа пытаннем. Доўга раяцца са старшынёй, дзе, як зрабіць лепей.*

*А вось зайшоў малады хлопец. Шафёр мясцовага калгаса. Чырванеючы прызнаецца, што прыйшоў з нявестай падаць заяву на рэгістрацыю шлюбу, а сёння, аказваецца, непрыёмны дзень, дык хай старшыня дазволіць, каб не вяртацца...*

*А то прыйшоў чалавек, каб выпісаць дровы..*

*Штохвіліны звоніць тэлефон.*

*Па адказах старшыні можна ўявіць сабе, колькі розных клопатаў у яго. Нехта хоча запраціць у госці сваякоў з-за кардону, дык як аформіць дакументы? Хтосьці пакрыўджаны соткамі — патрабуе, каб старшыня прыйшоў паглядзеў. Трэці пытаецца, калі будуць дзяліць сенажаць? Чацвёрты — наконт будаўнічых матэрыялаў, каб абнавіць хату.*

— За вытворчасць сельскагаспадаркай, прамысловай прадукцыі сельскі Савет, як быццам і не нясе непасрэднай адказнасці, але ў баку ад гэтай важнай справы не стаіць. Вось і сёння ў восем раніцы быў я ўжо на нарадзе ў саўгасе. Перад гэтым мы праверылі, як у гаспадарцы змагаюцца з пустазеллем. Аказалася, што не ўсё з гэтым добра. Каля дарог, на палявых станах, прыфермскіх участках шмат пустой травы. А пустазелле, яно сёння каля дарогі, а заўтра на полі. Даў тры дні тэрміну, каб абкасілі. Праз тры дні будзем слухаць справаздачу дырэктара па гэтаму пытанню на выканкоме.

Ці ўзяць такое пытанне, як барацьба з патравамі. Не было ніводнага выпадку, каб па сігналу аб іх не прынялі захадаў. Зноў жа карысць гаспадаркам.

Сёлета мы шмат займаліся падрыхтоўкай тэхнікі да палявых работ. Праверылі, у якіх умовах працуюць механізатары, ці забяспечаны спецвопраткай, належным інструментам, ці захоўваецца санітарыя на рабочых месцах, тэхніка бяспекі і г. д.

Калгас «Светлы шлях» і саўгас «Маліноўшчынскі» — перадавыя гаспадаркі ў вобласці, «Светлы шлях» (яго ўзначальвае Герой Сацыялістычнай Працы Уладзімір Міхайлавіч Калачык) летась атрымаў з кожнага гектара па 31 цэнтнеру збожжавых, а сёлета змагаецца за 46-цэнтнерны ўраджай. А брыгада Героя Сацыялістычнай Працы Аляксандра Раманавіча Бобрыка замахнулася на яшчэ большы паказчык. Дарэчы, быў час, калі землі гэтай брыгады лічыліся нікчэмнымі. Старажылы ўспамінаюць, што некалі мясцовы памешчык пра іх сказаў, што і задарма не ўзяў бы.

Калачык і Бобрык — дэпутаты нашага сельскага Савета, і як дэпутаты робяць вельмі і вельмі многа. Як, між іншым, і астатнія выбраннікі народа (у нашым Савеце — 60 дэпутатаў, 43 з іх — рабочыя і калгаснікі, палову ўсіх дэпутатаў складаюць жанчыны).

Сельскі Савет наш такі ж, як і сотні Саветаў у рэспубліцы. І на яго прыкладзе можна ўвачавідкі ўбачыць, як у апошнія гады пабагацела, папрыгажэла наша вёска, як падняўся яе культурны ўзровень.

Адных школ у нас сем. Сярод іх дзве сярэднія і адна васьмігадовая. Дарэчы, Лебедзеўская сярэдняя школа атрымала летась выдатны трохпавярховы будынак.

На тэрыторыі сельсавета — участковая бальніца на 25 ложкаў, тры фельчарска-акушэрскія пункты, адзін здраўпункт, аптэка. А цяпер паглядзіце колькі ў нас устаноў культуры — дом культуры, чатыры сельскіх клубы, і адзін прафсаюзны, чатыры бібліятэкі з кніжным фондам у 30 тысяч экземпляраў.

Пачалі мы неяк падлічваць, колькі нашых работнікаў маюць вышэйшую адукацыю. Аказалася — 83. Сярод іх спецыялісты сельскай гаспадаркі, медработнікі, настаўнікі. І гэта там, дзе яшчэ на памяці людзей сярэдняга ўзросту на вёску было тры-чатыры пісьменныя чалавекі.

Культура вёскі. Сёння гэта наш асаблівы клопат. Культура — вельмі ёмкае і шырокае паняцце. Гэта і прыгожы, чысты, светлы дом, гэта і зеляніна на вуліцах. Але галоўнае, вядома, — чалавек, яго паводзіны, яго эстэтычны і этычны ўзровень.

Мы надаем шмат увагі развіццю мастацкай самадзейнасці. Пра Лебедзеўскую народную харавую капэлу вы, мабыць, чулі. Пачыналася яна з маленькага харавога гуртка аматараў спеваў яшчэ да вайны. Сёння ў калектыве 78 чалавек розных узростаў — ад пенсіянераў да школьнікаў. Я і сам вось ужо гадоў шэсць спяваю ў капэле. Прыйшлі сюды і дзве мае дачкі-школьніцы. Выступалі мы з канцэртамі ў многіх кутках рэспублікі, выязджалі ў Маскву на ВДНГ, паказвалі сваё майстэрства ў Літве. На рэспубліканскім аглядзе, прысвечаным 50-годдзю ўтварэння СССР, капэла атрымала дыплом першай ступені і першую прэмію.

Цікава, што некаторыя ўдзельнікі капэлы назаўсёды звязалі свой лёс з мастацтвам. Былая салістка калектыву Тамара Варабей скончыла Беларускую кансерваторыю і зараз працуе ў адным з музычных тэатраў краіны. Скончыла Мінскае музычнае вучылішча наша выхаванка Вера Габрыновіч. Шмат дзяўчат з капэлы вучацца ў Маладзечанскім музычным вучылішчы.

Ёсць у нас і струнны аркестр, і драматычны калектыў. Наогул, у мастацкай самадзейнасці занята больш як 260 чалавек. Толькі сёлета было дадзена звыш ста канцэртаў, якія наведала больш 16 тысяч чалавек.

Жыццё кожнага чалавека складаецца з будняў і свят. Ну, будні, тут усё зразумела — работа, вучоба і г. д. А святы? Напрыклад, такая знамянальная падзея, як рэгістрацыя шлюбу, вяселле? Або, скажам, дажынкі? Ёсць, вядома, складзены стагоддзямі стары рытуал. Ды не ўсё ў ім падыходзіць да сённяшняга дня.

Гэтаму пытанню мы аднойчы прысвяцілі сесію Савета. Было шмат розных прапаноў, як пановаму праводзіць бытавыя святы. Спецыяльная камісія абмеркавала прапановы, выбрала лепшыя.

Вельмі ўрачыста, цёпла ў нас праходзіць рэгістрацыя шлюбу. Для гэтай мэты у памяшканні сельсавета абсталяваны «пакой шчасця». Хто будзе ў Лебедзеве, заходзьце, думаю, што спадабаецца.

*Трэба сказаць, што наогул вельмі прыемна зайсці ў памяшканне сельскага Савета — прыгожы мураваны будынак з шырокімі вокнамі. Тут прасторная, добра абсталяваная зала пасяджэнняў, пакой дэпутата, пакой рэгістрацыі шлюбу. Добрая сучасная мэбля, некалькі прыгожых стэндаў у фае, спецыяльная літаратура на сталах ствараюць атмасферу ўтульнасці і разам з тым урачыстасці. Кожны наведвальнік адразу адчувае—ён прыйшоў у штаб мясцовай Савецкай улады.*

— Часта мы робім так. Звязваемся з кіраўнікамі гаспадарак, дзе працуюць маладыя, і просім іх прыняць удзел у шлюбных урачыстасцях.

Вось і нядаўна вельмі ўрачыста прайшла рэгістрацыя шлюбу рабочых камбіната будаўнічых матэрыялаў Марыі Вярбіцкай і Віктара Гулецкага. Кіраўнікі прадпрыемства прыехалі ў сельскі Савет і тут у «пакоі шчасця» горача павіншавалі маладых, уручылі ім добры транзістарны прыёмнік.

Надоўга запомніцца дзень рэгістрацыі шлюбу і саўгасным рабочым Міхаілу Зяновічу і Марыі Кананові. Павіншаваць іх прыехалі прадстаўнікі дырэкцыі, парткома і рабачкома. Маладым уручылі каштоўны вясельны падарунак.

Вельмі ўрачыста праходзяць у нас праводзіны моладзі на службу ў Савецкую Армію. Калі гэта адбываецца вясной — збіраемся ля помніка воінам, што загінулі ў барацьбе з гітлераўскімі захопнікамі, восенню — у клубе. Са словам на дарогу выступаюць ветэраны працы і вайны, старыя камуністы, піянеры, бацькі. Прызыўнікам уручаюць кветкі, падарункі.

А. В. Мажуць.

А як добра, весела праходзяць у нас святы ўраджаю з уручэннем лепшым хлебаробам прэмій, праводзіны зімы з катаннем на тройках, дзедам Марозам, снягурачкай і бліна мі.

Мы любім гасцей, добра прымаем іх, ды і наогул у нас ёсць што паказаць. Да нас прыязджалі знаёміцца з культурай вёскі госці з Польшчы, Венгрыі, Чэхаславакіі.

Можна яшчэ многа расказваць пра работу сельскага Савета, яго дэпутатаў. І пра тое, як мы клапоцімся аб інвалідах вайны, шматдзетных сем'ях (у нас 17 шматдзетных маці, узнагароджаных ордэнамі і медалямі), сем'ях воінаў, што загінулі ў час Айчыннай вайны, як працуюць сельскія і вулічныя камітэты (іх у нас 15), як вядзем будаўніцтва і г. д. Але пра ўсё адразу не раскажаш.

Паслязаўтра — выбары ў мясцовыя Саветы. Мы будзем галасаваць за наш шчаслівы сённяшні дзень, за нашу родную Савецкую ўладу.

Расказ запісаў М. ЗАМСКІ.

А многія пытанні даводзіцца вырашаць проста ў полі (А. В. Мажуць (у цэнтры) гутарыць з саўгаснымі трактарыстамі Ул. Вітко ўскім і А. Васютам).

Заўсёды людна ў Лебедзеўскай кнігарні.



Тут дзесяць класаў пройдзена.. сталасці ў Лебедзеўскай сярэдняй школе). (ідуць экзамены на атэстат

ТАБЕ, ПЯЦІГОДКА!

Пятрусь БРОЎКА

## ВІДАЦЬ ЖАДАНАГА АБРЫСЫ...

*Відаць Жаданага абрысы,*
*Яго і веліч і абсяг,*
*І я імкнуся ў гэты высі*
*Пад пяцігодак буйны ўзмах.*

*Ад вузкіх ніў, ад хмурных хатак,*
*Ад шэрых саламяных стрэх*
*І я ішоў хадой упартай*
*Штогод з паверху на паверх.*

*Расла вялікая краіна,*
*А ўсё яскравей і шпарчэй.*
*І я, дзе мог, лажыў цагліну,*
*Каб уздымалася вышэй.*

*І я ў сям'і сяброў, сяброўак,*
*Спяваў пра ўзлёт, як толькі мог,*
*І набірала сілу слова*
*Між новаўзведзеных дарог.*

## МІНУТА МАЎЧАННЯ

*Мінута маўчання.*
*Жалоба ў краіне.*
*Маўчу я,*
*А думак нівошта не спыне —*
*Перажытымі*
*Імчацца шляхамі,*
*Лятуць між траншэяў,*
*Лятуць над баямі,*
*Лятуць па-над стэпам,*
*Лятуць над барамі,*
*Лятуць у паветры,*
*Лятуць над марамі,*
*Туды,*
*Дзе палеглі навечна героі.*
*Вяртаюцца ж думкі,*
*Набракшы крывёю...*
*Краіна ў маўчанні*
*Ад краю да краю...*
*Маўчу я.*
*І ўпотай слязу выціраю.*

## СЯБРАМ-ПЕРАКЛАДЧЫКАМ

*Мастацтва роднай Беларусі,*
*Як выраслі шляхі твае,*
*Бо дзе я, дзе ні апынуся,*
*Я чую — Беларусь пяе...*

*Паэзіі і нашай крылы*
*Узняты сотняй братніх моў!*
*Не, мы яшчэ не ацанілі*
*Яе шматлікіх галасоў.*

*Тых галасоў, што загучалі*
*Праз вусны родных нам братоў —*
*На струны ўласныя паклалі*
*Іх шмат выдатнейшых майстроў.*

*І палымнеюць песні ў сэрцах,*
*І праз вякі ім жыць і жыць...*
*І трэба ведаць, мне паверце,*
*Нялёгка гэткае рабіць.*

*Каб перадаць усім, як трэба,*
*Каб аж запеніла ў грудзях*
*Усю красу зямлі і неба,*
*Бароў і рэчак колер, пах...*

*Каб не забыцца ні чагосьці,*
*А асцярожна ўсё забраць,*
*Каб кубак дум і прыгажосці*
*Наліты да краёў падаць.*

*Каб з зачарпнутага з крыніцы*
*Данесці, кроплі не разліць,*
*Каб з кубка, што не замуціцца,*
*Даць чытачу у смак папіць.*

*І вось за гэту ласку, працу*
*Хачу падзякаваць я вам —*
*І масквічам, і ленінградцам,*
*Ва ўсіх рэспубліках сябрам.*

*За тое, што і наша слова*
*Ўлілося ў россып яркіх зор;*
*Што ўзнёслае з бароў сасновых*
*Гучыць між стэпаў і між гор.*

## УРАЧЫСТАСЦІ НА ЎЗДЗЕНШЧЫНЕ

Кожны год супрацоўнікі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору разам з беларускімі пісьменнікамі выязджаюць у Ліцьвянскую сярэднюю школу, якая носіць імя Пятра Глебкі. Яны выступаюць перад вучнямі школы з успамінамі пра паэта, прывозяць у школьны музей фатаграфіі, свае кнігі. І сёлета пісьменнікі М. Татур, А. Русак, А. Ліс, мастацтвазнаўцы Л. Дробаў, В. Шматаў, В. Нячай, С. Міско разам з Нінай Іларыёнаўнай Глебка сустрэліся з вучнямі, падарылі свае новыя кнігі, успомнілі пра жыццёвы і творчы шлях выдатнага беларускага савецкага паэта Пятра Глебкі.

●

Нядаўна Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР прысвоіў Магільнянскай сярэдняй школе імя вядомага беларускага пісьменніка Ільі Данілавіча Гурскага.

У маляўнічым кутку над Нёманам, у зеляніне садоў і прысад адбыўся мітынг настаўнікаў, школьнікаў, грамадскасці. Выстройваецца лінейка школьнікаў, піянераў. Пад гукі маршу выносяць сцяг школы. Мітынг адкрыў сакратар Уздзенскага райкома партыі А. Пятроў. З прамовамі выступілі завуч школы Г. Мацэвіла, сакратар партарганізацыі калгаса «Зарэчча» Н. Кульчыхін, вучаніца 8 класа А. Дземідовіч, загадчык райана А. Армонік. Ён перадае грамату школе за добрыя поспехі. Сакратар райкома камсамола Г. Гранько ўручыў школе Пераходны чырвоны сцяг.

Пра жыццё і творчасць пісьменніка гаварыў сакратар праўлення СП БССР Аляксей Кулакоўскі. Словы ўдзячнасці і пашаны І. Гурскаму выказалі ў сваіх успамінах яго землякі-пісьменнікі Алесь Якімовіч, Антон Бялевіч, Анатоль Астрэйка, сын нябожчыка Леанід Гурскі.

Дырэктар школы І. Жагалковіч зачытаў шматлікія прывітальныя тэлеграмы. Марыя Якаўлеўна Гурская падарыла школе творы І. Гурскага і яго землякоў.

## ВУЧОНЫЯ РАЯЦЦА

НАВУКОВАЯ канферэнцыя, прысвечаная пытанням гісторыі беларускай савецкай літаратуры 20-х і 30-х гадоў, адбылася ў Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук БССР. Нараду адкрыў дырэктар інстытута член-карэспандэнт АН БССР І. Навуменка.

З дакладамі выступілі загадчык сектара тэорыі літаратуры доктар філалагічных навук Н. Перкін і кандыдаты філалагічных навук В. Каваленка і М. Мушынскі.

У абмеркаванні дакладаў прынялі ўдзел доктар філалагічных навук Ю. Пшыркоў, дацэнт Брэсцкага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна У. Калеснік, акадэмік АПН СССР У. Івашын.

□

У Беларускім дзяржаўным ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга універсітэце імя У. І. Леніна адбылася II рэспубліканская навуковая канферэнцыя па тыпалогіі і ўзаемадзеянню славянскіх моў і літаратур. Разам з беларускімі вучонымі ў ёй прынялі ўдзел літаратуразнаўцы, фальклярысты і мовазнаўцы Расійскай Федэрацыі, Украіны, Узбекістана і іншых рэспублік.

На пленарным пасяджэнні былі прачытаны даклады прафесараў М. Ларчанкі і М. Краўцова.

Львоўскі вучоны І. Дзенісюк падрабязна гаварыў аб разуменні праблемы інтэрнацыянальнага і нацыянальнага Іванам Франко і Максімам Багдановічам.

Тыпалогіі славянскіх літаратур былі прысвечаны даклады В. Казловай, Л. Сеніка, В. Саенка, Л. Мінчанка, Р. Літвінава, С. Спаса, Д. Воран, Е. Няронскай і інш. Аб літаратурных кантактах гаварылі М. Малчанава, С. Ахрыменка, У. Лучук, Е. Цыбенка, Н. Рамашка, Л. Бондар. З вялікай цікавасцю быў выслуханы даклад беларускага славіста К. Хромчанкі пра ўкраінска-беларускія літаратурныя сувязі ў савецкую эпоху.

Вялікае месца ў рабоце секцый занялі пытанні тэорыі, гісторыі і крытыкі перакладу (даклады і паведамленні Э. Мартынавай, Ф. Небарачка, Л. Малінінай і інш.).

Увагу выклікаў даклад маладой балгарскай даследчыцы Р. Яўцымавай пра ўзаемасувязі рускай і балгарскай літаратур. Балгарскі вучоны І. Германаў расказаў пра ўспрыняцце і сцэнічны лёс драматургіі Лермантава ў Балгарыі.

**М. ГОЛЬБЕРГ,**
**дацэнт Драгобычскага педінстытута.**

□

Рэспубліканская навуковая канферэнцыя «Рэгіянальныя асаблівасці беларускай мовы, літаратуры і фальклору» адбылася ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце. Актыўны ўдзел у ёй прынялі многія вядомыя вучоныя Масквы, Мінска, Нікалаева, Брэста, Гродна і іншых гарадоў СССР.

Даклад «Рэгіянальныя традыцыі і творчы працэс» прачытаў доктар філалагічных навук М. Грынчык.

Асвятленню некаторых стылістычных асаблівасцей ранніх апавяданняў Кузьмы Чорнага прысвяціў сваё выступленне выкладчык Брэсцкага педінстытута У. Лебедзеў. Літаратуразнаўца А. Мальдзіс расказаў пра літаратурныя помнікі Палесся XVIII ст.

**Р. ЛІТВІНАЎ,**
**В. ЯРАЦ,**
**аспіранты Гомельскага дзяржаўнага універсітэта.**

Анатоль ДАНІЛЬЧАНКА

## САМ

У ПАШПАРЦЕ Міня запісан Міхалам Мікалаевічам Саснаком. Ён — рабочы чалавек — слесар-рамонтнік першага зборачнага цэха, а трошкі дакладней, як любіць падкрэсліваць сам Міня, слесар па рамонту абсталявання. Так дык нават і гучыць ніштавата. Але ўсе яго называюць толькі Мінем, нават цэхавае начальства. І Міня не крыўдуе — шчэ малым так «ахрысцілі». Зрэшты, калі б клікнулі яго: «Міша!» — і вухам не павёў бы, таму што Мішаў шмат, а Міня — адзін. Хлопец ён добры: старэйшых паважае, хоць слухаецца і не заўсёды. Бывае, заўпарціцца і ні з месца.

— Я так думаю, — настойвае Міня.

— Малады яшчэ спрачацца, — падсоўваюць яму важкі аргумент.

— Гэта вы правільна кажаце — малады, — згаджаецца ён. — Але ж тады ўжо і думку маю абвергніце... Дакажыце, што памыліўся!

Міня рослы, моцны, з сур'ёзным тварам і трошкі задуменнымі вачыма, чаму і выглядае даволі стала для сваіх няпоўных семнаццаці гадоў. І прыяцелі ў яго старэйшыя, у тым ліку сусед і лепшы сябрук Эдзік Паўтарацкі, ці проста — Эд. У Эда васемнаццаць поўненькіх, ён таксама працуе ў першым зборачным. Электразваршчыкам. Эд любіць гаспадарнічаць, вось толькі няма ... разгарнуць яму гэтых здольнасцей: жыве ў камунальнай кватэры, на трэцім паверсе. А ў Міні з маці свой дом, сад, агарод і ўтульны дворык з нізенькім хлеўчуком. У хлеўчуку — дровы, вугаль і рознае ламачча. Тут жа летуюць і зімуюць куры са сваім «солтысам» — ахрыплым пеўнем.

У куточку — Мінева майстэрня...

Яшчэ да таго, як паступілі хлопцы на работу, рашылі яны заняцца важнымі жыццёвымі справамі: перш-наперш сабралі сякі-такі капітальчык і купілі дзесяць трусоў. Для гэтага перагарадзілі хлеў і, натуральна, да мінімуму ўрэзалі жыццёвую прастору курэй. Мінінай маці гэта не спадабалася.

Трусоў давялося прадаць.

Ды хлопцы адчайваліся не вельмі: пабадзяліся-пабадзяліся, прыкідваючы, да чаго б вартага рукі прыкласці, і рашылі, што трусы і сапраўды звяр'ё не надта якое, і грошы, прыдбаныя на трусах, пусцілі ў ход на прыгарадным рынку. Так пусцілі, што цётка Палашка, вярнуўшыся з работы, аж за галаву хапілася.

— Дзе ўзялі гэтую здыхоціну? — строга, як следчы, спытала яна. — Аж хістаецца...

— Што ты, мама! — падаў свой «мужчынскі» голас Міня. — Якая ж яна здыхоціна!? Ты глянь толькі... прыгажуня!

— Ме-е-е! — пацвердзіла і каза сваю жыццяздольнасць і кампанейскі тыцнулася да цёткі Палашкі вострай мордаю, спрабуючы на смак яе чысценькі фартушок.

— Прыгажуня, кажаш? А што з яе, з прыгажуні, тваёй...

— Малако будзе, — загарэўся Міня. — Казінае — самае карыснае: тлушчу шмат.

— Тлушчу, значыць, шмат? — адхінуўшыся ад казы, неяк нібы і згодліва сказала цётка Палашка, ды раптам як закрычыць: — Прэч са сваёй ялаўкай! Прэч, каб і духу тут яе не было!

— Пачакай, мама, якая ж яна ялаўка?

— Я вось табе пакажу якая! — У жаночых руках тут жа апынуліся матузы, і хлопцы вылецелі з двара, бы кіпенем ашпараныя.

Казу таксама прадалі.

Але потым збольшага ўлеглася крыўда ў сэрцах «прадпрымальнікаў» — самі ж разважліва і прыкінулі: каза, вядома, калі б гэта ўсё на добры лад, жывёліна карысная, а ўсё ж такі нешта не тое. Як-ніяк дваццаты век, а яны — з казой...

І набылі стары мапед.

— Ну, дзякаваць богу, — супакоілася Мінева мама. — Хоць трошкі паразумнелі. Катайцеся...

Але паездзіць хлопцам так і не ўдалося. Хоць мапед быў і прыгожа пафарбаваны, з выгляду чысценькі, з фарай наперадзе і багажнікам ззаду, нават працаваў на халастым ходзе, але варта было на яго сесці і ўключыць скорасць — буксаваў... Ні з месца! — Як тая ўпартая каза. І разбіралі, і прачышчалі-прадзьмухалі яго, і падціскалі ўсе вінцікі — аніякай рады! Толькі трашчыць сабе...

— Душагубы праклятыя, даруй мне божа! Вунь куры ўжо не нясуцца ад гэтага трэску вашага...

Тым часам «душагубы» ўжо і самі пераканаліся, што і мапед — таксама не тое.

Збылі мапед.

Купілі галубоў.

І атрымалася, што, прагнучы сур'ёзных спраў, хлопцы зноў вярнуліся да дзіцячых забавак.

З галубамі ўсё лета пракешкаліся. А восенню Эда прынялі на завод вучнем электразваршчыка, і яму ўвогуле стала не да птушак.

Зашкрэбла ў Міні пад сэрцам, засмылела туга. Гэта ж з усёй колішняй хлапечай кампаніі толькі яны з Эдам пакуль і «хадзілі» ў школьніках... Трэба было шукаць нейкае выйсце. Добра, што неўзабаве якраз атрымаў пашпарт. Вярнуўся дамоў з ім, новенькім, — з парога ледзь не закрычаў ад радасці і гонару: «Чытайце, зайздрос-

# САБЕ ЧАЛАВЕК

**Анатоль Данільчанка ў мінулым — рабочы, працаваў шахцёрам на Данбасе, рамонтнікам «Гомсельмаша», зваршчыкам, а ў гэтым годзе заканчвае Літаратурны інстытут імя М. Горкага. Пачынаў як паэт, цяпер піша прозу. У «Немане», № 4 за гэты год была надрукавана яго аповесць «Зялёны бераг».**

**У якасці дыпломнай працы ў інстытуце Анатоль Данільчанка прадставіў раман «Няма міру ў маёй душы».**

**Малады пісьменнік піша пра рабочых, пра іх жыццё, працу. Героі яго твораў — як правіла, маладыя людзі, якія ўпэўнена ідуць у жыццё, поўнае натхнёнай працы і няспынных пошукаў.**

**Анатоль Данільчанка — даўні член Гомельскага гарадскога літаратурнага аб'яднання.**

**Прапануем урывак з яго новай аповесці «Сам сабе чалавек».**

**Леанід ГАЎРЫЛКІН.**

□□□□□□□□□□□□□□□□ □□□□□□□□□□□□□□□□

де, я — грамадзянін...» Усё, мама... Іду на завод! Хопіць гатовае лопаць!

— Ты што надумаў? — здзівілася маці.— А школа?

— Ха! Школ шмат... Вучыцца не кіну... Для чаго шэ-рэ-мэ?

— Што гэта?

— Школа рабочай моладзі. Разумець трэба!

— А дурны ж ты хлопец, ці табе есці няма чаго? Ці ж не абуты, ці ж не адзеты? Шчасце знайшоў — завод? Дзякаваць богу, і сад у нас, і гарод, і зарплата ў мяне. Вучыся толькі...

— Праца — лепшая школа! — салідна заўважыў Міня.

— Бач, разумнік знайшоўся! — не стрывала, ускіпела маці.— Даўно лупцавала?

Але ж Міня дамогся свайго. Праўда, паступіць яму на работу аказалася не так і проста.

— Скажы, хлопча, чаму рашыў працаваць? — адразу запытаў начальнік аддзела кадраў на заводзе.

— Хачу далучыцца да працы! — бадзёра адрапартаваў Міня.

— А якія ў цябе адносіны са школай?

— Добрыя. У вячэрнюю пер...

— А бацькі?

— Што бацькі?

— Бацька ў цябе хто?

— Няма, — насупіўся Міня.

— Гм... А маці дазволіла?

— Ды хіба я маленькі? — пакрыўдзіўся Міня.— У жыцці вытворчасць — што? Першаасноваа? А вы мне пра бацькоў...

— Ну і ну, — загадкава сказаў начальнік аддзела кадраў, задумаўся і ціха пастукаў па стале сухімі пальцамі.— Значыць, так...— Ён пакруціў у руках Мінеў пашпарт, паднёс да носа-лапаткі і хітравата ўсміхнуўся,— пахне...

— Што? — не зразумеў Міня.

— Фарбай, кажу, пахне. Свежанькі.

Міня змаўчаў.

— Значыць, так, — працягваў «дабрэннай» дуцы дзядзька.— Прыйдзеш... з мамкай.

— Я вас не разумею, — ужо не на жартачкі пакрыўдзіўся Міня.— Чалавек, які дасягнуў паўналецця...

— Вось і я кажу: пахне...

Чатыры дні хадзіў Міня за маці, як прывязаны. Прасіў, пагражаў збегчы з дому.

— Бяжы, хоць у вір галавой,— па-ранейшаму злавалася маці, ды ўсё ж потым неяк журботна ўздыхнула, сказала:—Збірайся, работнічак, павяду...

Машынабудаўнічы — гэта цэлы горад са сваімі парадкамі і звычаямі, сваёй украінай і цэнтрам. Цэнтр машзавода — першы зборачны цэх, самы вялізны і важны. Займае ён добры дзесятак гектараў, раздзелены на тры часткі, тры пралёты. Цэнтральны, скразны, сігануў у чатырохсотметровую воддалеч, хаваючыся ў шэрым марыве газаў. Тут — галоўны канвеер з бясконцым радам яшчэ не пафарбаваных машын, кожную з усіх бакоў абляпілі рабочыя: адзін спераду штосьці прыкручвае, другі няспешна пераступае з нагі на нагу, плывучы разам з машынай па канвееры, трэці залез наверх і там грукоча мэлатам... У бакавых пралётах — дапаможныя ўчасткі: зварачныя, станочныя, маляркі, сушылкі ды іншае. Пад самым дахам, перакінутыя цераз пралёт, што масты на рацэ, бегаюць кран-бэлькі, развозячы цяжкія дэталі машын... Цэх стары, і таму ў ім размяшчаюцца розныя ўчасткі, якія непасрэднага дачынення да зборкі не маюць. Потым машзавод будзе мець новы цэх галоўнага канвеера — вузкі і доўгі, як узлётная аэрадрома. Пакуль жа карыстаюцца гэтым...

Уражаны і здзіўлены Міня стаяў на праходзе, не кранаючыся з месца. Раптам за спіной незадаволена прыкрыкнулі:

— Чаго рот разявіў!

Міня адскочыў убок. Міма пракаціўся электракар, якім кіравала дзяўчына ў сінім берэціку.

— Цюхцяй! — кінула яна і павярнула сваю «казяўку» ў цэнтральны пралёт.

— Гэ, пані на самакаце,— прабурчаў Міня і пайшоў у кантору, да начальніка цэха.

Начальнік цэха спярша пацікавіўся яго біяграфіяй.

— Ці не ранавата рашыў ты на свой хлеб падавацца?

— Чаго ж тут рана? Колькі ў маці на шыі сядзець?

— Цяжкавата, значыць, у сям'і — таму? — дапытваўся начальнік.

— Ды не. У нас дом свой і агарод... Хапае.

— Дык што ж, абрыдла вучыцца?

Міня пачаў непакоіцца: а раптам начальнік цэха не возьме — што тады? І аддзел кадраў не дапаможа.

— Вучыцца і ў вячэрняй можна,— засяпаўся Міня.— Мне шаснаццаць ці не шаснаццаць? Людзі ў шаснаццаць палкамі камандавалі, а тут — працаваць...

— Ты не крыўдуй, — зычліва ўсміхнуўся начальнік.— Хочаш працаваць — будзеш.— Ён задуменна пашкроб падбародак, уважліва паглядзеў на Міню.— Яно мо і так, мо і гэтак... Вунь і ў мяне сын, з цябе гадамі, але думае па-іншаму.

Міня перасмыкнуў плячыма. А што скажаш, калі начальніцкі сын думае па-іншаму! Няхай думае, а Міні, што да таго?

— Ну, ладна...— Начальнік яшчэ разок зазірнуў у Міневу паперчыну з аддзела кадраў.— Слухай, Міша, пойдзеш у аддзел механіка. Калі што не так — заходзь, разбярэмся. І наогул, не саромся, звяртайся з любым пытаннем. А яны ў цябе будуць...— Сказаў так і адпусціў Міню.

Скончыўшы гутарку з начальнікам цэха, Міня ўздыхнуў з палёгкай. Цяпер ужо і начальнік здаваўся нішматым дзядзькам, дый сам сабе Міня падабаўся, паважна ідучы па цэнтральным пралёце ўздоўж галоўнага канвеера, міма соцень механізмаў, што гулі на розныя лады.

Аддзел механіка знаходзіўся ў самым канцы цэха, у куточку, адгароджаным трохметровай металічнай сценкай. Тут жа пачынаўся галоўны канвеер. Побач, у бакавым пралёце, рухаўся ланцуг падвеснага канвеера. Ён грувастка вывіваўся праз малярку, сушылку, падступаў удотык да цэнтральнага пралёту і адпаўзаў назад. На каркасы машын, пакрытыя жоўтым грунтам, надзявалі колы, каркас здымалі з падвеснага канвеера і ставілі на галоўны. Ля сцяны, дзе «абувалі» машыну, ляжала цэлая гара колаў, за якімі ледзьве віднеліся дзверы аддзела механіка.

Перш чым зайсці ў кабінет механіка, Міня спытаў у пажылога рабочага, з якім сутыкнуўся ля дзвярэй:

— Дзе знайсці механіка? Рэзніка...

— Вунь у нараднай,— паказаў рабочы на дзверы і пайшоў, весела хмыкаючы, ад чаго Міню стала вельмі ж ніякавата...

Цімох Цімохавіч Рэзнік — худы, маленькага росту мужчына, гадоў гэтак сарака пяці. Правае рукаво яго пінжака было пустое. Але і сваёй адной рукой механік валодаў як нельга лепш: пісаў, прытрымліваючы мезенцам лісток паперы, спрытна гартаў блакнот, паспяваючы нават пачухаць за вухам. Увесь ён жвавы, вочы ў яго неспакойныя, на маленькім вострым тварыку нервова варушацца мускулы. І размаўляў Рэзнік хутка, ледзьве не чапляючыся словам за слова.

І зноўку, у які ўжо раз, Міню распытвалі пра школу, пра сям'ю, нібыта гэтаму начальству і справы іншай няма. А Рэзнік яшчэ і бацькам пацікавіўся.

— Нядобра ў нас з ім атрымалася,— надзьмуўся Міня.

Ён заўсёды саромеўся, калі размова заходзіла пра бацьку.

— Што ж так?

— Не ўжыліся.

— Выпіваў, ведама?

— Было...

— Ясна,— адразу памякчэў голас механіка. — Значыць, слесарам хочаш? Тры месяцы — вучнем, потым прысвоім разрад.

— І праз тры месяцы я змагу... усё гэта? — запытаў Міня недаверліва, маючы на ўвазе тое, што бачыў у цэху.

— Як табе сказаць,— пашкроб механік за вухам.— Цябе... Міхаілам?..

— Не, Мінем завуць.

— Бачыш, Міня, іншым і жыцця не хапае, каб стаць добрым спецыялістам. Як зможаш... Палюбіш справу — будзе толк. Ну, а калі так сабе, тады, канечне...

Ён раптам ускочыў, адчыніў дзверы:

— Федзя, дзе Пятровіч? Клікні.

Мінут праз пяць зайшоў той самы рабочы, з якім Міня сутыкнуўся ля дзвярэй.

— Клікаў, Цімохавіч?

— Вось хлапец у нас новы, Мінем завуць. Ты яго вазьмі пакуль, растлумач, што да чаго. Тумбачкай забяспеч, ну, і ўсё астатняе...

Да абеду Міня з бесклапотнага хлопца ператвараўся ў рабочага чалавека: атрымаў спяцоўку ў кладоўцы, інструмент — у інструментальнай, яму вызначылі тумбачку ў раздзявалцы, а ў майстэрні — скрынку для інструментаў.

Апрануў Міня новенькі баваўняны касцюм, ды рабочым сябе не адчуў: штосьці перашкаджала гэтаму... Не такі ён быў, як астатнія. Нарэшце, сам дапяў, у чым справа: спяцоўка ж чысценькая.

Непрыкметна ад рабочых Міня пацёрся аб стругальны станок, пасля наваліўся грудзьмі на варштат. Але гэта мала дапамагло. Тады ён пайшоў у малярку і «незнарок» трапіў пад струмень пульверызатара. Фарбу давялося зацірацъ мазутным пакуллем. І спяцоўка набыла больш-менш рабочы выгляд.

З Пятровічам, ягоным настаўнікам, у Міні складваліся пакуль дзіўныя адносіны, бо той толькі пазіраў на Міню ды пасміхаўся. Менавіта гэтая паблажлівая ўсмешка не давала хлопцу спакою. Гаварыў з ім Пятровіч неахвотна, так, нібы Міні і не было побач. У кожным яго слове адчувалася нейкая абыякавасць: маўляў, на цябе, жэўжыка, і слоў траціць шкада—усё роўна не зразумееш...

«Не хочаш — не гавары,— разважаў Міня.— Падумаеш, акадэмік! Чакай, яшчэ не такім рабочым буду...»

Пасля абеду Міня пабег да Эда...

Зварачны ўчастак у бакавым пралёце быў адгароджаны з усіх бакоў высокімі стальнымі шчытамі і падзелены на мноства зварачных кабін, злучаных адна з другой вузкімі праходамі. Грувасткія вузлы і дэталі машын бралі з кабін цераз верх, кранамі. Яны важна праплывалі над галовамі рабочых. Толькі і чуўся прарэзлівы званок кранаўшчыцы: сцеражыся!

Паблукаўшы па ўчастку, Міня знайшоў Эда.

— Міня! — узрадаваўся той і цёпла паляпаў сябрука па плячы. — Значыць, аформіўся? Ну, віншую! — Ён уважліва аглядзеў Міню і раптам паківаў галавой: — А цябе і ашукаць паспелі...

— Як гэта?

— Спяцоўку старую падсунулі.

— А, усё роўна запэцкаецца, — хаваючы гарэзліва вочы, адмахнуўся Міня і тут жа абапёрся локцямі на брудны зварачны варштат...

Увесь рабочы дзень Міня знаёміўся з цэхам. Адны ўчасткі яму паказаў Пятровіч, другія з захапленнем агледзеў сам. Уражанняў было шмат. Ды ўсё неяк перамяшалася, у вушах шумела, перад вачыма мільгала і пабліскавала. Рукі былі чорныя ад мазута, спяцоўка — у брудных плямах.

І ўсё ж Міня быў задаволены, як ніколі. Потым, калі стаяў у чарзе за пропускам, ён адчуваў сябе ўжо сапраўдным рабочым чалавекам. Нібы далучыўся да вялікай справы, у якой будзе не апошнім.

# ГЕРОІ — БЕЛАРУСКІЯ НАФТАВІКІ

Майскі нумар «Полымя» чакаў з нецярпеннем: у ім працяг рамана Леаніда Гаўрылкіна «Не магу без цябе». Раней я чытаў апавяданні і невялікія аповесці пісьменніка. Скажу шчыра, мяне, як чытача, яны не вельмі радавалі, бо мала давалі роздуму над жыццём. Адчувалася, што аўтар знаходзіцца яшчэ як бы на подступах да сваёй асноўнай тэмы, і наперадзе павінен быць хвалюючы расказ аб тым, чым жыве наш сучаснік, што радуе, хвалюе і непакоіць яго як чалавека і як грамадзяніна. І вось раман з назвай, якая напачатку наводзіць на думку, што пісьменнік паднясе нейкую чарговую любоўную гісторыю.

Прыкладна так думаў і я, калі адкрыў красавіцкую кніжку «Полымя». Але, прачытаўшы першы раздзел, зразумеў, што пісьменнік паставіў перад сабой іншую задачу: расказаць пра людзей новай на Беларусі прафесіі — нафтавікоў Палесся. І чым далей, глыбей учытваўся ў твор, тым больш адчуваў, што на гэты раз Л. Гаўрылкін прыглядаецца не да таго, што ляжыць на паверхні, а пранікае ў самую сутнасць з'яў.

Пісьменнік зразумеў, што важна ў творы не толькі вызначыць цікавы жыццёвы факт (адкрыццё нафты), а духоўна выявіць вобразы тых, хто стаіць у цэнтры падзей. Вось чаму характары герояў, паданыя ў рамане, запамінаюцца. У кожнага з персанажаў свой твар, свае погляды не толькі на праблемы пошуку беларускай нафты, але і на само жыццё.

Вось геолаг Баціслаў Лузько. Яшчэ студэнтам марыў пра тое, як стане вядомым чалавекам. Дзеля гэтага і прыехаў на Палессе. Але прайшоў год, другі, трэці, а нафты ўсё не могуць знайсці. І Лузько пачынае лічыць сябе няўдачнікам. Яшчэ б! Яго аднакурснікі загадваюць кафедрамі, аселі ў трэстах і глаўках. А ён, які заўсёды лічыў сябе здольным і нават таленавітым, так і не знайшоў нафты. Дзе ж выйсце?

Л. Гаўрылкін не проста расказвае пра працу Лузько, ён імкнецца прасачыць тыя змены, якія адбываюцца ў характары героя. Аналіз абставін, учынкаў Лузько, паказ яго ўзаемаадносін з іншымі людзьмі — усё гэта падначалена адной мэце: на прыкладзе аднаго лёсу паказаць той, часам няпросты, працэс, што адбываецца з чалавекам, які раптоўна пачынае адчуваць нейкае незадавальненне сваім ранейшым жыццём. Характар Лузько паказан у развіцці, у дзеянні.

Цікавым атрымаўся і вобраз Адама Шкварніка. Чалавек ён мясцовы, на Палессі нарадзіўся, вырас. Родная зямля для яго — тая прыстань, якой ён ніколі не здрадзіць. Яшчэ ў маленстве часта чуў Адам легенду пра ваду, якая гарыць. І верыў, што яна павінна быць і тут. Нават пах нафты на керне, які выняты з зямлі, п'яніў яго. Канечне, знойдуць бурыльшчыкі нафту ці не, залежыць гэта не ад Шкварніка. Але апантанасць гэтага чалавека радуе. Праўда, ёсць у яго і мімалётныя ваганні, ён кідае на некаторы час работу на буравой, вяртаецца ў вёску. Толькі не можа чалавек без таварышаў па працы. Хутка Шкварнік зноў на буравой.

Людзі рознага жыццёвага лёсу аб'яднаны агульнай справай. Сярод нафтавікоў і тыя, хто толькі пачынае сваю працоўную біяграфію. Іван Дымок нядаўна закончыў сярэднюю школу. Бацька хоча, каб сын пайшоў яго дарогай і таксама стаў ветэрынарам. Але Іван ідзе на буравую. Цяжка даюцца хлопцу першыя крокі, толькі не пасуе ён перад жыццёвымі перашкодамі, вучыцца разумець людзей. І працоўныя поспехі, і асабістае шчасце (ён ажаніўся з цудоўнай дзяўчынай Гайшай) — усё гэта наперадзе. Л. Гаўрылкін не спяшаецца адразу ўвесці свайго героя ў жыццё. Характар Івана загартоўваецца ў паўсядзённай працы. І вельмі добра, што хлопец не адзінокі ў сваіх імкненнях і парываннях. Яму прыходзяць на дапамогу старэйшыя.

Праўдзіва паказвае пісьменнік і саму атмасферу на рабоце. Адчуваецца, што ён добра вывучыў жыццё нафтавікоў, неаднойчы сустракаўся з імі. Уражваюць не толькі сцэны, якія звязаны непасрэдна з буравымі работамі, але і эпізоды, у якіх расказваецца пра побыт герояў. Па-майстэрску пададзены і эпізод, у якім гаворыцца аб прыходзе Івана са сваёй жонкай Гайшай у дом бацькоў. У словах бацькі Івана гучыць і нейкае, магчыма, беспадстаўнае асуджэнне сына, і ў той жа час заклапочанасць яго будучыняй. «Глядзіце толькі за баламутам», — кажа ён і выцірае слязу. Усё гэта псіхалагічна матывавана.

Пісьменнік праяўляе добрае ўменне бачыць чалавека ва ўсёй складанасці і непаўторнасці яго характару. Кожны ягоны герой — гэта своеасаблівае адкрыццё чалавека. Такім аўтарскім адкрыццём з'яўляецца вобраз галоўнага геолага Круглова, вопытнага, умудронага жыццём чалавека. Ён прыехаў на Палессе, каб пагасіць пажар нявер'я ў магчымасць адкрыцця тут нафты. Чалавек валявы, адкрыты, Круглоў увасабляе ў сабе лепшыя рысы людзей, якія адданы сваёй справе.

Працэс барацьбы за пошукі беларускай нафты і складае змест першага рамана Л. Гаўрылкіна. «Не магу без цябе» — твор густанаселены. Калі пачынаў я чытаць раман, папраўдзе сказаць, трывожыўся, ці справіцца аўтар з пастаўленай задачай. Аднак па меры паглыблення ў твор гэтая боязь знікла. Я пачаў нават зайздросціць уменню свайго малодшага калегі па пяру адчуваць плынь нашага жыцця, бачыць і паказваць людзей працы. Л. Гаўрылкін скрупулёзна эканомны ў мастацкіх сродках і ў той жа час надзвычай дакладны ў раскрыцці характараў, псіхалагічным аналізе іх учынкаў.

Я не ставіў перад сабой задачу рабіць падрабязны, вычарпальны аналіз рамана. Гэта лепш зробяць крытыкі. Мне ж хацелася толькі падкрэсліць істотную ўдачу маладога празаіка.

**Раман САБАЛЕНКА.**

---

# ТВОРЧАСЦЬ СЯБРОЎ

У ВЫДАВЕЦТВЕ «Мастацкая літаратура» выйшаў маляўніча афармлены зборнік «Літаратурная Беласточчына», які стаў своеасаблівай анталогіяй паэзіі і прозы нашых сяброў. У кнігу ўвайшлі лепшыя творы пісьменнікаў некалькіх пакаленняў. Сярод аўтараў людзі розных прафесій, але ўсіх іх аб'ядноўвае любоў да беларускай літаратуры і мовы.

З паэтычных твораў вылучаюцца вершы Алеся Барскага. Яны характарызуюцца высокай ідэйнай накіраванасцю. Паэта цікавіць дзень сённяшні і ўчарашні, ён задумваецца над складанымі жыццёвымі працэсамі. Асабліва цікавая «Балада пра бізун». Аўтар малюе цяжкае паднявольнае жыццё беларускага селяніна ў мінулым. Значную сэнсавую нагрузку нясе расказ пра бізун, што вісеў некалі ў памешчыцкім пакоі сярод карцін, ваенных трафеяў:

Напіўся, чортава натура,
Сялянскіх слёз, крыві і поту.
Змяёю поўз, ахвяр знаходзіў,
Глядзеў ён з-за халявы
панскай,
Ішоў праз цэлыя стагоддзі,
Ішоў ён па хрыбтах
сялянскіх,
Перадаваўся бацькам сыну,
Перадаваўся панам пану,
І стаў падпораю краіны,
Яе эмблемай, талісманам.

Праз гэты вобраз паэт дасягае значных сацыяльных абагульненняў. Верш ператвараецца ў асуджэнне бесчалавечнасці і лютасці.

Дакладная, абгрунтаваная развязка ў творы. Прыйшоў сорак пяты год, і колішні халоп патрабуе звычайных чалавечых правоў. Разгневаны пан сарваў са сцяны стары бізун... Але на гэтым, уласна, і скончылася ўлада панскага бізуна:

Бо рук дзесятак спрацаваных
Зваліў тут пана на падлогу.

Вуснамі селяніна аўтар гаворыць:

«Хто ходзіць з бізуном па
свеце,
Ад бізуна павінен згінуць!».

Галоўны кірунак творчасці другога беластоцкага літаратара, Віктара Шведа, — адданасць роднай зямлі. У яго творах гучаць матывы сыноўняга абавязку перад радзімай. Паэта хвалююць самыя розныя падзеі грамадскага жыцця, яны даюць яму тэмы для шчырай размовы з чытачом. Надзвычайнай цеплынёй сагрэты вершы «Ля Маўзалея Леніна», «Першы стрэл «Аўроры», «Кастусь Каліноўскі», «Родная мова». Як прысяга на вернасць роднай зямлі ўспрымаюцца радкі з «Бацькоўскага парога»:

Куды б мяне лёс ні кінуў,
З далёкіх і блізкіх дарог
Заўсёды знайду пуцявіну
На родны, бацькоўскі парог.

Паэтычныя творы Яна Чыквіна «Над возерам», Дзмітрыя Шатыловіча «Успамін», Уладзіміра Гайдука «Дажынкі» — радуюць свежасцю аўтарскага ўспрымання навакольнага свету.

Багата ў кніжцы і прозы. З апавяданнямі выступаюць Васіль Баршчэўскі, Мікола Гайдук, С. Заставін і іншыя аўтары. Асабліва цікавае апавяданне Віктара Рудчыка «Сямейны талісман».

Пэўнай падмогай чытачу ў знаёмстве з творчасцю беластоцкіх літаратараў з'явіцца прадмова Уладзіміра Казберука і кароткія бібліяграфічныя даведкі пра аўтараў.

**Мікола ЖЫЛІНСКІ.**
г. Гродна.

«Літаратурная Беласточчына». Вершы і апавяданні. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1973.

---

# ВЫТОКІ ПЕСНІ

У 1963 ГОДЗЕ выйшаў з друку том аўтабіяграфій беларускіх пісьменнікаў пад назвай «Пяцьдзесят чатыры дарогі». Складальнікам і рэдактарам тэкстаў гэтай кнігі быў вядомы крытык і літаратуразнаўца Янка Казека. У 1966 годзе ён падрыхтаваў другую кнігу пад назвай «Пра час і пра сябе». Гэтыя выданні былі цёпла сустрэты чытачамі і належна ацэнены ў друку. І вось зусім нядаўна ў нашых кнігарнях з'явілася трэцяя кніга аўтабіяграфій «Вытокі песні». І на гэты раз Янка Казека прарабіў карпатлівую працу па збіранню жыццяпісаў паэтаў, празаікаў, драматургаў і крытыкаў.

Не заўсёды анатацыя на кнігу з'яўляецца ключом да яе зместу. Так здарылася і на гэты раз. У анатацыі гаворыцца, што ў «Вытоках песні» змешчаны аўтабіяграфіі пісьменнікаў малодшага пакалення, творчасць якіх набыла шырокую вядомасць. Гэта далёка не так. Ілары Барашка, Сцяпан Ліхадзіеўскі, Яўген Рамановіч, Нічыпар Чарнушэвіч і іншыя не могуць быць аднесены да пісьменнікаў гэтага пакалення. Як вядома, М. Грамыка пісаў у пачатку нашага стагоддзя апавяданні і змяшчаў іх у рускіх выданнях, а з часоў першай імперыялістычнай найны — вершы, крыху пазней і п'есы на беларускай мове. «Поўны разварот некаторых літаратурных здольнасцей праявіўся толькі тады, як перайшоў у творчай працы на мову сваіх бацькоў», — гаворыць ён у сваёй аўтабіяграфіі.

«Вытокі песні» тым і цікавыя, што змяшчаюць у сабе біяграфіі пісьменнікаў старэйшага, сярэдняга і малодшага пакаленняў, раскрываюць частку гісторыі нашай літаратуры больш чым за паўстагоддзе. Некаторыя аўтары, расказваючы пра свой час і сябе, даюць багатую, невядомую дагэтуль інфармацыю пра выдатных паэтаў і празаікаў.

Драматург Васіль Гарбацэвіч сціпла і хораша прыгадаў незабыўныя ўражанні пра спатканне ў Яраслаўлі з Максімам Багдановічам. Прывабны вобраз паэта і грамадзяніна, які душой хварэў за лёс сваёй радзімы, ажыў і запалымнеў яркімі, непаўторнымі фарбамі.

Міхайла Грамыка, паэт, драматург, а ў дадатак да гэтага геолаг, пачынае свой аўтабіяграфічны нарыс з таго, што ён узяўся пісаць «Старонкі сямейнай хронікі», у якой хоча падрабязней расказаць аб сваім жыцці. Аўтар напісаў толькі дзве часткі задуманай аповесці. Няблага было б, калі б з ёй змаглі пазнаёміцца шырокія чытачы.

Цікавыя нататкі Фёдара Янкоўскага. Ён амаль аднагодак Кастрычніка і расказвае пра падзеі, якія не могуць не прыцягнуць увагу чытача.

У 1965 годзе было адзначана 60-годдзе з дня нараджэння Іларыя Барашкі. Рэдакцыі некаторых выданняў мелі аўтабіяграфію пісьменніка, напісаную ім якраз напярэдадні юбілею. Але ж у зборнік «Вытокі песні» трапіла аўтабіяграфія, якая датуецца красавіком 1932 года. Шкада, што складальнік Янка Казека не скарыстаў пазнейшага тэксту, па гэтай прычыне застаецца невядомай надзвычай цікавая літаратурная і грамадская дзейнасць І. Барашкі ў апошнія гады. У прыватнасці, І. Барашка напісаў некалькі дакументальных і мастацкіх сцэнарыяў для кінафільмаў. Не знаёмы чытач і з літаратурнай і рэдакцыйнай працай яго ў часы Вялікай Айчыннай вайны.

Кніга «Вытокі песні» дае разгадку ў першую чаргу таму пытанню, якое заўсёды ставіць чытач: «Што прымусіла ўзяцца за пяро пісьменніка?».

Аркадзь Марціновіч, напрыклад, паведамляе, што жаданне пісаць вершы ўзнікла ў яго тады, калі ён патаемна пазнаёміўся з вершамі старэйшага брата. Генадзь Кляўко ў часы нямецкай акупацыі знайшоў на лузе лістоўку «Раздавім фашысцкую гадзіну». Відаць, вершы і гумарэскі ў ёй так усхвалявалі хлопчыка, так запомніліся, што ён і сам пачаў складаць сатырычныя творы. Яўген Курто быў зачараваны творамі Максіма Багдановіча і, спрабуючы сілы ў паэзіі, паслаў свой першы верш «Вясна» ў газету «Піянер Беларусі». Са школьнай парты пачаў пісаць вершы і Васіль Зуёнак.

Янка Сіпакоў піша, што і сёння, калі ён бярэ «Вянок» М. Багдановіча, да яго прыходзіць адчуванне вясны і цяпла. Дык вось адкуль бруяцца вытокі песні...

«Люблю літаратуру з дзяцінства, а пачаў друкавацца на дваццаць сёмым годзе жыцця», — расказвае пра сябе Мікола Гроднеў.

У кнізе «Вытокі песні» пяцьдзесят пяць аўтабіяграфій. Некаторыя — зусім кароткія, анкетныя, яны пісаліся не для гэтай кнігі, але складальнік знайшоў іх, узбагаціў сваімі тлумачэннямі.

Многія аўтары, якія спецыяльна пісалі свае аўтабіяграфіі, не зусім сур'ёзна, на маю думку, аднесліся да высвятлення некаторых літаратурных падзей і фактаў. Паэт Раман Тармола, напрыклад, наіўна радуецца, што адзін з крытыкаў знайшоў у ягонай кніжцы «абстракцыянізм» і «фармалізм» і гэтым нібыта выклікаў цікаўнасць да ягоных твораў. А як сам аўтар глядзіць на свой творчы шлях, якія ў яго творчыя задумы? Адказу няма...

Няпоўная аўтабіяграфія і ў Міхася Скрыпкі.

Пісьменнікі, дактары філалагічных навук Фёдар Куляшоў, Сцяпан Ліхадзіеўскі, Уладзімір Няфёд, Навум Перкін добра дапоўнілі расказы маладых. Яны ўзнімаюць пытанні развіцця паэзіі, прозы, драматургіі. Але хацелася б больш ведаць пра чулага і таленавітага крытыка Дзмітрыя Палітыку.

Сціпла, лаканічна і цікава расказаў пра свой творчы шлях драматург, заслужаны артыст рэспублікі Яўген Рамановіч. Пісьменнік нагадаў не толькі пра сваё жыццё, але і закрануў пытанні станаўлення беларускага савецкага тэатра і драматургіі.

Кніга прачытана. Яе беражліва ставіш на паліцу. І адразу ж узнікае думка, як многа яшчэ трэба зрабіць, каб дастаткова ярка асвятліць дарогі вядомых нашых пісьменнікаў.

**Станіслаў ШУШКЕВІЧ.**

«Вытокі песні». Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. Мінск, «Мастацкая літаратура». 1973.

# СВЕТ НАШАГА СУЧАСНІКА

ЛІРЫЧНАЯ ПРОЗА... Колькі ў свой час паламана коп'яў крытыкай у спрэчках аб яе вартасцях і праліках! І—не дарэмна: удасканальваючыся, яна радуе чытача ўсё новымі мастацкімі адкрыццямі. У гэтым лёгка пераканацца, пазнаёміўшыся хоць бы з кнігай Віктара Карамазава «Па талым снезе».

У аповесці «Пагоннік» праз характары Ягоркі, Юлькі і Паўлюка рэалізуецца традыцыйны сюжэтны трохкутнік, але галоўныя акцэнты аўтар пераносіць у маральна-этычны план. Пры гэтым ён не ставіць усе кропкі над «і», ён пазбягае не толькі шчаслівага фіналу, але і не робіць канчатковых вывадаў, не маралізуе, а далучае да роздумаў над лёсам герояў самога чытача.

Гэтая аповесць аб цяжкіх дарогах да чалавечага шчасця, аб дарагой плаце за дапушчаныя ў маладосці памылкі, аб душэўнай шчодрасці і дабраце, якія супрацьстаяць жорсткасці і спустошанасці. Сюжэт твора просты, дзеянне адбываецца на працягу некалькіх гадзін. Ягор гоніць плыт, побач з ім Юлька, якая накіроўваецца ў райцэнтр, каб скасаваць шлюб з Паўлюком. У глыбокіх роздумах над перажытым, ва ўспамінах, у надзеі на блізкае шчасце праводзяць яны доўгія гадзіны свайго знешне ціхага і велічнага падарожжа па роднай рацэ. Але гэты спакой і гэтая цішыня падманлівыя. Прымаючы рашэнне звязаць свой лёс, адчуваючы сябе ў палоне глыбокіх пачуццяў і перажыванняў, героі спавядаюцца перад сабой і сваім сумленнем. Яны прыходзяць да вываду, што шчасце не прыходзіць само, за яго трэба змагацца.

Аповесць насычана сімвалічнымі сцэнамі і малюнкамі, якія маюць глыбокі падтэкст. Рака жыцця нясе чалавека і цаною суровых выпрабаванняў загартоўвае яго і ўзбагачае вопытам і ведамі. Чалавек і прырода выпрабоўваюцца пагоннікам, ветрам, які асабліва небяспечны для плытагонаў. Хто ж вінаваты ў пагібелі Юлькі? А можа тое, што адбылося з ёй, чыстая выпадковасць? Хто ж з'явіўся для Юлькі тым няўмольным і жорсткім пагоннікам, які пакалечыў і зламаў яе жыццё?

Сімвалічны і сон Ягора, у якім ён бачыць залатую «карэту, запрэжаную чацверыком чырвоных, як ахутаных полымем, коней... «Напаліво-он!»—не аціхала наўкола, і Паўлюк, адурэўшы ад радасці, гону, рагатаў, мяцеліў коней, адно чырвоны след слаўся паўз Сож і лёс, вёскі і белы пясчаны бераг. Клубы чырвонага пылу садзіліся на траву, дарогу, ваду—усё за Анкудам палала агнём...».

Цёмнай ноччу, як злодзей, хаваючыся ад людзей, уцякае ад сваіх дзяцей і ад адказнасці за смерць Юлькі Паўлюк. «Зноў—чысценькі. У белай сарочцы, шэранькім касцюмчыку. Бы тая зязюля».

Тры характары, тры лёсы. Ягор—непарыўнае цэлае з прыродай: «Абапёршыся на шост, Ягор утаропіўся ў блізкі карчысты дуб, дзівіўся з яго сілы і чым больш глядзеў, чым больш дзівіўся, тым мацней адчуваў сваю злітасць і з гэтым дрэвам, і з Сожам, і з тымі моранымі дубамі, што ляжалі пад вадою».

Юлька, «безумоўна, здолела б у любой працы замяніць мужчыну, магла б, гадуючы двух сыноў, нараджаць і гадаваць яшчэ не аднаго, ганяць плыты — усё ёй было пад сілу і ўсё рабіла б без уздыхання і наракання, без плачу, з радасцю, не трацячы свае жаноцкасці, красы. Нават не шмат узамен прасіла б. Крыху ўвагі, ласкі, кахання».

А вось разважанні Паўлюка Анкуды: «Сучасны чалавек любіць водку і малодку. А я б яшчэ дадаў—прастор... Апаскуднела дыхаць свінушнікам. Навошта, калі пад носам дыстыляванае паветра. Гуляй-вецер, гуляй-людзі... Дваццаты век. Што вушы развесіў?

— Філасофія-а!

— Філасофія, сваячок. «Тебе ширь степная понятна?..» Як там, у вялікага рускага класіка?

— Класіка разумею, цябе — не.

Адбываецца сутыкненне не столькі характараў, колькі двух процілеглых поглядаў на жыццё, дзвюх «філасофій», як гавораць героі. Анкудзе зручна хавацца за свабодную ад паняццяў маралі і абавязку некалькі асучасненую «філасофію» старога мяшчанства. І смерць Юлькі кліча не толькі да асуджэння, але і да бязлітаснай барацьбы з такімі людзьмі.

У пагібелі Юлькі вінаваты і Ягор, бо без бою ў юнацкія гады ўступіў яе свайму «бліскучаму» саперніку, што меў вялікі поспех: вінавата, урэшце, і сама Юлька, якая не змагла своечасова разабрацца ў сваіх пачуццях.

І ўсё ж для чытача, відаць, застаецца загадкай, навошта спатрэбілася аўтару выпадковая, падкрэсліваем—выпадковая смерць Юлькі, якая ўжо вытрымала суровыя выпрабаванні і, мажліва, стаяла на парозе сапраўднага шчасця? Ці не вельмі гэта дарагая плата за тое, каб заклікаць да голасу людскога сумлення і пакараць зло? Думаецца, такія сюжэтныя крайнасці, пазбаўленыя глыбокай псіхалагічнай матывіроўкі, не апраўданыя ні логікай падзей, ні дынамікай руху характараў, губляюць сілу абагульнення, нясуць на сабе адзнаку штучнасці.

Нельга не кінуць папрок і ў іншым. Так, Ягору бракуе самастойнасці мыслення, аўтар як бы ўцісквае яму свае думкі. У выніку вобраз героя многае страчвае, робіцца невыразным.

У стварэнні характараў В. Карамазаў шырока выкарыстоўвае фальклор. Мова яго герояў індывідуалізавана—асабліва дзеда Малаха, Ягора, Юлькі—яна нетаропкая і простая, але мудрая і сакавітая, узбагачаная прыказкамі і прымаўкамі.

Апавяданні зборніка ў большасці цікавыя, прысвечаныя сучаснасці. Але—не ўсе... Наўрад ці можна лічыць набыткам аўтара апавяданне «Жаваранак». Канфлікт паміж бацькам і сынам вырашаецца вельмі лёгка, прасталінейна.

«Бацьку рупіла бачыць сына вучоным чалавекам», таму Сцёпка і аказваецца на завочным аддзяленні політэхнічнага інстытута. Але хутка кідае вучобу, бо «больш за любую навуку... любіў коней, Буронку, гусей, сабаку Арсіка, жыцця без усяго гэтага не мог уявіць». Сцёпка ідзе ў армію, становіцца танкістам і марыць аб вяртанні ў вёску, аб новым трактары або аўтамашыне.

Такі паварот у бок рэальнага жыцця Сцёпкі не можа не радаваць, але ж характар героя не прасочваецца да канца. Сцёпка паказаны неяк аднабакова. Дзіўныя яго адносіны, у прыватнасці, да навукі. Гэты нічым не апраўданы скептыцызм. Зрэшты, веды на вёсцы таксама неабходныя, тым больш чалавеку, які хоча звязаць сваё жыццё з тэхнікай. У апавяданні шмат ідзе ад схемы, зададзенасці. Героям не хапае жыццёвасці, іх паводзінам — мастацкай пераканальнасці.

Асобнае месца ў зборніку займаюць лірычныя нарысы «Падарожжа па Карэліі». Тут ужо зусім іншая мастацкая палітра, якая рэалізавана ў рамантызаваным стылі. Мы не толькі знаёмімся з песнямі Іванан Улы і Васелэйн Мары, але і чуем аўтарскую руну, яго песню аб гэтым цудоўным краі. І ўсё ж галоўнае тут, што прыцягвае ўвагу пісьменніка — гэта не экзотыка Карэліі, а жыццё звычайных працаўнікоў, іх чалавечая прыгажосць, сустрэчы з землякамі-беларусамі.

Нарысы насычаны роздумам над праблемамі, якія ў роўнай ступені актуальныя і для Карэліі, і для Беларусі. Гэта праблема лесу і лесавырубак, беражлівых адносін да прыроды, праблема захавання «шэдэўраў народнага мастацтва», песень.

Аўтар не замілоўваецца патрыярхальнай старыснай, ён да яе падыходзіць, як да помніка унікальнага народнага побыту, «ідэальнага ўмельства мужыцкай сякеры».

Праўда, нарысы не пазбаўлены і пэўных мастацкіх пралікаў. Да іх перш за ўсё адносяцца паляўнічыя апавяданні Віктара Рымшы. Гумар тут будуецца прымітыўна, напрыклад, на абыгравані мянушкі сабакі «Каця» і яе сынкоў—асірацелых шчанят. Надуманыя, стылізаваныя пад традыцыйныя «паляўнічыя баечкі», гісторыі Рымшы нібыта пашыты белымі ніткамі. Аўтару, бясспрэчна, бракуе тут эстэтычнага густу.

Нягледзячы на пэўныя хібы зборніка, ёсць падстава сцвярджаць: крокі В. Карамазава ў літаратуры абнадзейваючыя. Можна чакаць, што адпаведная патрабавальнасць мастака да сябе прывядзе да новых творчых адкрыццяў.

**Г. СІНЕНКА,**
**кандыдат філалагічных навук.**

В. Карамазаў. «Па талым снезе». Аповесці, апавяданні, нарысы. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1973.

# КРЫНІЦЫ НЕ ВЫСЫХАЮЦЬ...

**«Ёсць адзін куточак запаветны, дзе растуць, нібы грыбы, здаўна паэты... Там, дзе Свіцязь, там, дзе Прыпяць і Ясельда, дзе танцуюць пад цымбалы на вяселлях, дзе жанчына сінявокая і ласкавая чаравічкамі плясківала», — так хораша пісаў пра наш край П. Панчанка. З даўніх часоў вабіць да сябе даследчыкаў мовы, побыту і звычаяў беларускага селяніна Палессе — сама прырода гэтага краю з непраходнымі балотамі, дрымучымі пушчамі зрабіла яго больш устойлівым перад імклівым поступам часу. Гэтая ўстойлівасць, самабытнасць і захаванасць амаль у некранутым стане багацейшай скарбніцы народнай душы і абумовілі ўвагу да палешукоў. У свой час тут пралеглі шляхі такіх вядомых фалькларыстаў і этнографаў, як П. Шпілеўскі, М. Доўнар-Запольскі, А. Сержпутоўскі, К. Машынскі, І. Сербаў. На Палессі зрабіў свае шматлікія запісы Р. Шырма.**

**Нядаўна пачалося серыйнае выданне «Беларускі фальклор у сучасных запісах» — упершыню ў нашай фалькларыстыцы. У аснову першага зборніка пакладзены матэрыялы, сабраныя за апошнія шэсць гадоў выкладчыкамі і студэнтамі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна ў час фальклорнай практыкі ў Брэсцкай вобласці.**

**І. Лушчыцкая ў артыкуле «Лышча, яе спевакі, паданні і песні» на прыкладзе адной палескай вёскі аналізуе рэпертуар былых хат-«зборань» і многіх таленавітых самадзейных спявачак.**

**Тут, як і ўсюды на Беларусі, склалася даўняя традыцыя харавой творчасці без музычнага суправаджэння. Толькі так званыя «велічальныя» песні (не вылучаныя ў артыкуле) маюць абавязковы музычны акампанемент — гармонік. Новай формай бытавання і распаўсюджання фальклорных жанраў у вёсцы Лышча сталі выступленні створанага ў 1969 годзе самадзейнага харавога калектыву.**

**Традыцыйна песні ў вёсцы перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Цікава, што некаторыя песні запісаны ад 10—12-гадовых выканаўцаў. У артыкуле разглядаюцца таксама шматлікія асаблівасці бытавання вуснапаэтычнай творчасці.**

**Багацце раздзелаў гаворыць аб сур'ёзным стаўленні да падбору фактычнага матэрыялу. Большасць тэкстаў публікуецца ўпершыню, пададзены таксама шматлікія нотныя прыклады.**

**Асаблівую цікавасць выклікае сямейна-абрадавая паэзія, у прыватнасці, вясельная. «Народная опера» — так характарызаваў яе вядомы фалькларыст Е. Раманаў. Галоўны яе абрад — вяселле — узнік яшчэ ў далёкай старажытнасці і адлюстроўвае адзін з самых галоўных момантаў у жыцці чалавека.**

**«Вянкі» і выпечка каравая ў большасці вёсак Брэстчыны пачалі як бы дапаўняць адно другое. Народ апаэтызаваў свае адносіны да хлеба, да чалавека-працаўніка:**

Расці, караваю,
Вышэй таго гаю,
Вышэй тае печы,
Што ўтрох можна легчы.
Расці, караваю,
Вышэй таго гаю.
З туку залатога
Вышэй Колі маладога (імя жаніха. — **М. П.**).

**А раніцай распачынаецца самае галоўнае — падрыхтоўка да рэгістрацыі шлюбу і запросіны гасцей, якія хоць і атрымалі запрашэнне яшчэ амаль за тыдзень, але чакаюць паўторнага. У гэтым вясельным абрадзе ўдзел прымае ўся вёска. Тут у некаторай ступені праяўляюцца звычаі нашых народаў — усім родам, усёй сям'ёй выпраўляюць маладых у самастойнае жыццё.**

**Н. Макарскай і В. Захаравай удалося запісаць некалькі арыгінальных песень нявест-сірот. У большасці з іх нявеста параўноўваецца з бяздомнай зязюляй:**

Знаці зязюленьку па лятанейку,
Што ніженька лётае.
Знаці і дзяцінашцы, што вяселейка
Не бацька спраўляе...

**У параўнанні з рускай фалькларыстыкай у беларускім фальклоры вельмі рэдкія хаўтурныя галашэнні. Сярод матэрыялаў зборніка знаходзім толькі адзін прыклад, запісаны ў Рэпіцы Баранавіцкага раёна ад М. Кабарыхі.**

**Багаты раздзел складаюць любоўныя песні — самыя шматлікія ў вуснапаэтычнай творчасці. У большасці старых песень галоўнай тэмай з'яўляецца нешчаслівае каханне, разлука з мілым, нязгода бацькоў на шлюб маладых з-за іх сацыяльнай няроўнасці. Тым не менш, як гаварыў М. Горкі, народнай творчасці не ўласціва пачуццё песімізму. Нават у любоўных і сіроцкіх, не гаворачы ўжо аб жартоўных песнях, выразна чуецца цвёрдасць і рашучасць народнай душы.**

**Вера ў дабрату і справядлівасць уласцівы народным казкам. У гэтым лішні раз пераконваешся, гартаючы старонкі зборніка. Арыгінальная казка «Як мядзведзь накалоў нагу» запісана ў Аздаміцы Столінскага раёна.**

**Хочацца зрабіць і некалькі заўваг. Назва вёскі Лышча насельніцтвам ужываецца ў ніякім родзе, а не ў жаночым, як гэта ў зборніку. І двароў у вёсцы не больш трохсот, а роўна 279. Назва вёскі Лышчыцы (Брэсцкі раён) ўжываецца толькі ў множным ліку, а не ў адзіночным (Лышчыца). Відаць, варта было б даць спецыяльны нарыс, прысвечаны жыхарцы вёскі Паўлінова Веры Іванаўне Качаноўскай. Як паведамляла студэнтка Брэсцкага педінстытута Н. Гарагляд у «ЛіМе» ад 11 жніўня 1972 года, у гэтай 60-гадовай жанчыны яна запісала 365 народных песень, 4 казкі, жарты і загадкі.**

**М. ПРЫГОДЗІЧ.**

«Беларускі фальклор у сучасных запісах». Брэсцкая вобласць. Традыцыйныя жанры. Складальнік В. Захарава. Пад рэдакцыяй Р. Шырмы. Мінск, выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна, 1973.

# ВЫЙШЛІ З ДРУКУ

**ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»**

**Ідэі партыі — у масы.** З вопыту работы друку, тэлебачання і радыё рэспублікі па камуністычнаму выхаванню працоўных. Зборнік. Мастак В. Валянтовіч. 1973 г. На рускай мове. 160 стар. Тыраж 4 000 экз. Цана 23 кап.

**Зборнік п'ес для баяна.** (Дзіцячы альбом.) Складальні с К. Булыга. 1973 г. 64 стар. Тыраж 1 700 экз. Цана 70 кап.

**Д. Лукас. Выбраныя песні.** (Серыя «Мастацкай самадзейнасці»). Мастак І. Бялецкі. 1973 г. 40 стар. Тыраж 7 300 экз. Цана 30 кап.

**ВЫДАВЕЦТВА «МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»**

**М. Вышынскі. На павароце.** Аповесць і апавяданні. Мастак М. Вецік. 1973 г. 200 стар. Тыраж 7 000 экз. Цана 36 кап.

**А. Вярцінскі. Выбранае.** Бібліятэка беларускай паэзіі. Афармленне В. Юрчанкі. Франтыспіс А. Кашкурэвіча. 1973 г. 144 стар. Тыраж 5 000 экз. Цана 56 кап.

**Ю. Голуб. Дрэва навальніцы.** Лірыка. Мастак А. Шэвераў. 1973 г. 80 стар. Тыраж 5 000 экз. Цана 18 кап.

**М. Горкі. Маці.** Мастак В. Тарасаў. На рускай мове. 1973 г. 272 стар. Тыраж 200 000 экз. Цана 69 кап.

**С. Законнікаў. Бяседа.** Вершы. Мастак В. Масцераў. 1973 г. 80 стар. Тыраж 5 000 экз. Цана 17 кап.

**В. Іпатава. Ліпеньскія навальніцы.** Вершы. Мастак Н. Счасная. 1973 г. 96 стар. Тыраж 5 000 экз. Цана 23 кап.

**І. Маркевіч. Камандзіроўка.** Першая кніга паэта. Мастак С. Кавалёў. 1973 г. 48 стар. Тыраж 3 000 экз. Цана 11 кап.

**Мудрыя дарадцы.** Прыказкі і прымаўкі. Склала А. Янголь. Мастак І. Капялян. 1973 г. 96 стар. Тыраж 40 000 экз. Цана 15 кап.

**П. Прануза. Ручаёк.** Пераклад з беларускай І. Бурсава. Мастак Г. Скрыпнічэнка. На рускай мове. 1973 г. 46 стар. Тыраж 100 000 экз. Цана 23 кап.

**Рука друга.** Апавяданні ўкраінскіх савецкіх пісьменнікаў. Укладальнік Л. Бойка. Мастакі В. і М. Басалыгі. 1973 г. 608 стар. Тыраж 5 000 экз. Цана 95 кап.

**А. Савіцкі. І нічога ўзамен.** Аповесць. Мастак І. Давідовіч. 1973 г. 296 стар. Тыраж 10 000 экз. Цана 67 кап.

**М. Танк. Светлячок.** Вершы. Мастак А. Волкаў. На рускай мове. 1973 г. 40 стар. Тыраж 100 000 экз. Цана 35 кап.

**ВЫДАВЕЦТВА «ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА»**

**А. Каляда. Выразнае чытанне сатырычных вершаў, баек і драматычных твораў.** Мастак В. Масцераў. 1973 г. 248 стар. Тыраж 7 000 экз. Цана 4 руб. 31 кап. (з пласцінкамі).

# ДЗЯКУЙ ТАБЕ, ПЕСНЯ!

*ЗАКОНЧЫЎСЯ УСЕСАЮЗНЫ КОНКУРС ВЫКАНАЎЦАЎ САВЕЦКАЙ ПЕСНІ І ВАКАЛЬНА-ІНСТРУМЕНТАЛЬНЫХ АНСАМБЛЯЎ*

Леанід Смятаннікаў.

Валерый Кучынскі.

ПАГАСЛІ святочныя агні пад купалам Мінскага палаца спорту. Здаецца, яшчэ не заціхла рэха ўдзячных апладысментаў тысяч і тысяч слухачоў. Самыя гарачыя «брава!» адрасаваны былі пераможцам, лаўрэатам — Леаніду Смятаннікаву з Саратава, Валерыю Кучынскаму з Мінска (першае месца), Уладзіміру Окуню з Рыгі і Зауру Тутаву з Нальчыка (другая прэмія), Рэнату Ібрагімаву з Казані, Яўгену Мартынаву з Масквы, Віктару Мамонаву з Чэлябінска, Махфірат Хамракулавай з Таджыкістана, Таісіі Калінчанка з Ленінграда (трэцяя прэмія); сардэчна віталі мінчане «Песняроў», якія былі лепшымі сярод ансамбляў, «Масквічоў», «Дос-Мукасан» (Алма-Ата) і «Кобзу» (Кіеў).

Мабыць, і ўдзельнікі спаборніцтва, і наведвальнікі канцэртаў доўга яшчэ будуць прыгадваць гэтыя хвалюючыя дні чэрвеня 73-га ў Мінску.

4 чэрвеня. У палацы культуры тэкстыльшчыкаў урачыста прагучалі фанфары. Вечарам пачалося вялікае свята песні, дружбы народаў СССР. У зале — маладыя работніцы Мінскага камвольнага камбіната, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, героі працы, журналісты, акцёры, камсамольскія актывісты. Яны прысутнічаюць на своеасаблівым творчым старце конкурсу.

«У зямлі нашы карэнні» А. Пахмутавай прагучала ў выкананні «Песняроў» уверцюрай да песеннай размовы пра родную зямлю, якая гадуе і выхоўвае нас, адкрывае хараство сонечнага жыцця, за якое змагаліся пад ленінскім сцягам бацькі і старэйшыя браты... Нібы падхоплівае гэты ўдзячны гімн жыццю новая песня І. Лучанка — «Мы крочым па краіне».

— Я даўно люблю музыку Беларусі, — сказала старшыня журы конкурсу, сакратар праўлення Саюза кампазітараў СССР Аляксандра Пахмутава. — Мяне захапляе зробленае беларускімі музыкантамі, пачынаючы ад Рыгора Раманавіча Шырмы і да самых маладых кампазітараў. Юрый Семяняка, Яўген Глебаў, Ігар Лучанок — імёны, якія ведаюць усе прыхільнікі сучаснай песні. Ігар наогул — надзвычай таленавіты, ад яго мы чакаем новых твораў ва ўсіх жанрах музычнай творчасці. Вашым кампазітарам уласціва высокая патрабавальнасць. Гэта — зарука далейшых поспехаў.

Праграма конкурсу была надзвычай насычанай і напружанай — нечаканыя ўражанні, арыгінальныя трактоўкі вядомых твораў, своеасаблівая манера выканання, стылявое багацце.

Вось у песенную вясёлку ўплятае свае фарбы Махфірат Хамракулава — самая маладая ўдзельніца агляду. Калі яна выйшла на сцэну велізарнай залы Палаца спорту і шчыра выканала песню пра свой родны горад Душанбэ, зала была ў палоне яе абаяльнасці. Мяккасць, шчыры тэмперамент — вось што падаравала Махфірат слухачам. І мы ўжо нібыта разам з ёю крочым па сонечным вуліцам Душанбэ.

— Чым дарагі для вас гэты конкурс? — пытаемся ў Махфірат.

— Тут усё для мяне ўпершыню. Першая паездка ў вашу цудоўную рэспубліку. Першая сустрэча з незабыўнымі званамі Хатыні... І такі давер мне — прадстаўляць Таджыкістан. Гэта немагчыма забыць!..

Многа ўдзячных слоў было сказана выканаўцамі і слухачамі у адрас народнага артыста РСФСР Юрыя Сіланцьева, кіраўніка эстраднасімфанічнага аркестра Усесаюзнага тэлебачання і радыё. «Вялікае дзякуй!» — сказалі салісты і музыкантам гэтага мабільнага і працавітага ансамбля, які быў сталым і чулым акампаніятарам на ўсіх канцэртах.

— Мы пакідаем сталіцу Беларусі, — сказаў Юрый Сіланцьеў, — з намерам абавязкова прыехаць сюды яшчэ не адзін раз. Тут вельмі ўдзячная публіка, якая ўмее ацэньваць сапраўдныя музычныя вартасці, разбіраецца ў нюансах выканання. Мінчане ўмеюць слухаць музыку! У гэтым горадзе не забываеш пра блізкае, здаецца, рэха вайны, таго гераічнага часу, аб якім расказвае і песня...

Хвалюючыя мелодыі неслі, як на хвалях, публіцыстыку і лірыку Р. Гамзатава і А. Куляшова, Р. Раждзественскага і Я. Далматоўскага, М. Дабраннравава і Ул. Фірсава.

Слухачы яшчэ раз пераканаліся, што змястоўны роздум і актыўныя эмоцыі абуджае толькі па-творчы свежае, самастойна знойдзенае і вынашанае сэрцам слова паэта, калі яно знаходзіць дакладны музычны эквівалент. У жанравых адносінах найбольш яркія ўражанні пакінулі песні-балады з адчувальнай фабульнай асновай.

Адчувалася, што конкурс стаў прыкметнай з'явай у культурным жыцці нашай сталіцы, што ўдумлівы падбор рэпертуару надаў канцэртам характар дыялогу артыста з публікай, размовы аб тым, што хвалюе кожнага — пра незабыўныя старонкі гісторыі, пра месца і абавязак маладых пакаленняў, пра светлыя пачуцці любві і дружбы, пра неабходнасць аберагаць заваёвы Краіны Саветаў.

Член арг. камітэта па правядзенню конкурсу, намеснік загадчыка аддзела ЦК ЛКСМБ Н. Марчанка адзначыла, што мінчанам было прыемна слухаць водгукі ўдзельнікаў пра добрую арганізацыю і гасціннасць гаспадароў.

— Спаборніцтва талентаў не было самамэтай, — сказала Н. Марчанка, — конкурс не толькі выявіў пераможцаў, а і яшчэ раз прадэманстраваў значэнне песні ў ідэйна-эстэтычным выхаванні моладзі. Трэба спадзявацца, што з залаў, як кажуць, «у народ» пайшла не адна новая песня, што лепшыя конкурсныя творы стануць любімымі і ўвойдуць у рэпертуар самадзейнасці, будуць гучаць на камсамольскіх сходах, ў турысцкіх паходах, на піянерскіх зборах, бо песні, што прагучалі на конкурсе, — з тых, што памагаюць чалавеку будаваць, змагацца, сябраваць, любіць...

Сярод прамоўцаў на заключным канцэрце быў удзельнік абароны Брэсцкай крэпасці пісьменнік Алесь Махнач. Яго ўсхваляваны воклiч: «Да новых сустрэч, песня!» — гэта агульнае пажаданне мінчан на будучае, бо сапраўдная песня застаецца з намі назаўжды.

На заключным канцэрце ўдзельнікаў Усесаюзнага конкурсу прафесійных выканаўцаў савецкай песні і вакальна-інструментальных ансамбляў прысутнічалі П. М. Машэраў, А. Т. Кузьмін, У. Ф. Міцкевіч, Ф. А. Сурганаў, М. І. Лагір, У. І. Падрэз, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н. Л. Сняжкова.

Канцэрт быў не толькі трыумфам пераможцаў, гэта быў трыумф таварыша Песні.

**Л. КРУШЫНСКАЯ,**
**Л. КОЗІНА.**

«Песняры».

# ЯК ГОЛАС ЧАЛАВЕКА...

ГЭТЫ інструмент музыканты, бывае, называюць «царскім» — так многа перадае ён, так мілагучна і пранікнёна расказвае пра душэўны стан і інтэлектуальны пошук героя твора, так выразна раскрывае кампазітарскую задуму. Ён не губляецца ў аркестры, ён прыцягвае да сябе і тады, калі саліруе, калі слухач застаецца з ім нібы сам-насам. У беларускай музычнай літаратуры ёсць змястоўныя і тэматычна багатыя віяланчэльныя творы — А. Багатырова, Д. Камінскага, П. Падкавырава. Да іх, на жаль, рэдка звяртаюцца выканаўцы. Мо і таму яшчэ прэм'ера новага Канцэрта для віяланчэлі з аркестрам Д. Смольскага выклікала асаблівую цікавасць грамадскасці Мінска ў сёлетнім канцэртным сезоне.

Выканаўцамі яго былі Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР (дырыжор — дыпламант Усесаюзнага конкурсу А. Энгельбрэхт) і саліст Я. Ксаверыеў. Артысты з захапленнем «чыталі» партытуру, упершыню давалі музыцы трактоўку, адкрывалі яе асаблівасці і нюансы. Іх асноўнай задачай было пазнаёміць слухачоў з раней невядомым творам, даць уражанне аб задуме і эмацыянальна-вобразнай структуры канцэрта. Аўдыторыя цёпла прымала прасветлены роздум і шчырае хваляванне, якімі жыве так званы «лірычны герой» твора, г. зн. унутраны свет чалавека, раскрыты пераважна ў партыі віяланчэлі.

...Здалёк даносіцца да нас хвалюючы, задуменны голас саліруючай віяланчэлі, як маналог героя, як яго лірычная споведзь. Але з кожным імгненнем галоўная тэма ўсё больш драматызуецца, поўніцца напалам. Магутны чатырохгалосы акорд — і нечаканы спад гучнасці. Здаецца, што перапынкі ў інтаніраванні гавораць аб цяжкасці вырашэння задачы, аб роздумах героя, пошуках ісціны. Зноў вялікае крэшчэнда. Саліруючая віяланчэль, якая раз'юшана спявае ўзрушанымі двухгалосымі інтэрваламі, вяртаецца да асноўнай тэмы.

А ў гэты момант грозна заяўляе аб сабе асноўная мелодыя канцэрта — гучаць альты, віяланчэлі, кантрабасы. Раптам заспявалі ва унісон першыя і другія скрыпкі. Але «жудасны» пошчак надае тэме нейкія злавесныя адценні, амаль змяняе яе. Злыя сілы, ураган лютуе неўтаймавана, нібы грозны вобраз раз'юшанай стыхіі. Тут аркестр вядзе галоўную партыю, а саліст толькі момантамі ўрываецца ў агульнае фартысіма, быццам герой спрачаецца, знаходзіць сілы для сцвярджэння свайго грамадзянскага «я».

Кампазітар па-майстэрску выкарыстоўвае разнастайныя тэхнічныя сродкі: напрыклад, поліфанічную падачу матэрыялу, неаднаразовы зварот да тэматычнага зерня то ў павелічэнні, то ў памяншэнні і г. д.

Другая кадэнцыя сольнага інструмента, якая суправаджаецца трывожным трэмала струнных, узнікае ў нізкім рэгістры і паступова саліст узнімаецца на велізарную вышыню, дасягнуўшы гэтым у кульмінацыі незвычайнай мастацкай пераканаўчасці. Апошнія такты першай часткі канцэрта мажорнай танальнасці — радасна гучыць флейта, нібы прамень святла прарываецца праз хмары. Зноў інтаніруе галоўную тэму ў міноры віяланчэль. Здаецца, што герой думкамі вяртаецца да драматызму сваіх ранейшых перажыванняў. Заключны акорд — магутны і кампактны — жыццесцвярджальна завяршае першы раздзел цыкла.

...Другая частка канцэрта нібы пераносіць слухача ў чароўную даліну, дзе адбываецца народнае гулянне. Імклівы, нястрымны бег адрывістых нот духавых інструментаў — вось той асноўны фон, які то апярэджвае мелодыю танца, то следуе за ёй. Кампазітар удала знайшоў акампанемент, які ярка адцяняе маляўнічую карціну гучання народнага інструмента. Мелодыя танца, якую вядуць габоі і фаготы з запамінальным своеасаблівым ланцужком трыолей, — выдатная знаходка аўтара. Гэтая тэма ў другой частцы канцэрта неаднаразова паўтараецца.

Далей саліст бярэ на сябе ініцыятыву танца. Імклівым узлётам пасажа віяланчэлі завяршаюцца гэтыя прастадушныя, вясёлыя, народныя скокі. Іх настрой нібы спрачаецца з мінорнай музыкай першай часткі, хоць гэты настрой сугучны папеўкам, якія гучалі на пачатку канцэрта.

Потым фагот задуменна спявае сваю сольную тэму. Здаецца, што ты прысутнічаеш пры нейкім урачыстым мерным шэсці. Піцыката струнных інструментаў падкрэслівае моцны поступ рухаў. Стыль тут раптам нагадвае музыку мінулых стагоддзяў, меладыйную плынь, скажам, Гендэля. Але фінал мелодыі ў фагота настолькі выйшаў з рамак стылю Гендэля, што слухач зусім не сумняваецца — аўтар знарок выказваецца тут амаль цытатна. Кантрастна гучыць сучасная эмацыянальная музыка. Патэтычна, з нейкай наіўнай страсцю і чысцінёй пачуццяў у высокім рэгістры зноў спявае віяланчэль, быццам герой прызнаецца ў каханні дзяўчыне, абяцае ёй здзейсніць іх агульныя мары. Два кларнеты пад акампанемент кантрабасаў саркастычна смяюцца над «лірычнымі прамовамі» героя. Але віяланчэль падтрымліваюць струнныя інструменты, і ў гэтай барацьбе сіл «дабра» і «зла» перамагае мужнасць героя.

У фінале канцэрта слухач вяртаецца ў сферу драматычных вобразаў першай часткі. Кампазітар паўтарае тэматычны матэрыял не літаральна, а з некаторымі танальнымі зменамі. Дынамічнае гучанне заключнай тэмы пасля магутнага фартысіма раптам робіцца падкрэслена пяшчотным. Быццам рэха ўдалечыні, аціхае музыка — чалавек знайшоў сябе і веру ў свае сілы...

Навізна Віяланчэльнага канцэрта Д. Смольскага ў яго монатэматызме. Складанасць гэтага прынцыпу не толькі ў вырашэнні тэхнічных задач, але, што самае галоўнае, — і ў неабходнасці пазбегнуць аднастайнасці.

Калі гаварыць аб якасці сольнай партыі віяланчэлі, дык трэба адзначыць, што чатыры кадэнцыі-маналогі, якія выконвае саліст, нясуць велізарную тэматычную нагрузку. Выканаўца галоўнай партыі іграе ў самых разнастайных рэгістрах, нават у дыяпазоне скрыпкі. Багатая тэхніка канцэрта і ў камбінацыях падвойных нот, і ў шматлікіх акордах-штрыхах, і ў адмысловых пасажах.

Трэба падзякаваць Я. Ксаверыеву за тое, што ён уважліва і тактоўна «чытаў» нотны матэрыял, не прэтэндуючы на падкрэслена арыгінальны падыход да выканання сольнай партыі; яго турбавала не віртуознасць як самамэта, а жаданне захаваць і перадаць сваё захапленне думкай і настроем, кампазітарскай воляй. Добрым партнёрам яму быў аркестр.

Відаць, мы яшчэ не раз паслухаем Віяланчэльны канцэрт Д. Смольскага на філарманічнай эстрадзе.

**Станіслаў МАДОРСКІ.**

# НАПЯРЭДАДНІ ЎЗЛЁТУ

СЯРОД уражанняў ад сустрэч з музыкай, што адбываюцца ў зале Мінскай сярэдняй спецыяльнай музычнай школы, мабыць, многім меламанам запомніцца канцэрт вучняў з творамі Баха і Моцарта ў праграме. Не сакрэт, што аўдыторыя была настроена трохі скептычна: ці здолеюць юныя выканаўцы пераадолець усе цяжкасці 5-га Брандэнбургскага канцэрта Баха, ці перададуць яны глыбіню і хараставо моцартаўскага «Рэквіема»?

Тлумачыцца такі скепсіс тым, што і для прафесійна сталых салістаў і ансамбляў гэтыя творы — вяршыні, і каб узляцець на іх, патрэбна вялікае майстэрства. Але, відаць, мелі рацыю дырыжор Ю. Яфімаў і іншыя педагогі, калі прапаноўвалі вучням такую адказную задачу. Юныя музыканты працавалі натхнёна, настойліва, заўзята, бо яны х а ц е л і дасягнуць вялікіх поспехаў.

Першая частка бахаўскага канцэрта — гарачая па эмацыянальнаму ладу, маторнага характару. Яе цэнтральная тэма хораша і пранікнёна прагучала ў выкананні салістаў Аляксандра Храмушына (скрыпка), Валерыя Грыгор'ева (флейта) і Ірыны Жалудкевіч (фартэпіяна). Мала сказаць, што іграді яны старанна. Не, тут мы адчувалі даволі тонкую нюансіроўку і вобразную напоўненасць музыкі. Заслугоўвае ўдзячнага слова І. Жалудкевіч за ўпэўненае «пераадоленне» архіскладанай 65-тактавай кадэнцыі.

Разам з камерным аркестрам, складзеным з вучняў той жа школы, салісты зліваліся ў ансамбль, які здатны выявіць поліфанічную тканіну музыкі Баха. Праўда, юныя выканаўцы яшчэ толькі наблізіліся да абсалютна дакладнай рытмічнасці ў ігры (у сярэдзіне фінальнай часткі наогул рытм быў «хісткі»), але яны не бянтэжыліся і з захапленнем ішлі далей і далей.

Лірызм чалавечай споведзі і заглыбленасць людзей у атмасферу часу, што так празрыста раскрыта кампазітарам, былі перададзены з юнацкай непасрэднасцю і ўдумлівасцю дапытлівых музыкантаў. Узровень выканання, шчыра кажучы, здзівіў многіх слухачоў. Такое здзіўленне — прыемнае.

Моцартаўскі «Рэквіем»...

Дарэчы, уступнае слова перад выкананнем гаворыць таксама вучань школы. Хоць звесткі ён паведамляе вядомыя, але ў манеры падачы і ў літаратурнай апрацоўцы тэксту ёсць нешта ў добрым сэнсе слова наіўнае, даверлівае, узрушанае, быццам аўтар слова толькі што сам адкрыў драматызм «Рэквіема» і гісторыю яго стварэння. Так, прынамсі, прагучала слова вучаніцы тэарэтычнага аддзялення Таццяны Барысавай пра Моцарта.

Аркестр і хор (кіраўнік Л. Яфімава) былі выдатна падрыхтаваны да канцэрта. Педагогі і дырыжор не механічна муштравалі выканаўцаў, а ўводзілі іх у свет моцартаўскага роздуму. І трэба было паслухаць, з якой захапляючай сілай уступалі басы, тэнары, а пасля — альты і сапрана са словамі «Рэквіем-этэрнам...». А потым парадаваў унісон скрыпак і альтоў. Прыемна было слухаць і жаночыя галасы (тэхніка шаснаццатых нот), якія нібы спрачаліся і потым падхоплівалі вымаўленае басамі мужчын. Зладжанасць галасоў, напрыклад, у «Дні гневу» і ўпэўненая ігра аркестра выклікалі ў зале тую цішыню, якую часамі называюць «трапяткой» — такое было выкананне.

Разам з юнымі аркестрантамі і харыстамі ўдала выступалі салісты ў разгорнутых партыях. Таісія Ляпіцкая (сапрана), Вольга Цінына (мецца-сапрана), тэнар Леанід Івашкоў і Уладзімір Цімашкевіч (бас) арганічна адчувалі, умоўна кажучы, «градус» напалу і майстэрства юных калег і натуральна ўваходзілі ў кантакт з імі.

Слухаючы, нельга было без удзячнага пачуцця да віяланчэлістаў назіраць іх узнёслае выкананне, бо музыка гучала шырока, урачыста. Наогул, мабыць, струнная група была самай лепшай сярод выканаўцаў, калі гаварыць аб іх мовай рэцэнзента.

На нашу думку, такія канцэрты — з пастаноўкай буйных музычных палотнаў з аркестрам і хорам — школа майстэрства, карысная вучням розных ступеняў. Да ўдзелу ў іх прыцягваецца вялікая колькасць юных музыкантаў. Настаўнікі і дырыжоры рыхтуюць не аднаго прэтэндэнта на прызавое месца ў якім-небудзь конкурсе, а калектыў, аб'яднаны яснай задачай, аднолькава цікавай і захапляючай для ўсіх. Юныя артысты атрымліваюць магчымасць практыкавацца ў ансамблевым выкананні значных твораў. Станаўленне прафесійна адукаванага музыканта без такой практыкі немагчыма. І добра, што камерны аркестр і камерны хор спецыяльнага вучылішча (яны існуюць ужо тры гады) арыентуюцца кіраўніцтвам і выхавацелямі якраз на гэты напрамак — правяраць сябе на складаных задачах, на выступленнях адказных, на творах значных. Канцэрт, аб якім мы гаварылі, пацвердзіў, што і вучні ахвотна бяруцца за такія задачы. А меламаны атрымалі яркае ўражанне ад сустрэчы з сапраўднай музыкай у пранікнёным і непасрэдным выкананні падлеткаў, што рыхтуюць сябе для высокага палёту, мараць аб кансерваторыі і самастойнай канцэртнай дзейнасці.

**М. АЛІСАЎ.**

# ДЫКТУЕ СЭРЦА...

**Чытач «ЛІМа» ўрач 3-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска Б. А. Шуваева піша ў рэдакцыю: «Слухачы з вялікім задавальненнем знаёмяцца з музыкай кампазітара Сяргея Картэса. Творы гучаць на канцэртнай эстрадзе, па радыё, з блакітнага экрана, у тэатральных спектаклях. Добра было б, калі б штотыднёвік «Літаратура і мастацтва» расказаў на сваіх старонках пра творчую індывідуальнасць і новыя работы гэтага кампазітара. Рэдакцыя папрасіла музыказнаўцу Л. Аўэрбаха адказаць на пісьмо чытача.**

РАЗАМ з Сяргеем Картэсам мы сядзім ля фартэпіяна. Гартаем ноты, чытаем іх вачыма, праігрываем асобныя эпізоды. І зноў адчуваем дзівосную якасць запісу музычных вобразаў на нотную паперу — твор, які яшчэ не выконваўся для публікі, ужо існуе, ён ужо рэальная з'ява мастацтва.

У мінулым годзе адзначаліся 90-годдзе з дзён нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. Зразумела, дата ўзняла цікавасць да іх паэзіі многіх беларускіх кампазітараў. Араторыя «Памяць сэрца» С. Картэса — з такіх водгукаў. Ён ужо двойчы звяртаўся да творчасці народнага песняра — у 1971 годзе кампазітар напісаў музыку да тэлеспектакля «Па шчасце, па сонца», пастаўленага па матывах купалаўскай паэзіі, праз год стварыў музычнае афармленне спектакля «Раскіданае гняздо» ў тэатры, што носіць імя паэта. Гэтыя творчыя шуканні былі своеасаблівымі этапамі да араторыі — твора буйнога маштабу, складанага, шматграннага. Праз усе матывы араторыі праходзіць асноўная ідэя: Янка Купала — патрыёт, адданы сын Беларусі, яе вялікі пясняр-рэвалюцыянер.

Кампазіцыя араторыі, напісанай для дэкламатара, двух салістаў (тэнар і мецца-сапрана), двух хораў (адзін з іх дзіцячы) і сімфанічнага аркестра, шматпланавая: пралог, сем частак, некалькі інтэрмедый — драматургія твора нібы разгортваецца ў розных музычных пластах і захоўвае ідэйна-тэматычную еднасць.

У пралогу (дэкламатар і жаночы хор) гучыць верш Янкі Купалы «За ўсё», які вызначае асноўную тэму араторыі:

**За ўсё, што сёння маю,**
**Што даў мне мой народ:**
**За кут у родным краю,**
**За хлеб-соль без клапот, —**
**Я адплаціў народу,**
**Чым моц мая магла:**
**Зваў з путаў на свабоду,**
**Зваў з цемры да святла.**

Характар музыкі — эпічна-апавядальны. Арыгінальны сам пачатак: віяланчэлі, падзеленыя на 7 партый, вытрымліваюць даволі складаны сямігучны акорд, а англійскі ражок спявае пентатонную (г. зн. асобнага пяцігучнага складу) мелодыю. Адчуваеш беларускі нацыянальны каларыт у гэтым стрымана-строгім эпічным запеве. Выразная, у чымсьці архаічная па складзе мелодыя з'яўляецца вытокам далейшых пабудоў, задае тон усяму руху музычных думак.

Аўтар скарыстаў прыёмы з арсенала сучасных сродкаў кампазіцыі — сем гукаў акорда віяланчэлей і пяць гукаў мелодыі англійскага ражка складаюць дванаццацігучную серыю. Рытмічнае афармленне мелодыі, толькі што намечанае кампазітарам, аддадзена на волю выканаўцы.

Скарыстаўшы вельмі ўмела навамодныя прыёмы, аўтар піша змястоўную музыку, у якой адцяняюцца нацыянальныя рысы.

**Першая частка на вершы «Мая навука» мае праграмны характар. Саліст-тэнар пачынае падкрэслена беларускую мелодыю (гучаць цымбалы аркестра), якую затым падхоплівае і развівае хор. Дарэчы, гэтая мелодыя гучала ў спектаклі «Раскіданае гняздо» як адна з песень на вершы Янкі Купалы «Залягла, як пасцель, лебядзіная бель». У араторыі яна стала акрэсленай тэмай і атрымала сапраўды сімфанічнае развіццё.**

**Другая і трэцяя часткі рэзка кантрастныя. У другой верш «Ваўкалак» трактуецца як вобраз жудаснага прыгнёту, што цярпеў у мінулым беларускі народ, як цёмная сіла, варожая высокай чалавечнасці. У аркестравых эпізодах ёсць гукавыяўленчыя моманты. Арыгінальна выкарыстаны для перадачы скавытання страшыдлы ваўкалака рэдкі прыём — «глісанда» літаўр. У трэцяй частцы дзіцячы хор спявае песню «На Купалле». Чыстая, празрыстая, заглыблена беларуская ў сваіх вытоках музыка перадае светлую мару аб шчасці, якую народ увасобіў у легендзе аб «папараць-кветцы».**

Некаторыя вершы Янкі Купалы гучаць у араторыі як зварот да самога паэта. Хор чацвёртай часткі на вершы «Гусляр» («Гэй, гусляр, гусляр! Ты удар, удар па струнах-званах, дай нам з песень дар...») — гэта зварот народа да свайго песняра з просьбай аб новых песнях. Музыка тут звончата-радасная.

Знайшлі сваё месца ў араторыі і вершы Янкі Купалы, напісаныя ў час першай рускай рэвалюцыі, у 1906 і 1907 гадах, і якія заклікаюць да барацьбы: «З песень а бітвах» («Іграюць сурмы баявыя»), «Перад бурай» («Што бачу? — усё ціха, усё спіць пад няславай...») і «Касцу» («Стукі, стук, стук, малаток!»).

Хор «Стукі, стук, стук, малаток!» дынамічны, імклівы, з востра імпульсіўнай рытмікай, поўны энергіі і сілы. Гэта, на нашу думку, адна з яркіх знаходак кампазітара, які здабывае мелодыю ў радках, у паэтычным поступе думкі.

Хораша завяршае араторыю складана скампанаваны фінал, дзе центральнае месца займае верш «Песня будаўніцтву» 30-х гадоў.

**Прыйдзе новы — а мудры — гісторык.**
**А ён прыйдзе — ужо ён ідзе —**
**І сказ дзіўны, праўдзівы ад зорак**
**І да зорак аб нашых прасторах,**
**Аб падзеях, людзях павядзе.**
**Ён раскажа, як з творчым імкненнем**
**Для народаў закон выдавала**
**Бальшавіцкая праўда, сумленне,**
**Каб жыццё ўжо было без цярпенняў**
**І мінула пракляцьцяў навала.**

Араторыя прысвечана памяці паэта, і апошняе слова звернута да яго. У заключным эпізодзе дзіцячы хор зноў спявае песню «На Купалле». І ў гэтым ёсць свой сімвалічны сэнс: сам жа Іван Дамінікавіч Луцэвіч некалі гаварыў, што ўзяў сабе літаратурнае імя «Янка Купала», маючы на ўвазе народнае павер'е: у ноч на Івана Купалу людзі шукаюць «папараць-кветку», якая прыносіць шчасце, і ён, паэт, бачыць мэту свайго жыцця, сваёй творчасці ў тым, каб змагацца за шчасце народнае. Таму ціхае, па-дзіцячы чыстае, вельмі паэтычнае, поўнае душэўнай цеплыні заканчэнне араторыі песняй «На Купалле» ўспрымаецца надзвычай натуральным, арганічным.

Такім чынам, твор С. Картэса яшчэ раз засведчыў, якая гэта невычэрпная крыніца — слова Купалы, як многа яна дае музыканту, калі ён сэрцам прыпадае да яе.

**Музыцы гэтага кампазітара наогул уласціва тэатральнасць у шырокім сэнсе гэтага слова, тэатральнасць як асаблівая якасць рэльефнай выразнасці музычных вобразаў, іх лаканічнасці і яркасці. Яны ў С. Картэса сутыкаюцца па законах канфліктнай драматургіі — чаргуюцца сцэны, гучаць маналогі і дыялогі. Гэта, да прыкладу, бачыш і ў яго фартэпіянным канцэрце «Капрычас», і ў вакальных творах.**

**Кампазітар часцей за ўсё звяртаецца да паэтычных тэкстаў баладнага плана, з дынамічным сюжэтам і развіццём лірычнага пачуцця.**

**— Мне здаецца, — гаворыць Сяргей Альбертавіч, — што некаторыя мае вакальныя творы спевакам варта не проста спяваць, а ў пэўнай меры па-акцёрску іграць, вырашаць выканаўчую задачу не толькі ў музычным, а і ў драматычным ключы.**

Тэатральныя схільнасці кампазітара асабліва яскрава праявіліся, натуральна, у яго тэатральных работах. Ён напісаў музыку да трыццаці спектакляў, паказаўшы сябе майстрам гэтага жанру, які добра адчувае спецыфіку мастацтва драмы.

Мабыць, пасля назапашанага вопыту ў гэтай галіне С. Картэс і «адважыўся» звярнуцца да манументальнага жанру оперы. Яго першынец — опера «Джардана Бруна» цяпер чакае пастаноўкі на сцэне. Гаварыць аб ім без сцэнічнай інтэрпрэтацыі цяжэй, але заўважым, што і тут музычная драматургія распрацавана вельмі вынаходліва. Кампазітар карыстаецца нават кінематаграфічным прыёмам імгненнага перанясення дзеяння ў часе і прасторы. Скажам, у каземаце інквізіцыі Бруна ўспамінае пра свой родны горад Ноле, — і слухач нібы бачыць «вялікага наланца» сярод святочнага натоўпу грамадзян. На экране гэта называюць «наплывам»...

Сяргей Картэс не шукае ў мастацтве лёгкага поспеху, ён ставіць перад сабой па-творчы складаныя задачы. Кампазітара вабяць тэмы, вострыя па праблематыцы, драматычныя супярэчнасці, так характэрныя для сённяшняга чалавецтва, калізіі, з якімі мы сустракаемся на кожным кроку. Успаміны пра падзеі вайны, аб подзвігу савецкіх людзей, барацьба каланіяльных народаў за свабоду і незалежнасць, адданасць і любоў да Айчыны, барацьба за перамогу розуму і прагрэсу — вось што хвалюе нас у лепшых творах кампазітара, ці гэта вакальна-сімфанічная паэма «Попел», ці араторыі «Песня пра Кубу» і «Памяці паэта»... Кампазітар менш за ўсё захапляецца лірычнай эмацыянальнасцю, ён аддае перавагу апавяданню на высокіх драматычных нотах. Не выпадкова большасць вакальных твораў Картэса — гэта балады, паэмы, маналогі (а не рамансы ці песні), вакальная мелодыя рэчытатыўна-апавядальнага (а не кантыленнага) характару. Фартэпіянная або аркестравая партыя гучаць у яго драматычна-напружана і выконваюць выяўленчую або гукавыяўленчую функцыю, а не ролю простага акампанементу.

Калі псіхалагічная праўда і драматызм — адна грань творчых схільнасцей С. Картэса, то другая грань больш уласцівая яго інструментальным п'есам, — іронія, гратэск, сарказм, фантастычнасць. Яны сустракаюцца ў цыклах фартэпіянных і цымбальных п'ес, у канцэрце «Капрычас», у «Музыцы для струнных».

**Як і іншыя маладыя аўтары фармацыі 50—60-х гадоў, С. Картэс цікавіцца па-сучаснаму новымі сродкамі музычнай мовы, якія ўвайшлі ў кампазіцыйную практыку ў сярэдзіне XX стагоддзя, прыёмамі серыйнай тэхнікі, пошукамі новых гучанняў, элементамі імправізацыйнай нечаканасці ў выкананні і г. д. Відаць, што кампазітар добра іх ведае, валодае імі, але не злоўжывае, карыстаецца тактоўна і разумна тады, калі яны сапраўды да месца і спрыяюць больш яркаму ўвасабленню ідэйна-мастацкай задачы. Такія эпізоды ёсць у паэме «Попел» і араторыі «Памяці паэта», у «Музыцы для струнных» і ў нумарах са спектакля «Раскіданае гняздо».**

Жанравыя інтарэсы С. Картэса яшчэ не вельмі шырокія: цэлы шэраг жанраў — балет, сімфонія, квартэт, лірычны раманс, масавая песня, эстрадная музыка — ім пакуль што не закрануты. Гэта звязана, на нашу думку, з важным творчым прынцыпам: пісаць не тое, што можаш, а тое, што хочацца, у чым адчуваеш унутраную патрэбу. Кампазітар-прафесіянал павінен, па сутнасці, умець рабіць усё, і С. Картэс гэта «ўсё» ўмее — яго работа ў галіне тэатральнай музыкі, дзе даводзіцца звяртацца да самых розных жанраў і форм, прыёмаў і стылістычных напрамкаў, гэта ясна паказала. Але калі гаворка ідзе не пра «заказ», а пра натуральнае жаданне выказацца па гэтай тэме ў гэтым жанры, то трэба, каб такое жаданне выспела. Такі строгі і сур'ёзны падыход да творчасці заслугоўвае павагі. Але, думаецца, і жанравая палітра кампазітара Сяргея Картэса, які дасягнуў творчай сталасці, паступова ўзбагаціцца.

**Л. АЎЭРБАХ.**







*На ўскраіне Бабруйска раскінуліся карпусы-гмахі Беларускага шыннага камбіната — аднаго з буйнейшых прадпрыемстваў краіны.*

*Тут працуюць тысячы рабочых і інжынераў самых розных прафесій.*

*Мастак Юрый Нікіфараў пабываў на будоўлі камбіната. У выніку — нарадзілася серыя малюнкаў, у якіх ён расказвае пра апантаных, улюбёных у справу людзей, пра іх натхнёную, поўную сэнсу працу.*

*Мы прапануем некалькі малюнкаў з гэтай серыі.*

# МОЙ СЯБРА — МАСТАК...

З Аляксандрам Васільевічам Паплыкам мы пазнаёміліся гадоў восем назад, калі ён працаваў загадчыкам Пачапоўскага сельскага клуба на Краснапольшчыне. Клубная самадзейнасць славілася ў той час на ўсю вобласць, і вялікая заслуга ў гэтым была яго, Аляксандра. Ён сам іграў на баяне, любіў сцэну, з задавальненнем прыцягваў да ўдзелу ў самадзейнасці сельскую моладзь.

Памятаецца з густам аформленае памяшканне клуба. Усё было зроблена рукамі Аляксандра Васільевіча.

Мы ўсё часцей сустракаліся і пасябравалі.

Ён захапляўся жывапісам, але доўгі час нічога не паказваў. Аднойчы Аляксандр Васільевіч паклаў перада мною некалькі работ: «На таку», «Зімовы пейзаж», «Аўтапартрэт». Былі яны яшчэ недасканалыя, але напісаныя шчыра. Ад усяго сэрца ўслаўляў самадзейны мастак чалавека працы, апяваў родную прыроду.

Ён шмат працаваў. Цяпер, перш чым прыступіць да работы над карцінай, ён піша эцюды. Яны разам з партрэтам «Дзяўчына з кнігай» і «Вясновым пейзажам» экспанаваліся на выстаўцы работ самадзейных мастакоў.

Неўзабаве на яго звярнулі ўвагу не толькі аматары жывапісу, але і мастакі - прафесіяналы. Яго запрасілі працаваць у мастацкія майстэрні Краснаполля.

Збылася яго мара. Яго цікавіць літаральна ўсё, чым так багата наша жыццё. На раённай выстаўцы, прысвечанай 50-годдзю ўтварэння СССР, экспанавалася каля дваццаці палотнаў мастака-аматара, дзесяць з іх былі адабраны для абласной выстаўкі ў Магілёве. Асаблівы поспех выпаў на долю работ, у якіх ён апявае прыроду: «Бярозкі», «Надыход вясны».

Захапляецца Аляксандр Васільевіч і плакатнай графікай. Створаны ім плакат «Мір дзецям на планеце» ўпрыгожвае актавую залу Высакаборскай сярэдняй школы Краснапольскага раёна. І не толькі ўпрыгожвае. Выхоўвае. Ён заклікае людзей быць пільнымі, добрымі, уважлівымі, бо ўсе ў адказе за лёс дзяцей... Тэма барацьбы за мір узнімаецца мастаком і ў іншых плакатах.

Мне падабаецца апантанасць гэтага чалавека, яго неардынарнае мастакоўскае бачанне навакольнага жыцця і ўменне расказваць пра яго проста і ўсхвалявана.

У апошні час Аляксандр Васільевіч шмат працуе ў жанры партрэта. Яго прывабіла асоба вялікага доменшчыка Расіі, ураджэнца Краснаполля Міхаіла Канстанцінавіча Куракі. Дваранін, уладальнік вялікага маёнтка, ён пяць год працуе рабочым (падвозіць на тачцы руду да доменнай печы) на Бранскім металургічным заводзе. Асвойвае доменную справу і робіцца гарнавым майстрам. Першы ў свеце расплаўляе чыгун у горне доменнай печы. Ён удзельнік рэвалюцыйных падзей 1905 года, бо на свае вочы пабачыў, як цяжка жыве народ. Давялося яму пабываць і ў ссылцы...

Усяго трыццаць гадоў было адпушчана Міхаілу Кураку. А колькі зроблена!

Гэтага незвычайнага чалавека імкнуўся паказаць Аляксандр Васільевіч. Ён засяроджвае нашу ўвагу на твары Міхаіла Куракі — валявым, энергічным, інтэлігентным. Здаецца, партрэт атрымаўся. Кожны раз усё цікавей на яго глядзець, усё больш знаёмым робіцца незнаёмы чалавек.

Наступная работа — партрэт нашага земляка Героя Савецкага Саюза Міхаіла Антонава, які загінуў пры вызваленні Арла ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Чым больш працаваў А. Паплыка, тым больш адчуваў, што яму не хапае адукацыі, эрудыцыі, майстэрства. І Аляксандр Васільевіч садзіцца за кнігі. Спачатку скончыў завочны народны універсітэт мастацтваў Цэнтральнага дома народнай творчасці ў Маскве, потым — Магілёўскае культасветвучылішча імя Н. К. Крупскай. Зараз ён студэнт-завочнік чацвёртага курса графічнага факультэта Віцебскага педагагічнага інстытута імя С. М. Кірава. Працуе і вучыцца мой сябра Аляксандр. І пра тое, што робіць ён гэта паспяхова, сведчаць шматлікія граматы і дыпломы, якія ён атрымаў на выстаўках.

**Сямён СЯМЁНАЎ.**

# ПРАЕКТЫ І ІХ

...Колькі цікавых праектаў стварылі нашы дойліды ў апошнія гады, колькі праектаў нараджаецца сёння... Маленькіх і вялікіх, індывідуальных і калектыўных, планіровачных, горадабудаўнічых, аб'ёмных—самага рознага функцыянальнага прызначэння.

Мы пачалі рэканструкцыі цэнтраў нашых гарадоў і галоўных магістралей, якія звязваюць цэнтры з новымі жылымі раёнамі, мы працягваем будаваць новыя гарады і вёскі, буйныя прадпрыемствы, ствараем тое матэрыяльнае асяроддзе, па якім нашчадкі будуць меркаваць аб нашым часе.

Перад намі—адказныя задачы, якія патрабуюць усебаковага аналізу і ўдзелу спецыялістаў многіх профіляў—эканамістаў, транспартнікаў, канструктараў, архітэктараў, сацыёлагаў, урачоў, тэхнолагаў і г. д.

Вырашыць задачы, пастаўленыя партыяй перад намі, архітэктарамі, немагчыма і без сапраўднай крытыкі, прынцыповага, адкрытага абмеркавання праектаў.

Новыя ідэі заўсёды звязаны са зменай крытэрыяў, пераадоленнем кансерватызму мыслення. Праблема навізны заўсёды была найбольш вострай праблемай творчасці архітэктара. Архітэктурная крытыка не павінна стаяць у позе стараннага назіральніка, яна абавязана дапамагаць прафесійнаму развіццю нашага дойлідства.

Вядома, што стэрэатыпы з'яўляюцца тады, калі няма сапраўднага творчага гарэння, калі пошук жорстка рэгламентаваны, калі архітэктар кіруецца, перш за ўсё, распаўсюджанымі схемамі, калі адсутнічае сапраўдная прынцыповая крытыка.

На V з'ездзе архітэктараў СССР у справаздачным дакладзе было сказана, што мастацтва архітэктуры не можа развівацца без удумлівай аб'ектыўнай, заснаванай на марксісцка-ленінскіх канцэпцыях архітэктурнай крытыкі. З таго часу прайшло 3 гады. У Саюзе архітэктараў БССР, у мясцовых арганізацыях мы многа гаварылі аб развіцці архітэктурнай крытыкі, мы разумеем, што яна проста неабходная, таму што садзейнічае фарміраванню эстэтычных поглядаў не толькі саміх архітэктараў, але і ўсіх «спажыўцоў» архітэктуры. Што ж перашкаджае?.. Чаму і да сёння мы толькі вядзем гаворкі?.. Мне здаецца, прычыны слабасці нашай архітэктурнай крытыкі нельга растлумачыць толькі няўменнем арганізаваць яе або нежаданнем аўтараў праектаў «падвяргацца» крытыцы. Многія прычыны, як ні дзіўна, у арганізацыі самой праектнай справы.

Пры пераходзе да праектавання з улікам індустрыялізацыі будаўніцтва адбылася адпаведная цэнтралізацыя кіраўніцтва архітэктурай, павялічылася колькасць кантралюючых і ўзгадняючых інстанцый, праз якія праходзіць праект, адбылася цэнтралізацыя тыпавога праектавання, на базе якога і забудоўваюцца вялікія жылыя раёны. Зрабіліся больш цеснымі кантакты праекціроўшчыкаў з будаўнікамі, з індустрыяй будаўнічых матэрыялаў. І толькі шырокая крытыка з боку грамадскасці не атрымала новых арганізацыйных форм і ўмоў, засталася на даўнейшым узроўні. Адсутнасць новых сучасных форм грамадскай архітэктурнай крытыкі, млявасць, небаявітасць яе прывялі да таго, што зачастую многія аб'екты пачалі будавацца па праектах, якія ўзгадняліся ў, так званым, рабочым парадку. «Службовая» крытыка падмяніла грамадскую! Прывілея закрытай службовай крытыкі над адкрытай грамадскай задавальняе многія кантралюючыя і ўзгадняючыя органы. Дайшло да таго, што, напрыклад, у Мінскпраекце некаторыя заўзятыя адміністрацыйныя работнікі пачалі забараняць архітэктарам выступаць у друку без ведама кіраўніцтва—як бы чаго не атрымалася...

«Службовая», закрытая крытыка ўлічвае, перш за ўсё, кан'юктурныя меркаванні, яна не дае глыбокага аналізу і прыкрываецца, як правіла, магчымасцямі сённяшняга дня, дзеючымі нарматывамі і іншымі «аб'ектыўнымі» прычынамі. Не надае яна належнай увагі і аналізу сучаснага стану архітэктуры з яго індустрыяльнымі метадамі будаўніцтва, якія так актыўна ўплываюць на аблічча горада.

# ПАЛАЦ МАСТАЦТВА







*Гэты незвычайны па архітэктуры будынак па вуліцы Казлова ў Мінску —Выставачны павільён Саюза мастакоў БССР. Пакуль тут пануе цішыня. Прыгожыя прасторныя залы хутка прымуць першыя творы жывапісу, графікі, скульптуры...*

*У павільёна—тры выставачныя залы. Агульная плошча іх 2000 квадратных метраў. Есць і канферэнц-зала з кінаўстаноўкай. Неўзабаве яе запоўняць людзі, якія цікавяцца выяўленчым мастацтвам. Тут яны змогуць пачуць высокакваліфікаваных лектараў.*

*Пакіль рабочыя вядуць апошнія прыгатаванні да адкрыцця павільёна, навуковыя супрацоўнікі складаюць планы работы. У бліжэйшы час мінчане пазнаёмяцца ў Выставачным павільёне з работамі мастакоў братніх рэспублік, экспазіцыямі, падрыхтаванымі Траццякоўскай галерэяй, Эрмітажам, Рускім музеем і іншымі буйнымі мастацкімі музеямі краіны.*

*Адкрыццё Выставачнага павільёна, безумоўна, стане значнай і радаснай падзеяй у культурным жыцці нашай рэспублікі.*

*На здымках, якія зрабіў для нас Міхаіл Шуманскі, некалькі прыгожых «куткоў» новага павільёна.*

# ЗДЗЯЙСНЕННЕ



Такі вялікі раздзел архітэктуры, як масавае жыллёвае будаўніцтва, практычна «выпаў» з-пад кантролю крытыкі. Можа якраз таму такія аднастайныя і непрывабныя з архітэктурнага пункту гледжання новыя жылыя раёны ў многіх гарадах рэспублікі?

Прыгадаем, як зацвярджаўся ў нас праект дзевяціпавярховых буйнапанельных дамоў серыі 335. Па сутнасці, работа ішла так, што грамадскасць не была інфармавана аб ёй. Тлумачылася гэта вельмі сціслымі тэрмінамі праектных распрацовак. Замест таго, каб старанна і ўсебакова прааналізаваць задуму, узвесці эксперыментальныя дамы, праверыць у натуры якасныя паказчыкі збудавання і толькі пасля гэтага вырашаць — тыражыраваць гэтую серыю або не — усё было зроблена наадварот. Вынік відочны... У большасці новых жылых раёнаў з'явіліся дамы-блізняты. Мала таго — дамамі гэтай серыі пачалі забудоўваць магістралі Мінска, а гэта, натуральна, прывядзе да таго, што і яны стануць падобнымі адна на адну. Ёсць і «свежы» прыклад... Майстэрня буйнапанельнага домабудаўніцтва Мінскпраекта ў страшэннай спешцы распрацавала праект панельнага 9-павярховага інтэрната серыі 335 для канкрэтнага месца і для аднаразовага яго прымянення. Натуральна, такі праект у шырокім абмеркаванні не меў патрэбы. Аднак нехта даў указанне на паўторнае шматразовае ўжыванне гэтага праекта ў Мінску, нягледзячы на пярэчанні яго аўтараў, якія ведалі многія недаробкі і недахопы праекта.

Толькі майстэрні, у якой я працую, неабходна да 1 верасня прывязаць 10 такіх інтэрнатаў на адказных горадабудаўнічых месцах. Змяніць што-небудзь у самім праекце пры прывязцы ў такія тэрміны немагчыма, і ўсе памылкі арыгінала будуць паўтораны ў копіях.

Яшчэ прыклад. Сёння мы пачалі рэканструкцыю цэнтра Мінска. Многа спрэчак было ў свой час — зносіць або не зносіць Нямігу. Жыццё, якое патрабуе развіцця транспартных магістралей у цэнтры, прымусіла знесці старую забудову. Здавалася б, што на такі адказны ўчастак цэнтра горада неабходна было аб'явіць шырокі адкрыты, літаральна ўсесаюзны конкурс, які б дазволіў выбраць з многіх праектаў найбольш аптымальнае вырашэнне забудовы Нямігі, у якім былі б глыбока прааналізаваны ўсе кампаненты забудовы—і горадабудаўнічыя, і аб'ёмна-прасторавыя, і планіровачныя, і транспартныя, і эканамічныя, і санітарныя. Конкурсу аб'яўлена не было, работа гэта аказалася ў руках аднаго архітэктара, прапановы якога, між іншым, былі падвергнуты крытыцы пры грамадскім абмеркаванні праекта дэталёвай планіроўкі цэнтра Мінска. Да думкі грамадскасці зноў чамусьці не прыслухаліся.

Прыкладаў такіх у практыцы будаўніцтва Мінска нямала. Але ёсць і другі бок медаля — самі архітэктары баяцца ўсякага абмеркавання —і службовага, і грамадскага, таму што, абмяркоўваючы праект, мы часамі (няма чаго граха таіць) нівеліруем і падганяем пад стэрэатыпы індывідуальнасць аўтара, які выйшаў за рамкі «сярэдніх» уяўленняў і існуючых нарматываў, які імкнуўся знайсці перспектыўнае, новае рашэнне, вобраз будынка.

Галоўная задача грамадскай крытыкі — фарміраванне эстэтычных густаў людзей, у тым ліку і саміх архітэктараў, прапаганда сапраўды перадавых архітэктурных ідэй.

Мы нярэдка праводзім шырокія абмеркаванні ўзведзеных ужо будынкаў для таго, каб вучыцца на наглядных памылках і пераймаць усё лепшае. Гэта асабліва важна для маладых дойлідаў, якія не маюць пакуль практычнага вопыту. У натуры, у гатовым будынку, заўсёды ўсё больш наглядна, і кожны ўдзельнік такога абмеркавання здолее зрабіць для сябе карысныя высновы. І аўтар — для якога гэты дом, канечне, не апошні, і яго калега, які разумее, што лепш вучыцца на чужых памылках, чым на сваіх.

Але, вядома, галоўную карысць і дзяржаве, якая затрачвае вялікія грошы на праектаванне і будаўніцтва, і людзям, якія будуць карыстацца вынікамі працы праекціроўшчыкаў, і самім аўтарам прыносіць усебаковае, кваліфікаванае, своечасовае, адкрытае, аб'ектыўнае, грамадскае абмеркаванне праекта да яго зацвярджэння ў адпаведных інстанцыях.

У нас на рабочых сталах з кожным днём усё больш і больш буйных адказных у горадабудаўнічых адносінах аб'ектаў, значэнне якіх перавышае суб'ектыўную думку аўтара. Праекты іх павінны ўсебакова абмяркоўвацца да зацвярджэння, грамадская крытыка — дапамагчы архітэктару-аўтару зразумець і як бы нанава ацаніць значэнне сваёй работы, ўзняць праблемныя пытанні, якія кожны павінен рашыць для сябе, для сваёй далейшай творчасці.

У бліжэйшы час у Саюзе архітэктараў БССР намечана правесці шырокае абмеркаванне адной з важнейшых работ — каталога уніфікаваных індустрыяльных вырабаў для прымянення ў Беларусі. Усе праекціроўшчыкі даўно ўжо чакаюць вынікаў гэтай працы. Вялікая група архітэктараў і канструктараў правяла сумесна з Дзяржбудам і Міністэрствам будаўніцтва значную работу па стварэнню каталога, але перш чым яго зацвердзіць, неабходна ўсебакова абмеркаваць усе дэталі на шырокім форуме грамадскасці з тым, каб пазбегнуць памылак і ўлічыць усе карысныя прапановы спецыялістаў.

Нашы архітэктары ў апошнія гады сталі больш выкарыстоўваць магчымасці, якія прадастаўляюцца друкам, радыё і тэлебачаннем для асвятлення пытанняў архітэктурнай дзейнасці, больш робяць дакладаў і лекцый у шырокай аўдыторыі, архітэктары перыядычна сустракаюцца з калектывамі прадпрыемстваў па лініі бюро прапаганды Саюза архітэктараў БССР. Аднак многія артыкулы, рэцэнзіі і выступленні нашых калег часта носяць павярхоўны характар, пытанні разглядаюцца недастаткова прафесійна, у выступленнях мала ўдзяляецца ўвагі павышэнню ідэйна-мастацкага ўзроўню архітэктуры.

Хацелася б, каб наша прэса больш увагі ўдзяляла прынцыповай архітэктурнай крытыцы важнейшых работ беларускіх дойлідаў.

У пастанове ЦК КПБ аб сур'ёзных недахопах у праектаванні і забудове другога дыяметра г. Мінска Саюзу архітэктараў БССР указана на неабходнасць шырокага абмеркавання праектаў для выяўлення лепшых архітэктурных рашэнняў. Наша задача — мабілізаваць архітэктурную грамадскасць супраць праяў недальнабачнасці і кан'юнктуршчыны, супраць архітэктурнага браку. Грамадская крытыка павінна садзейнічаць стварэнню ў асяроддзі архітэктараў абстаноўкі высокай узаемнай патрабавальнасці і сапраўды творчай атмасферы.

**Ю. ГРЫГОР'ЕЎ,**
**кіраўнік архітэктурна-праектнай майстэрні № 1 інстытута Мінскпраект, намеснік старшыні праўлення Саюза архітэктараў БССР.**

# НА ВЕРНАСЦЬ

*Міністэрства культуры Беларускай ССР адобрыла вопыт работы культурна-асветных устаноў Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці па ваенна-патрыятычнаму выхаванню працоўных і прапанавала абласным і Мінскаму гарадскому ўпраўленням, гарадскім і раённым аддзелам культуры выкарыстаць у дзейнасці культасветустаноў вопыт работы Пружанскага раёна.*

*Ніжэй змяшчаем артыкул нашага спецыяльнага карэспандэнта І. Маркевіча, які пабываў у Пружанскім раёне.*

## ГІСТАРЫЧНАЯ ХРОНІКА

У летапісу Пружанскага краю нямала такіх падзей, якія звязаны з гераічным мінулым нашага народа.

Яшчэ ў 1410 годзе пружанскія ратнікі прымалі актыўны ўдзел у Грунвальдскай бітве. Перад Паўночнай вайной у Пружанах пабываў Пётр Першы з атрадамі рускіх воінаў.

У жніўні 1812 года ў ваколіцах Паддубна—Гарадзечна войска генерала Тормасава перамагло вайсковыя злучэнні французаў.

На Пружаншчыне дзейнічалі паўстанцы Каліноўскага. А ў гады першай рускай рэвалюцыі бунтавалі сяляне.

Тут у 1920 годзе часці Чырвонай Арміі на чале з Тухачэўскім вялі баі з легіянерамі Пілсудскага.

Калі часова Заходняя Беларусь знаходзілася пад уладай буржуазнай Польшчы, у Пружанах быў створаны падпольны райком партыі . На працягу 1932—1933 гадоў няспынна праходзілі забастоўкі лесарубаў Белавежскай і Ружанскай пушчаў.

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў раёне разгарнуўся антыфашысцкі рух, які ўзначальваў Брэсцкі падпольны абком партыі. Кіраваў ім сакратар абкома Іосіф Урбановіч. У барацьбу ўключылася падпольная камсамольская арганізацыя «Смалянскія маладагвардзейцы». На тэрыторыі раёна дыслацыраваліся партызанскія атрады імя Кірава, імя Гастэлы, «Савецкая Беларусь» і іншыя. Дванаццацігадовы падлетак Ціхан Баран паўтарыў подзвіг Івана Сусаніна. Лётчык Сцяпан Гудзінаў тараніў скопішча варожых салдат і баявой тэхнікі. Пры абароне Брэсцкай крэпасці загінулі 53 ураджэнцы Пружаншчыны.

●

Прапагандысты і палітінфарматары, работнікі культустаноў раёна добра выкарыстоўваюць мясцовы матэрыял у сваёй паўсядзённай працы па выхаванню новага чалавека.

Гадамі набываўся вопыт, удасканальваліся форма і метады прапагандысцкай работы. Цяпер яна ператварылася ў стройную сістэму, вядзецца мэтанакіравана, мае свае асаблівасці.

Пытанні ваенна - патрыятычнага выхавання абмяркоўваюцца на бюро і пленумах райкома партыі, пасяджэннях і сесіях райвыканкома. Вядзецца ўвекавечванне памяці змагароў за народнае шчасце — ствараюцца народныя музеі, мемарыяльныя пакоі, куткі, клубы рэвалюцыйнай, баявой традыцыі і інтэрнацыянальнай дружбы, пішуць летапісы, гісторыі гаспадарак і прадпрыемстваў.

Ва ўсім гэтым дзейсную дапамогу аказвае савет старэйшых камуністаў. Усяго ў савеце 38 чалавек, былых партыйных работнікаў, воінаў, партызан. Сярод іх — сакратар падпольнага райкома партыі С. Пацяруха, намеснік камандзіра партызанскага атрада па разведцы В. Рыгін, работніца падпольнай друкарні Л. Дурэйка і іншыя. Яны з'яўляюцца галоўнымі прапагандыстамі і ўдзельнікамі ўсіх мерапрыемстваў ваенна-патрыятычнага выхавання. У калгасах і саўгасах гэтую ганаровую місію выконваюць саветы ветэранаў вайны і працы.

У раёне створаны таксама савет па турызму і экскурсіях. Вялікую работу праводзяць сельскае спартыўнае таварыства «Ураджай», камітэт ДТСААФ, раённае таварыства «Веды». Як заўсёды, запявалам ва ўсіх добрых справах з'яўляецца райком камсамола.

## ПАМЯЦЬ АБУДЖАЕ ЧАС

У музеі «Баявой славы», які створаны пры Ружанскім доме культуры, экспануюцца арыгіналы шматлікіх дакументаў, асабістыя рэчы загінуўшых воінаў і партызан, якія расказваюць аб падпольнай дзейнасці ячэек КПЗБ, іх кіраўніках, барацьбе народных мсціўцаў і воінаў Савецкай Арміі.

Створаны музей па ініцыятыве былога сакратара Ружанскага падпольнага райкома камсамола Сямёна Дурэйкі. Цяпер ён працуе настаўнікам гісторыі ў мясцовай сярэдняй школе.

Заходзіш у невялікую залу музея і суровасць экспанатаў узнаўляе тыя падзеі, сведкамі якіх былі многія людзі не толькі Пружаншчыны, але і ўсёй нашай краіны. Першы раздзел прысвечаны падпольнай дзейнасці КПЗБ, якая ў перыяд панскай Польшчы вяла барацьбу за ўз'яднанне са сваімі ўсходнімі братамі. Тут жа знаходзяцца і пажоўклыя ад часу старонкі газеты «Чырвоны Сцяг» — органа ЦК КПЗБ, якая выдавалася ў Вільні (ліпень, 1932 год). На першай старонцы надрукаваны заклік да ўсеагульнай дэманстрацыі першага жніўня ў падтрымку і абарону Краіны Саветаў.

З густам афармлены куток «Рэвалюцыйная Пружаншчына». З фотаздымкаў на нас пазіраюць тыя, хто на зары стварэння Савецкай улады адстойваў заваёвы Кастрычніка, змагаўся супроць казакоў Дутава на Туркестанскім фронце, белапалякаў, на Уфімскім напрамку супроць Калчака...

Іван Барысевіч, Сцяпан Барток, Антон Хімач, Рыгор Каптур, Сямён Пяляшчук, Аляксандр Пракапеня глядзяць нам у вочы і нібыта гавораць: «Мы змагаліся за Савецкую ўладу, адстаялі яе. Будзьце пільнымі, любіце нашу Радзіму, свята беражыце заваёвы Вялікага Кастрычніка».

А вось стэнд, прысвечаны падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Тут і нумар Брэсцкай абласной падпольнай газеты «Зара» за 2 чэрвеня 1943 года з заклікам знішчаць жывую сілу і тэхніку акупантаў.

Наведвальнікі знаёмяцца з біяграфіяй слаўнага сына Брэстчыны Іосіфа Урбановіча. Яшчэ будучы падлеткам у грамадзянскую вайну ён актыўна дапамагаў партызанскаму атраду, якім камандаваў яго старэйшы брат Іван. Дзіцячае захапленне паводзінамі брата, напэўна, перадалося і яму. Апынуўшыся ў Заходняй Беларусі, ён з юначых гадоў уключыўся ў рэвалюцыйны рух. Спачатку дзейнічаў на тэрыторыі Пружанскага раёна, а пасля пераехаў у Вільню. Калі вучыўся ў гімназіі, стаў важаком рэвалюцыйна настроенай моладзі.

У 1929 годзе ЦК КПЗБ накіроўвае Іосіфа на вучобу ў партыйную школу горада Мінска. На вучобе ўтрымаўся нядоўта, каля паўгода: рваўся на радзіму змагацца супраць фашысцкага рэжыму Пілсудскага, за ўз'яднанне Заходняй Беларусі.

Просьбу ўважылі. Партыя накіроўвае юнака сакратаром акружнога камітэта ў Баранавічы. Тут ён цалкам аддаецца рэвалюцыйнай дзейнасці. Ад арышту ўцёк. ЦК накіроўвае яго ў Брэст. Але шпікі высачылі Іосіфа і ў 1931 годзе арыштавалі. Фашысцкі акруговы суд прыгаварыў актыўнага рэвалюцыянера - падпольшчыка да шасці гадоў катаргі з пазбаўленнем грамадзянскіх правоў.

Але мужнае сэрца рэвалюцыянера не супакойваецца і ў турме: ён узначальвае турэмны партыйны камітэт, выступае супраць жорсткага рэжыму. Адміністрацыя турмы катуе, збівае Урбановіча.

Здароўе значна пагоршылася. Сябры пачалі змагацца за жыццё рэвалюцыянера. 13 чэрвеня 1934 года польскія ўлады вымушаны былі выпусціць яго на парукі на 3 месяцы. Пры пераходзе граніцы Урбановіч зноўку трапляе ў рукі польскіх пагранічнікаў. І зноўку турма, на гэты раз Лукішкі.

У Вялікую Айчынную вайну ён таксама на пярэднім краі, аж пакуль куля здраднікаў не абарвала жыццё стойкага камуніста.

Пад шклом у музеі захоўваецца і сатырычны плакат «Раздавім фашысцкую гадзіну» (№ 85, 1943 г.). У ім змешчаны сатырычныя малюнкі мастака І. Сямёнава, верш А. Астрэйкі, гумарэска К. Губарэвіча, партрэты Гастэлы, Смалячкова, Сільніцкага, Даватара, Заслонава. А пад імі—верш Пятра Глебкі «Наша слава»:

Калі сэрца балюча
затужыць,
Што падзеі цябе падвялі —
Прыгадай непакорных і
дужых
Мужных воінаў нашай
зямлі.
Прыгадай іх усіх з
Магілёва,
З Беластока, Дняпра і
Дзвіны...
Прыгадай пастуха
Смалячкова —
Радавога Айчыннай
вайны...
Рыньcя ў бітву, як лётчык
Гастэла,
Каб гарачае сэрца з табой
І ў жыцці, і ўміраючы пела
Перамогу над лютай
ардой...

У музеі захоўваецца цікавы фотаальбом Кургана Славы. Шмат курганоў на нашай зямлі. Адзін з іх на Пружаншчыне.

На скрыжаванні дарог, якія разыходзяцца ў розных напрамках, пабліз краю Ружанскай пушчы гарыць над курганом пяцікутная зорка. А побач легендарны, авеяны славай Т-34. Гэта памяць аб доблесных воінах 205 танкавай дывізіі, якой камандаваў палкоўнік Ф. Кудзюраў і 14-га механізаванага корпуса генерал-маёра С. Аборына.

На гэтым невялікім кавалку зямлі, акружанай лясной сцяной, закрылі бранёю дарогу ворагам савецкія танкі. Фашысты зразумелі ў першыя ж дні вайны — дорага абыдзецца ім вераломны напад на нашу краіну.

Цяпер тут цішыня. Заруйнаваны акопы і ямы. Абапал дарогі шуміць збажына. Сурова шэпча лес. А ў Ружанскім музеі захоўваюцца асабістыя рэчы і зброя тых воінаў, што навекі спачылі ў роднай зямлі, каб сёння над ёй палымнела яснае сонца, звінелі звонкія галасы нашчадкаў, якія спяшаюцца ранкам у школу.

Помняць яны тых, хто падарыў ім спакой і радаснае жыццё. Тут, у музеі баявой славы, піянеры і школьнікі часта сустракаюцца з ветэранамі вайны. Запомніўся ім і вечар, прысвечаны памяці героя-земляка, равесніка сённяшняй піянерыі Ціхана Барана, які паўтарыў подзвіг Сусаніна.

Ідуць юнакі служыць у Савецкую Армію. Перад дарогай заходзяць у свой музей — пастаяць, адчуць подых тых суровых дзён. Прыходзяць, як на споведзь перад загінуўшымі.

## ІДУЦЬ ЧЫРВОНЫЯ СЛЕДАПЫТЫ

Зімою і летам ідуць па месцах былых бітваў чырвоныя следапыты. Асабліва гэтая работа мае акрэслены напрамак у першай школе горада Пружаны.

На рахунку клуба «Гвардзеец» шмат добрых спраў. Яго члены працуюць пад дэвізам: «Ніхто не забыты, нішто не забыта», «Да абароны Радзімы будзь гатоў!», ёсць і свая аксіёма: «Мы вучымся працаваць у рабочых і калгаснікаў, мужнасці — у воінаў Савецкай Арміі».

Пры клубе створана каля пятнаццаці секцый: стралковая, інтэрнацыянальная, баявыя сяброўкі, тэлеграфістаў, ваенна-спартыўных гульняў, цікавых сустрэч... Пра адну з іх — чырвоных следапытаў — варта расказаць.



Побліз Ружан, каля кургана славы застыў легендарны Т-34. На брацкай магіле загінуўшых танкістаў палымнеюць яркія кветкі. Штогод у Дзень Перамогі сюды прыходзяць былыя аднапалчане, ветэраны вайны. Ганаровую варту, як заўсёды, нясуць юныя ленінцы і воіны Савецкай Арміі.

Фота А. БАРАНАВА.

Ранішнюю цішыню пагранічнага наваколля скаланула раскацістае рэха бомбавых разрываў. Фашысты кованымі ботамі ступілі на нашу зямлю...

Разбуджаныя нечаканым выбухам, паўсхопліваліся з ложкаў людзі і павыскаквалі на вуліцы. Страшная здагадка паласнула па сэрцах. У небе тым часам стракаталі кулямёты знішчальнікаў, магутнымі арламі насіліся чырваназорныя ястрабкі, знікалі за хмары і зноў насядалі на плечы цяжкіх варожых бамбавозаў.

Адзін з нашых самалётаў рвануў убок, нібы ратаваўся ад згубы. «Няўжо спасаваў?» — падумалі тыя, хто прагавіта сачыў за небам. Але знішчальнік развярнуўся і пайшоў у лабавую. Чорным шлейфам пацягнуўся дым услед за падаючым самалётам.

Бясстрашны савецкі лётчык пратараніў варожага сцярвятніка. Гэта здарылася на золку, а пятай гадзіне раніцы.

Хто ён, гэты мужны чалавек? Тады яшчэ людзі не ведалі яго імя. Але засталіся жывыя сведкі паветранага бою. Пра гэта яны і расказалі чырвоным следапытам. Пачаліся настойлівыя пошукі. Напісалі ў Цэнтральны архіў Савецкай Арміі. Прыйшоў адказ з указаннем прозвішча лётчыка — гэта быў намеснік камандзіра эскад-

У госці да членаў патрыятычнага клуба «Гвардзеец» прыехаў Герой Савецкага Саюза Г. К. Масалоў.

Фота М. ШУЛЬМАНА.



У складзе атрада «Граніт» многія юнакі і дзяўчаты з Пружан прымалі ўдзел у VI усесаюзным паходзе па месцах баявой славы савецкага народа.
У Маскве яны сустрэліся з пісьменнікам Канстанцінам Сіманавым.

# РАДЗІМЕ

рыллі 33-га знішчальнага палка старшы лейтэнант Сцяпан Гудзімаў.

А праз некаторы час у цэнтральнай прэсе чытачы даведаліся пра подзвіг С. Гудзімава. Адгукнуліся аднапалчане, прыслалі ў школу лісты, у якіх расказвалі пра свайго саслужыўца.

Такіх герояў забываць нельга. І чырвоныя следапыты напісалі ліст у Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР з просьбай аб узнагароджанні пасмяротна савецкага сокала, які ў ліку першых паў смерцю храбрых за абарону Радзімы. Праз некаторы час яны бязмежна радаваліся, калі чыталі ўказ аб узнагароджанні пасмяротна лётчыка Сцяпана Гудзімава ордэнам Айчыннай вайны II-й ступені.

У добрых справах дзеці асабліва дасціпныя. На гэтым яны не супакоіліся.

— А што, калі ўвекавечым памяць героя, узвядзём яму помнік? — нехта падаў думку.

Прапанову падтрымалі ў раёным камітэце партыі і ў райвыканкоме. Дружна выходзілі чырвоныя следапыты на нядзельнікі, зарабляючы грошы на помнік. Звярнуліся за дапамогай да камандуючага паветранымі сіламі, каб прыслаў вінт ад самалёта. І ім дапамаглі. На заробленыя сродкі закупілі будаўнічага матэрыялу.

Падсобілі і шэфы аднаго з заводаў.

Працавалі шчыра. Самі ж і праектавалі помнік. Да 50-годдзя з дня нараджэння піянерскай арганізацыі карпатлівая работа была скончана. Летась, 19 мая, у дзень юбілею савецкай піянерыі ў гарадскім скверы адкрывалі помнік. На ўрачыстасцях прысутнічалі польскія піянеры, якія гасцявалі ў пружанскіх следапытаў.

А вось яшчэ адзін з цікавых ваенных эпізодаў, раскрыты няўрымслівай піянерыяй з Пружан. Тэму гэтай падзеі некалі выбраў для свайго сачынення былы чырвоны следапыт першай школы, член патрыятычнага клуба «Гвардзеец», а цяпер курсант Ленінградскага вышэйшага ваенна-палітычнага вучылішча Аляксандр Шульман.

...Ён некалі здзівіў сваёй маладосцю жыхароў горнага сяла. Не сівабароды аксакал, умудроны доўгім жыццём, а ўдумлівы цёмнавокі юнак — такім быў малады настаўнік, які прыехаў з Тбілісі. Дзеці прынеслі на першы ўрок кветкі.

А праз некалькі месяцаў яго праводзілі на фронт. Дваццацігадовы воін пайшоў абараняць родную зямлю. І — не вярнуўся.

Мы ведаем Тыграна Налбандана па здымку. Але ў летапіс бяссмерця ўвайшоў камсамольскі білет за № 6095180 выпускніка Тбіліскага педагагічнага тэхнікума. Яго знайшлі будаўнікі ў руінах дома на Пружаншчыне.

Пачаўся пошук. Так раскрылася яшчэ адна старонка гераічнай кнігі. Яна расказала, што каля адной вёскі тры чэрвеньскія дні сорак першага года стрымлівалі лавіну ворагаў воіны 25-й танкавай дывізіі 10-й арміі. Сярод іх змагаўся і сын Арменіі.

Сілы былі няроўнымі. Знясіленых і акрываўленых байцоў акружылі гітлераўцы. Ранены Тыгран узлез на гарышча хаты і адстрэльваўся да апошняга патрона. Не жадаючы, каб камсамольскі білет трымалі ў руках ворагі, старанна загарнуўшы ў хусцінку, ён схаваў яго пад комінам.

А раніцай воіны загінулі. Тоненькая кніжачка ляжала яшчэ доўгія гады. І доўга не ведалі пра свайго брата Лела і Елізавета.

Юныя следапыты адшукалі іх, расказалі аб усім. І ў адказ з далёкай Арменіі прыйшоў ліст, а ў ім здымак Тыграна.

Толькі за тры гады чырвоныя следапыты адшукалі магілы 186 воінаў, якія загінулі ў першыя дні вайны. І кожная з іх — цэлае жыццё, а жыццё — гэта цікавая кніга. Раскрыеш яе і перад вачыма паўстаюць родныя і блізкія, іх праца і вучоба, барацьба і гібель за Радзіму-маці.

Прайшло шэсць год з дня заснавання патрыятычнага клуба «Гвардзеец». Дзе ж тыя рабяты, якія першымі вызначыліся на ваенна-спартыўных гульнях «Зарніца». Георгій Бунай — курсант ваеннага вучылішча, Аляксандр Шырма — ваеннаслужачы, выдатнік баявой і палітычнай падрыхтоўкі, Валерый Капаровіч — курсант вышэйшага ваенна-марскога вучылішча, Ігар Зяляняк — курсант вышэйшага вучылішча пагранвойск... Больш за сотню выпускнікоў школы служаць афіцэрамі Савецкай Арміі. Кожны год у ваенныя вучылішчы падае заявы амаль палавіна юнакоў.

Ганаровым прэзідэнтам клуба з'яўляецца двойчы Герой Савецкага Саюза генерал арміі Павел Іванавіч Батаў, членамі — Герой Савецкага Саюза, былы выпускнік школы Міхаіл Васільевіч Хацімскі, лётчык-касманаўт Валерый Фёдаравіч Быкоўскі... Навечна занесены ў спіс клуба многія ўдзельнікі і героі Айчыннай вайны.

Каля помніка лётчыку герою Сцяпану Гудзімаву прымаюцца новыя члены клуба. І тады гучыць клятва: «Я, вучань Пружанскай СШ № 1, уступаючы ў члены клуба «Гвардзеец», урачыста клянуся...»

Добрую справу робяць члены клуба «Гвардзеец». Ва ўсім ім дапамагае завуч школы па выхаваўчай рабоце Міхаіл Аркадзьевіч Шульман.

І недарэмна ў сачыненнях школьнікаў нараджаюцца вершаваныя радкі. Хай яны яшчэ не зусім дасканалыя, але шчырыя, пранікнёныя.

**Людзі жывуць паўсюдна:**
**Каці, Наташы і Жаны...**
**Ніколі я не забуду**
**Свой гарадок Пружаны.**
**Я падрасту і стану**
**Лоўкім, адважным пілотам.**
**Так, як і лётчык Гудзімаў**
**Буду вадзіць самалёты...**

У раёне распрацавана 20 турыстычных маршрутаў. Камсамольцы і моладзь прымалі актыўны ўдзел у VI этапе ўсесаюзнага паходу па месцах баявой славы савецкага народа. Летась было арганізавана 630 аднадзённых і больш 100 шматдзённых паходаў, 18 паходаў, связаных з жыццём і дзейнасцю У. І. Леніна і яго сратнікаў. Вынікі кожнага паходу—гэта сотні старонак і ўспамінаў, якія запісаны ад ветэранаў вайны і працы, цікавыя рэліквіі і экспанаты, новыя імёны герояў, глыбокі патрыятычны след у сэрцы кожнага следапыта.

На базе сабраных матэрыялаў у раёне створана 53 народныя музеі, 46 куткоў баявой славы, напісана 13 гісторый прадпрыемстваў і гаспадарак.

У раёне няма такога клуба ці дома культуры, якія б не выкарыстоўвалі ў культурна-масавай рабоце героіку сваіх землякоў. Стаіць каля Шарашоўскага гарадскога дома культуры помнік загінуўшым воінам. Сюды часта прыходзяць іх родзічы і землякі. Тут праводзяцца дні памяці загінуўшых, каля помніка даюць клятву на вернасць Радзіме юнакі-прызыўнікі, праводзяць урачыстыя лінейкі піянеры. У Калядзіцкім сельскім доме культуры часта камсамольцы наладжваюць вечары: «Подзвігі камсамольцаў-падпольшчыкаў», «Памножым славу баявую».

Культурнаасветныя ўстановы раёна вядуць шырокую прапаганду героікі бацькоў. З гэтай мэтай створаны клубы рэвалюцыйнай і баявой славы, атрады юных пагранічнікаў, патрыятычныя клубы «Гвардзеец», «Подзвіг», «Патрыёт», лекторыі і кінаклекторыі: «Іх подзвіг — жыццё», «Наша вялікая Радзіма». Часта наладжваюцца масавыя мерапрыемствы: тэматычныя вечары, дыспуты, сустрэчы, мітынгі каля помнікаў, шэфскія канцэрты для воінаў-пагранічнікаў.

Асаблівай увагі заслугоўвае сумесная работа культустаноў і школ. З дзецьмі праводзяцца агляды страявога кроку і песні, ваенізаваныя святы, урокі, зборы дружын «Змагары за народнае шчасце», адкрытыя выхаваўчыя гадзіны, шэфская дапамога інвалідам вайны і сем'ям загінуўшых воінаў.

Арганізатарам гэтых добрых спраў з'яўляецца раённы аддзел культуры, які ўзначальвае Мікола Яворскі.

## «ВЕРНА РАДЗІМЕ СЛУЖЫЦЕ...»

Вялікая работа праводзіцца па падрыхтоўцы юнакоў, якія ідуць на службу ў Савецкую Армію.

Цэласнасцю, сваёй мэтанакіраванасцю ў справе ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі пры саўгасе-тэхнікуме вызначаецца народны ўніверсітэт будучага воіна. Створаны ён тры гады назад па ініцыятыве райкома камсамола і праўлення раённай арганізацыі таварыства «Веды».

Калі зайшла гаворка аб прызначэнні рэктара універсітэта, усе пагадзіліся на кандыдатуры Вячаслава Гаўрыловіча. Ён — намеснік дырэктара па выхаваўчай частцы, добры арганізатар, умее падабраць ключы да маладых сэрцаў.

Галоўная задача універсітэта — па прыкладзе баявых і працоўных подзвігаў савецкіх людзей выхаваць у слухачоў любоў да Радзімы. Для выкладчыцкай дзейнасці запрашаюцца партыйныя і савецкія работнікі, афіцэры райваенкамата. У плане заняткаў самыя актуальныя тэмы: «Баявы шлях і баявыя традыцыі Савецкіх Узброеных Сіл», «У. І. Ленін аб абароне сацыялістычнай Айчыны» і іншыя.

Кіно з'яўляецца высокаідэйным сродкам у выхаваўчай рабоце. Выкарыстоўваюцца і іншыя тэхнічныя наглядасці. Калі вывучалі тэму «Абарона сацыялістычнай Айчыны — высокі і гаваровы абавязак кожнага грамадзяніна СССР», слухачы універсітэта глядзелі фільм «Я салдатам Радзімы буду». А пасля лекцыі «Прысяга і статуты аб воінскім абавязку і гонару» — кінафільм «Прысяга Радзіме».

Савет універсітэта і выкладчыкі спалучаюць выхаванне высокіх маральна-палітычных якасцей з ваенна-тэхнічнымі ведамі. А каб глыбей засвоіць гэтыя веды, у тэхнікуме працуюць аўтамота- і радыёгурткі, гурткі тапографаў і сандружыннік. Не выпадкова па выніках абаронна-масавай работы саўгастэхнікум трывала займае першае месца ў раёне, а па стралковаму спорту аднойчы перамаглі ўсе мацнейшыя калектывы рэспублікі аднародных сярэдніх навучальных устаноў Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР.

На тэматычныя вечары-сустрэчы да студэнтаў у госці часта прыходзяць удзельнікі грамадзянскай і Айчыннай войнаў, героі працы, былыя падпольшчыкі, члены КПЗБ. Цікава прайшлі вечары «Баявыя сцягі расказваюць», «Юнакі рыхтуюцца стаць абаронцамі Радзімы».

Адной з форм ваенна-патрыятычнага выхавання добра зарэкамендавалі сябе паходы па месцах баявой славы, экскурсіі ў музеі. Было зроблена каля дзесятка такіх паходаў. У паходзе моладзь збірае фотадакументы, высвятляе прозвішчы старых камуністаў, герояў вайны і партызанскага руху. Часта ў паходах праводзяцца ваенныя гульні, трэніроўкі ў пераадоленні перашкод, спартыўнае арыентаванне.

За апошнія гады пабывалі ў Брэсцкай крэпасці-герої, у Хатыні, на Кургане Славы. Некаторыя члены універсітэта ўдзельнічалі ў паходзе «Граніт-41», наведалі музей Юрыя Гагарына, сустракаліся з АляксеемМарэсьевым. Паход закончыўся каля Вечнага агню на магіле Невядомага салдата ў Маскве.

Дзесьці сябры яшчэ мераюцца сіламі на ваенна-спартыўных гульнях «Зарніцы». А юнармейцы з гаспадарчага атрада рыхтуюць полудзень.

Фота М. ШУЛЬМАНА.

Сёлета адбыўся другі выпуск слухачоў універсітэта. Перад заканчэннем навучальнага года праводзіліся лагерныя зборы, спаборніцтвы па тэхнічных відах спорту.

Вясной і восенню праводзяць юнакоў на службу ў Савецкую Армію. Праводзяць урачыста, з музыкай, кветкамі. «Верна служыце Радзіме», — такі наказ даюць маладым воінам іх землякі.

І. МАРКЕВІЧ.

# Фёдару КУЛЯШОВУ—60

**18 чэрвеня спаўняецца 60 год з дня нараджэння вядомага літаратуразнаўцы і крытыка, даследчыка беларускай і рускай літаратур Фёдара Куляшова. З гэтай нагоды праўленне Саюза пісьменнікаў БССР накіроўвае юбіляру прывітанне, у якім гаворыцца:**

«Дарагі Фёдар Іванавіч!

Мы, Вашы таварышы па пяру, сардэчна віншуем Вас, вядомага літаратуразнаўцу і крытыка, з 60-годдзем з дня нараджэння.

Творчую працу Вы пачалі больш за сорак год таму назад. За гэты час Вамі напісаны гісторыка-біяграфічныя нарысы пра Л. М. Талстога, М. А. Някрасава, А. П. Чэхава, Максіма Горкага, манаграфія пра творчы шлях А. І. Купрына.

З задавальненнем адзначаем Вашу актыўную ўвагу да беларускай савецкай літаратуры. На Вашым творчым рахунку манаграфіі аб творчасці народных пісьменнікаў Міхася Лынькова і Івана Мележа, кнігі літаратурна-крытычных артыкулаў, прысвечаных праблемам развіцця сучаснай беларускай прозы.

Шмат энергіі Вы аддаяце навукова-педагагічнай дзейнасці ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна, дзе чытаеце курс літаратуры.

Жадаем Вам, дарагі Фёдар Іванавіч, добрага здароўя, доўгіх год жыцця, далейшых поспехаў у літаратурна-крытычнай і выкладчыцкай дзейнасці».

●

**Талент літаратуразнаўцы, памножаны на незвычайную працавітасць і настойлівасць.. Гэтую даволі агульную формулу лёс Фёдара Іванавіча Куляшова напоўніў сваім непаўторным зместам.**

Лёс жа быў нялёгкі: як і ад кожнага, хто прыходзіць у літаратуру, ён патрабаваў цвёрдых доказаў жыццястойкасці, прынцыповасці пазіцыі, індывідуальнасці манеры, навізны матэрыялу... І першым — найважнейшым — стаў у Фёдара Куляшова аналіз творчасці Купрына. Гэта цяпер ніводная сур'ёзная праца аб Купрыне не выходзіць без адпаведных спасылак на даследаванні доктара філалагічных навук, прафесара Ф. І. Куляшова — «Творческий путь А. И. Куприна», зборнік «А. И. Куприн о литературе», на яго шматлікія архіўныя знаходкі і публікацыі. Але перад гэтым быў перыяд самаахвярнай творчай дзейнасці, перыяд планамернага і глыбока аналітычнага сцвярджэння Купрына як аднаго з найбуйнейшых майстроў прозы, які ўзбагаціў развіццё рускай літаратуры. Сёння мы як заканамерную з'яву ўспрымаем імя Куляшова ў ліку імён рэдактараў яшчэ не закончанага дзевяцітомнага збору твораў пісьменніка.

Індывідуальнасць і талент мастака маюць для Ф. Куляшова цікавасць тады, калі яны нясуць у сабе і развіваюць вопыт папярэдняй культурнай традыцыі. Не толькі кніга пра Купрына, але і працы пра Чэхава, Льва Талстога, Някрасава вылучаюцца тонкім, своеасаблівым адчуваннем перыпетый літаратурнага працэсу, глыбокай эрудыцыяй, дакладным разуменнем праблем мастацкага майстэрства. Эстэтычны крытэрый натуральна з'яўляецца ў даследчыка меркай маралі мастака. Гэтыя ж якасці Куляшова-літаратуразнаўцы і крытыка выразна заяўляюць пра сябе і тады, калі ён звяртаецца да сучаснай беларускай літаратуры—

да творчасці Івана Мележа, Міхася Лынькова, Янкі Брыля, Івана Навуменкі, Піліпа Пестрака. Беларуская тэма не проста ўключаецца ў інтарэсы Ф. Куляшова. Яна, гэтая тэма, адлюстроўвае шчырае імкненне працягваць даследаванне літаратурнага руху на сучасным матэрыяле, руху з усімі ўласцівымі яму набыткамі і адмаўленнямі, традыцыямі і навацыямі ў мастацтве слова.

У абліччы Фёдара Іванавіча істотная яшчэ адна рыса, Педагагічная. Руская літаратура ўвну, тым больш ва універсітэце, лічыць Ф. Куляшоў, гэта не адзін з прадметаў, па якім дастаткова здаць залік і заспакоіцца. Трэба зразумець, што без глыбокага роздуму над тымі жыватворнымі ідэямі, якімі прасякнуты творы класікаў, духоўны і прафесіянальны рост маладога філолага проста немагчымы.

Тут, у гэтай прынцыповай пазіцыі выразна праступае сувязь паміж поглядамі вучонага-літаратуразнаўцы і абавязкам педагога. Мацаваць гэта адзінства — зайздросны і прыгожы шлях.

С. БУКЧЫН.

# КІНАКАМЕРАЙ і ПЯРОМ

*П. П. ШАМШУРУ — 70*

**Аповесць «Трыбунальцы» Пятра Пракопавіча Шамшура друкавалася ў часопісе «Неман». Затым выйшла асобнай кніжкай у выдавецтве «Молодая гвардия». Зноў у «Ваенвыдаце». Так яе тыраж склаў больш за трыста тысяч экземпляраў. А ў кнігарнях аповесці не знайсці...**

**Справа не толькі ў вострым, напружаным сюжэце. Чытач адчувае, што ўсе небяспечныя прыгоды і падзеі (нават самыя неверагодныя), удзельнікамі якіх былі чэкісты першых гадоў Савецкай улады, аўтар перажыў асабіста. Так, твор гэты — аўтабіяграфічны.**

**Сям'ю Шамшураў з вёскі Далгішкі Дрысенскага павета Віцебскай губерні лёс кідаў то ў Літву, то на Украіну. Нават у Сібір. Тут у 1922 годзе П. Шамшур і ўступае ў Чырвоную Армію. Васемнаццацігадовага юнака прызначаюць сакратаром Ваентрыбунала. «Удзельнічаў у разгроме белых банд на Далёкім Усходзе».—мімаходзь паведаміць Пётр Пракопавіч потым у аўтабіяграфіі. Можа з гэтага «радка» і нарадзілася аповесць «Трыбунальцы».**

**У маі 1928 года ён уступае у камуністычную партыю. Адбылося гэта ў Мінску, дзе яму давялося працаваць загадчыкам аддзела газеты «Чырвоная змена». У 1929 годзе разам з У. Стэльмахам П. Шамшур напісаў п'есу «Першы штандар». Паставіў яе Беларускі тэатр рабочай моладзі. Аўтары ў той час з'яўляліся рэжысёрамі і акцёрамі гэтай трупы.**

**У 1932 годзе намеснік начальніка Галоўмастацтва БССР П. Шамшур накіроўваецца на кінафабрыку Белдзяржкіно. Тут ён становіцца вучнем першага беларускага кінарэжысёра Юрыя Тарыча. Пётр Пракопавіч мае дачыненне да шматлікіх мастацкіх фільмаў — «Шлях карабля», «Другая радзіма», «Салавей», «Гадзіннік спыніўся апоўначы» і інш. Аднак асноўны напрамак — дакументальнае кіно. Кінастужкі «Старонкі гісторыі Мінска», «Якуб Колас», «Праўда аб святых месцах», «Людзі з чорнымі душамі», «Ахвяры абвінавачваюць», «Выкрыццё», «Кастусь Каліноўскі» — вось той далёка не поўны пералік работ вядомага кінадакументаліста.**

**Цяпер Пётр Пракопавіч дапісвае апошнія старонкі аповесці «Канец стракатага дома» — пра злачынную дзейнасць беларускіх і ўкраінскіх буржуазных нацыяналістаў. Выношвае ён задуму фільма пра Кастуся Каліноўскага. Папаўняе дакументальнымі навеламі будучую кнігу пра сяброў-кінематаграфістаў пад агульнай назвай «Белыя ночы Белдзяржкіно».**

**За доўгае жыццё Пётр Пракопавіч шмат назапасіў творчага вопыту, шмат убачыў, перажыў. І не дзіўна, што яму хочацца расказаць аб гэтым на старонках кніг. «Кінематаграфічнае бачанне» надае ім дынамізм і дакументальную дакладнасць. Таму яны маюць шырокую аўдыторыю.**

**І. РЭЗНІК,**
**метадыст Саюза кінематаграфістаў БССР.**

Рэдакцыя штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтых віншаванняў і, у сваю чаргу, шчыра жадае юбілярам доўгіх гадоў жыцця і плёну ў працы.

## ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА

Міхась ВЫШЫНСКІ

# ПЕВУНЫ ЛЕАНІДА

ГЭТЫ НЕВЫСОКІ, пашарэлы ад часу дамок стаіць у глухім завулку, непадалёку кінатэатра «Спартак». Дашчаны паркан, садок, гародчык. Дамок як дамок, двор як двор. Але кожны, хто праходзіць завулкам, на яго аглядаецца. А то прыстоіць, услухаецца і засвеціцца ўсмешкай. З двара і вокнаў дамка ляцяць, далёка разыходзяцца звонкія птушыныя песні.

... Светлы летні ранак. З варухлівых хмар ніяк не можа выбіцца сонца. Над горадам то ясна, то прыцемна. Перасякаю завулак, адкрываю веснікі ў пявучы двор.

— Ча-абур-рак! — здаецца, папярэджвае гаспадара аб з'яўленні госця белабокая сарока і пералятае з плоту на стрэшку хлява.

Заварочваю за рог дамка і нібы трапляю ў шумны вясновы лес. Пырхаючы па галінках бярозавых камлючкоў, у агромністай вальеры свішчуць, звіняць, заліваюцца дразды, амялушкі, шчыглы, шпакі, берасцянкі, малінаўкі — усіх не пералічыць, а, галоўнае, не пазнаць адразу. Вочы разбягаюцца ад птушынага мноства і, уражаны песеннай разнагалосіцай, я разгублена аглядаюся, не ведаючы, на якім пяюну спыніць сваю ўвагу.

Хто ж уладар гэтага птушынага царства, хто ён, лясны чарадзей? Думаеце, тэткі Лесавік, сівабароды прыгорблены дзядок? Не. Малады, год пад трыццаць мужчына. Рослы, хударлявы, з сінімі, як валошкі, вачыма. Спакойны ў рухах, у слове. Леанід Аляксандравіч Гермацкі, слесар завода імя Леніна, вядомы аматар-птушкавод.

Заходзім у домік.

У крайняй ад вакна клетцы бачу вострахвостага, зграбнага, пёркамі пад колер кары крылаціка.

— Салавей гэты,— прыгадвае Леанід.— зімой проста загіпнатызоўваў усіх, старых і малых, на птушынай выстаўцы, на станцыі юннатаў. Праўда, спяваў толькі першымі днямі. Пасля замоўк. Стаміўся ад шумнага мнагалюддзя, да таго ж, трапіў пад скразняк — гэтая птушка дужа скразнякоў баіцца, мо таму і трымаецца бліжэй да зямлі...

— Аднак жа і багата ў вас пяюноў — на добры гай хопіць, — кажу я.

— Ды за сто будзе.

— І якое ж сёлета месца занялі са сваімі крылатымі салістамі?

— Першае.— спакойна, нібы так яно і павінна было быць, адказвае Леанід.— Глядзіце, які мне прыз уручылі,— і здымае з палічкі, падае мне бярозавага арла.

Нічога не скажаш, таленавітая работа невядомага майстра-разбяра: драпежна сагнутая галава, дзюба, велічны размах магутных крылаў. Міжволі падумалася, што ў таго невядомага майстра і Леаніда ёсць адно агульнае, што яднае іх: любоў да жывой прыроды, да роднай зямлі.

— Цікава, якімі правіламі кіруецца журы выстаўкі, калі прысуджае птушкаводу тое ці іншае месца? — пытаюся я.— Ну, вызначыць, скажам, сілу, сакавітасць голасу канарэйкі спецыялістам няцяжка: тут ёсць, ведаю, шкала ацэнкі. Ёсць спецыяльныя медалі: сярэбраны і бронзавы. А як быць з галасамі дзікіх птушак? Напрыклад, салаўя, валасяніцы, берасцянкі? Няўжо і на іх спеў вынайшлі ацэначную шкалу?

— Не, пакуль няма: не так гэта проста. Дзікія спевакі ацэньваюцца па багаццю калекцыі ў птушкавода ўвогуле і па колькасці ў ёй птушак, якія рэдка пяюць у няволі. Дарэчы, вы от успомнілі пра кенара. Канарэечніку проста: купіў дзе гэтую птушку, даў ёй семя, вады,— і амаль увесь клопат. А нам, «дзікунам», намнога складаней. Трэба спачатку пахадзіць — і не адзін дзень — па лесе, полі, выбраць на слых якога самага галасістага спевака і злавіць. А гэта не заўсёды проста: птушка цяпер стала пудлівай, асцярожнай, надта ж шмат у яе розных ворагаў, і найперш — валацужныя адзічэлыя каты дачнікаў. Здараецца, паўдня сядзіш, пакуль завабіш яе ў лучок. Добра, злавілі. І думаеце канец клопату? Пусціў спевака ў клетку і слухай? Не-е... Калі яго адразу ўпусціш у клетку, то ён як бач разаб'ецца аб яе: што вы хочаце, дзікая. Такую птушку трэба спачатку прыручыць ці, як мы кажам, «вытрымаць». Гэта значыць, пасадзіць яе на тыдні два—тры ў куцэйку, у такі светлы мяшэчак, нацягнуты на драўляны каркас. Тут яна супакоіцца, абвыкнецца. Тады, калі ласка, можна яе і ў клетку... І тады от паўстане праблема корму. Для зернеедных птушак яна вырашаецца прасцей: зрабіў сумесь з прасяных, канапляных ды рапсавых зярнят і ўсё, гатова ежа. А для насякомаедных? Ім мала семя, ім трэба яшчэ і мошка, і чарвяк, і муха, і лічынка. А, напрыклад, для саракушы, пеўчага драпежніка — нават яшчаркі, мышы. Летам — яно яшчэ паўбяды. А зімой што рабіць? Не будзеш жа спецыяльна для іх разводзіць у хаце мух, яшчарак, лягушак! От і лажыве ўжо чацвёрты год: змог чалавек прыдумаць яму патрэбны корм. Зноў жа вучоныя даводзяць, што салаўі ў няволі рэдка калі пяюць. Не, даказвае Леанід, яны будуць спяваць заўсёды, калі іх злавіць вясной да гнездавання, да шлюбнага жыцця, і калі іх добра карміць. А наогул любую птушку ў прыродзе лепш браць птушанём, бо птушанё хутчэй прывыкае да жыцця ў клетцы.

Сваёй даследчай радасцю Леанід шчодра дзеліцца з усімі, хто хоча прычасціцца да яе. І з таварышамі па рабоце, і з суседзямі, і з усімі мінчанамі ў дні выстаўкі птушак. Бо радасць стоеная ў сабе — дужа мулкая. Лёгкай і светлай яна становіцца тады, калі яе раздзеліш з другімі.

З найбольшай ахвотай гэтай радасцю ён дзеліцца з дзецьмі.

Вясновымі днямі Леанід атрымлівае асабліва шмат пісем ад юных аматараў прыроды, арганізатараў школьных «жывых куткоў». У пісьмах заўжды процьма пытанняў: калі лавіць птушак, як прывучаць іх, чым карміць... Леанід ахвотна і падрабязна адказвае на іх.

Міжволі тады прыходзяць да яго ўспаміны, блізкія і далёкія, з маленства — і ён задумваецца: калі ж гэта сам ён «захварэў» любоўю да птушак? Можа, калі маці прынесла маеш голаў, выдумляеш ім ежу. Звычайна я даю сваім гадаванцам напачатку мучных чарвякоў, а пасля прывучаю да канцэнтрату: сумесі мяса, проса і моркву.

Я са шчырым здзіўленнем слухаю Леаніда: ніколі не думаў, што ў такой справе могуць быць нейкія цяжкасці. А найбольш мяне дзівіць яго бязмежная адданасць любімаму занятку. Яго праца, цярплівая і бескарыслівая, без якой ён не змог бы дасягнуць жаданага выніку. Уцеха адкрыцця якой-небудзь новай таямніцы прыроды.

Вось, напрыклад, усе масцітыя вучоныя-арнітолагі сцвярджаюць, што жулан (саракуш) не вытрымлівае жыцця ў няволі. А ў Леаніда Гермацкага ён, скрытны лясны бадзяга,

# ЮБІЛЕЙ ВЯДОМАЙ ПАЭМЫ

*Чарговы вечар у Купалавым музеі быў прысвечаны 40-годдзю з дня напісання Янкам Купалам паэмы «Над ракою Арэсай». На вечар сабраліся шматлікія прыхільнікі купалаўскай паэзіі.*

*Вучоны сакратар музея Алесь Есакоў расказаў аб гісторыі напісання паэмы, аб перакладах яе на іншыя мовы Савецкага Саюза і мовы народаў свету.*

*Як вядома, паэма «Над ракою Арэсай» была напісана Янкам Купалам у выніку яго паездкі ў маі 1933 года на Любаншчыну, дзе легендарныя камунары будавалі новае сацыялістычнае жыццё.*

*Гасцямі вечара былі галоўныя героі паэмы—былыя камунары: Герой Сацыялістычнай Працы, старшыня камуны імя БВА Эмануіл Натанавіч Модзін і яго жонка, былая настаўніца камуны Вера Мацвееўна Модзіна.*

*— Цяжка было асушваць і асвойваць землі. Цяжка было прайсці па балоту не толькі на трактары, але нават падвезці паліва — яго насілі ў флягах, перадавалі з рук у рукі па ланцужку. Дапамагала сяброўства камунараў. Тут выхоўваліся сапраўдныя камуністычныя адносіны да жыцця, да таварышаў, стваралася новае жыццё,—успамінае Э. Модзін.*

*Былы камунар расказаў і аб прыездзе Янкі Купалы ў камуну.*

*Пра сустрэчу Янкі Купалы са школьнікамі і настаўнікамі камуны імя БВА ўспомніла В. Модзіна.*

*У вечары прыняў удзел пісьменнік Алесь Якімовіч. Ён адзначыў вялікае выхаваўчае значэнне паэмы для дзяцей і моладзі.*

*Урыўкі з паэмы «Над ракою Арэсай» прагучалі ў запісу ў выкананні беларускіх артыстаў.*

*Галоўная захавальніца фондаў Ядвіга Юльянаўна Раманоўская расказала, як была ўспрынята паэма «Над ракою Арэсай» беларускімі чытачамі ў 30-я гады.*

**А. СОНЦАВА.**

# САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ У МІНСК!

У Беларускай дзяржаўнай філармоніі пачаўся летні канцэртны сезон. Аматары музыкі сустрэліся з вядомымі зарубежнымі выканаўцамі.

Мінчане знаёміліся з сімфанічным аркестрам Балгарскага радыё і тэлебачання (дырыжор А. Уладыгераў, скрыпач Г. Бадзеў), з польскім арганістам з Кракава І. Грудзіхам, і з італьянскай эстраднай спявачкай Л. Альціеры. Усё гэта было ў маі, а чэрвень пачаўся канцэртам галоўнага аркестра Войска Польскага (мастацкі кіраўнік А. Рэзлер).

Слухачы пачулі ўвертюры Манюшкі да опер «Графіня» і «Галька», рамансы Шыманоўскага «Ля возерка» і «Ляцелі журавы», «Народнае свята» з музыкі Шастаковіча да кінафільма «Авадзень», мелодыі з аперэт Лоў «Мая цудоўная лэдзі» і Ружыцкага «Казанова» і многія іншыя.

З аркестрам паспяхова выступаюць флейтыст Э. Вальчак, ксілафаніст А. Браніцкі і спевакі — Бажэна Кінаш-Затварска, Пола Ліпіньска, Іяланта Кубіцка, Ева Снежанка, Віктар Затварскі, Фелікс Галецкі.

Усю праграму правялі дырыжоры Багумел Сітарскі, Станіслаў Ляцек, Баляслаў Шуля і канферансье Богдан Залеўскі.

Першыя гастролі аркестра ў СССР (аркестр выступаў у Мінску пасля канцэртаў у Маскве, Ленінградзе і Рызе) прайшлі з вялікім поспехам.

**Ул. ЯФРЭМАЎ.**


# *ДАРАГІЯ СЯБРЫ!*

## КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ

**быць заўсёды ў курсе падзей сучаснага грамадска-палітычнага і культурна-мастацкага жыцця рэспублікі — чытайце штотыднёвік Міністэрства культуры і Саюза пісьменнікаў БССР «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»!**

## КАЛІ ВЫ СОЧЫЦЕ

**за навінкамі беларускай прозы, паэзіі і драматургіі, публіцыстыкі, крытыкі і літаратуразнаўства, вы немінуча звернецеся да штотыднёвіка «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»!**

## КАЛІ ВАС ЦІКАВЯЦЬ

**пытанні тэатра, кіно, музыкі, архітэктуры і выяўленчага мастацтва, чытайце і выпісвайце штотыднёвік «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»!**

## КАЛІ ВЫ ЗАЙМАЕЦЕСЯ

**праблемамі працы культурна-асветных устаноў, мастацкай самадзейнасці, вам прыйдзе на дапамогу штотыднёвік «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»!**

## ЧЫТАЙЦЕ І ВЫПІСВАЙЦЕ ШТОТЫДНЁВІК

# «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

*Падпіска прымаецца ва ўсіх паштовых аддзяленнях і канторах «Саюздруку», ва ўпаўнаважаных па падпісцы ў арганізацыях, калгасах і навучальных установах.*

**ПАДПІСНАЯ ЦАНА:**

**на 3 месяцы — 1 руб. 05 кап.**
**да канца года — 2 руб. 10 кап.**


# ГЕРМАЦКАГА

яму, малому, маладзенькага, знясіленага ад голаду і буры грачка, якога ён выкарміў і прыручыў? Ці калі ўпершыню апынуўся з бацькам, заядлым грыбніком, у лесе? У тым, як здавалася яму тады, вялікім і далёкім ад горада, лесе, што ашаламіў, заваражыў яго птушынымі песнямі, роўным пошумам залацістых сосен, які нібы аздабляў і люляў тыя песні. А мо любоў гэтая жыла ў ягонай душы заўжды, як жылі ў ёй сонца, травы і дрэвы, але ён не ўсведамляў яе? Ва ўсякім выпадку, калі ён быў вучнем-пачаткоўцам, у яго ў трох клетках ужо шчабяталі вясёлыя пташкі. Пад гэты час ён ведаў амаль усіх лясных крылацікаў, і сваімі ведамі дужа здзіўляў настаўнікаў і сяброў.

І вось неяк Леанід атрымаў пісьмо, у якім маці пісала, што чагосьці аслепнулі берасцянкі. Устрывожыўся салдат: такога ніколі не здаралася ў яго птушкаводчай практыцы. Напісаў Будаеву і Боўтрыку. Неўзабаве атрымаў адказ: берасцянкі аслепнулі ад канаплянага семя, якім частавала іх апошнім годам маці. Такі корм не для крылатай малечы: у ім вельмі многа алею. Сумесь проса і канопляў — вось іх спажыва.

Пасля арміі хлапчына пайшоў працаваць на завод імя Леніна. Ажаніўся. Сябры Саша і Алег вярнулі яму птушак, і Леанід зноў — цяпер калі і з жонкай — вольны час праводзіў ля клетак, а найбольш на прыродзе: адлоўліваў усё новых і новых лясных салістаў. Радасць ад судакранання з жывой прыродай нібы падвойвала яго духоўную і фізічную энергію, яго працаздольнасць. Наладчык аўтаматаў, ён самастойна авалодваў спецыяльнасцю слесара кантрольна-вымяральных прыбораў. Здаў на трэці разрад, пасля чацвёрты, пяты...

Штогод клетак і птушак у хаце прыбаўлялася, адначасова ўзнікалі і новыя пытанні: чым карміць навасёлаў? Дзе дастаць корм? Пра ўсё гэта ён выпытваў у школе і па-за школай. Яму шанцавала на настаўнікаў. У школе найлепшымі знаўцамі жыцця птушак быў біёлаг і выкладчык малявання. А па-за школай — Уладзімір Іванавіч Будаеў і Барыс Сямёнавіч Боўтрык, добрыя знаёмцы бацькоў і таксама заўзятыя аматары-натуралісты. Гэтыя людзі, між іншым, і цяпер застаюцца для Леаніда самымі аўтарытэтнымі настаўнікамі.

Калі ён скончыў васьмігодку, у яго вясёлай гаспадарцы было ўжо дваццаць птушыных клетак. Леанід паступіў у тэхнічнае вучылішча. Аднак увесь вольны час па-ранейшаму аддаваў любімаму занятку. З птушкамі расстаўся, калі яго прызвалі на вайсковую службу. Леанід раздаў сваіх гадаванцаў малодшым сябрам-птушкаловам — Сашу Мікіцёнку і Алегу Васілеўскаму — няхай гадуюцца ў іх. Дома ж пакінуў нешта з пяток дробных пташак, у тым ліку двух берасцянак, на ўцеху бацькам. Ішоў месяц за месяцам, ішло пісьмо за пісьмом дамоў. І бадай не было таго ліста, у якім бы ён, тэлеграфіст, не ўспамінаў пра сваіх крылацікаў.

Леанід зазірнуў у вакно:

— Ну цяпер усталюецца сапраўднае надвор'е.

І праўда, хмары, як вазы з сенам, у хуткім часе сплылі за небакрай, і ў вокны лінула сонца. Пакой напоўніўся святлом, нейкім на дзіва роўным, туманным. Птушкі яшчэ больш павесялелі, замітусіліся, а валасянка, шэрая мышка ў чорнай шапачцы, уселася на шастку, падставіла пад сонца галоўку і рассыпала звонкі пошчак... Здалося, нібы градзінкі шаснулі па чуйных струнах. Леанід аж заззяў увесь, быццам для яго ўзышло другое сонца:

— Хораша, га? Такая ўжо спявушка... У наддатках за станцыяй Негарэлае ўпаляваў. Давялося намучыцца, насмажыцца на сонцы. Птушка гэтая надта ж асцярожная. У лесе трымаецца найвышэйшых дрэў, а калі ўзбудзіцца на песню, садзіцца на саменькую вершаліну, адкуль паўсвета відно... Доўга мне не шанцавала на славак.

Валасянка ўсё пяе, заліваецца — так пела яна, мабыць, колісь і на старой яліне,— радуючыся сонцу, жыццю і адначасна славячы іх і пачуццё святочнай лёгкасці, светласці поўніць нас.

Мы выходзім з хаты.

— А ведаеце,— паварочваецца на хаду птушкалоў,— што такія, як мая, слаўкі-чарнагалоўкі сілай голасу, хараством яго не ўступаюць самому Салаўю Салавеевічу. І гэта, між іншым, для іх небяспечна: бывае так захопяцца-зойдуцца песняй, што мёртвыя падаюць на зямлю — сэрца не вытрымлівае. І ці дзіва: такі голас і такое кволенькае цельца.

Зноў стаю на падворку ля вальеры, у віры птушыных галасоў. Якая бязладная, рознагалосая і на дзіва прыгожая песня, творца якой — сама Прырода!

— Бачыце таго вунь у чародцы амялушак цёмнапёрага непаседу, подскача? — кажа Леанід, скіраваўшы вясёлы позірк у закутак вальеры.— Гэта гібрыд аўсянкі і кенара. Сам вывеў. Песенька ў аўсяніцы простая, ціхая, а гэты подскач дык голасам увесь у бацьку, толькі колерам у маці. Дужа любіць канарэечнае семя. Да слова, бяда з гэтым семем. Не заўсёды возьмеш яго ў «Прыродзе», у магазіне. Пэўна, каб не бабкі-гандляркі, што круцяцца там заўжды з мяшэчкамі, то можа і не пераводзілася б яно. А так часам хоць плач канарэечніку... Між тым, семя гэтае дарагое, з-за мяжы завозіцца. Добра было б, каб якая школа ці прыгарадны саўгас падахвоціліся вырошчваць гэтую каштоўную і даходную культуру.

— Ча-абур-рак! — нечакана б'е ў вушы картавы покрык, і на плячо суседа весела ўселася сарока.— Ах ты, Чабурашка,— смяецца Леанід і тлумачыць: — Ручная, даўно ў мяне жыве. Не-не, вам яна ў рукі не дасца: адрознівае чужых ад сваіх. Такая ўжо разумніца... І актрыса. Так, так. Летась у фільме «Як яны працуюць» здымалася. І не адна. З дзятлам Рыгоркам — вунь ён, барабаншчык, камлючок дзяўбе — з савой і сойкай, таксама ручнымі птушкамі. Больш, чым месяц, ездзіў я з імі і рэжысёрам Канстанцінам Красніцкім у Налібоцкую пушчу на здымкі. Кінафільм гэты ўжо выходзіць на экран. Здымаліся ў кінанарысе Яўгена Сокалава «Калі пяюць птушкі» і астатнія мае выхаванцы. Ну, годзе, ляці, гуляй,— узяў у рукі сароку Леанід і птушка пераляцела на вальеру.— Пацеха з яе,— шчасліва смяецца ён.— Раніцой, ідучы на завод, выпускаю яе з клеткі. Яна пабавіцца ў Камсамольскім парку, а падвечар, калі я прыходжу з работы, прылятае дамоў. Часам і на аўтобусным прыпынку мяне сустрэне.

— Ча-абур-рак! — усхопліваецца і пралятае над нашымі галовамі сарока.

Мы азіраемся. Падворкам ідзе статная маладая жанчына з хлапчуком у вязанай шапцы.

— Тата! — кумельгам да Леаніда кідаецца хлопчык (гарошынкі вачэй чыста-сінія, як у бацькі).— А я ў парку бачыў дзятліка. Ён быў такі, як наш Рыгорка. Рыгорка-а! — гукае, пастуквае па дроце вальеры Андрэйка.

Дзяцел коратка чэкае і зноў барабаніць па сваім камлючку: маўляў, не замінай, я працую.

Тады хлапчук хістаецца да шпака:

— Ой, у цябе сёння новая песня!

Я прыціхаю, сапраўды, шпак сядзіць на галінцы пеньчука і, паводзячы шыйкай, пяе... салаўём. Аглядаюся на Леаніда: твар адухоўлены, прасветлены ціхім унутраным святлом. Губы ледзь прыкметна паторгваюцца — здаецца, што чалавек падпявае птушцы. Прыходзіць думка, што кожны, хто ўбачыў бы яго ў гэты ці падобны гэтаму час, сказаў бы, што няма на свеце чалавека шчаслівейшага за яго, што ў яго свеціца-пяе душа.

г. Мінск.

Генадзь КЛЯЎКО

## НА КНІЖНАЙ ВЫСТАЎЦЫ

*— Выданне — цуд!*
*— Выданне — ўзор! —*
*Казалі знаўцы афармлення.—*
*Які дзівосны каленкор!*
*А супервокладка!..*
*Цісненне!..*

*Выданне — цуд!*
*Ды кепскі твор.*
*Не той, як кажуць, каленкор.*

## НА ВЫДАННІ...

*Выдавецтва ў ліхаманцы —*
*Паэтэса выдаецца!*

*Успомніць той аб роднай мамцы,*
*Хто рэдактарам завецца.*

*Ну, а кніжка — толькі назва.*
*На прыманку клюне смелы.*
*Там падгладжвай,*
*Там падмазвай,*
*Каб хоць нейкі выгляд мела.*

*Выціскай бурду пад прэсам...*
*Тлуму — з ранку да змяркання.*
*Іншы скажа: — Паэтэса?..*
*Ці... нявеста на выданні?*

## РАЦПРАПАНОВА

*Вершы чытач прачытаў і забыў.*
*Ды ўспомніў пазней ён крышки:*
*Адзін з іх, здаецца, нядрэнны быў...*
*Цяпер гартай усю кніжку!*

*Вершы здавайце ў друк...*
*Але пери*
*Такая ёсць прапанова:*
*Па балаболцы чапляць на верш,*
*Як пастухі*
*ў гушчары каровам.*

Рыгор ЯЎСЕЕЎ

## КЕМНАСЦЬ

ЖАРТ

**Напэўна, быў хітры,**
**Быў кемны Хрыстос,**
**Калі да народа**
**З'явіўся з нябёс.**
**Чаго ён спачатку**
**Паджгаў да кабет!**
**Каб вестка хутчэй**
**Абляцела ўвесь свет.**

Мал. А. СМОЛІЧА. Салігорск.

# ДЗЕЦІ ЯК ДЗЕЦІ

**Мне часта даводзіцца быць у вясковых школах. З сачыненняў і анкет па пытаннях прафарыентацыі я выбраў некалькі, на мой погляд, цікавых выказванняў дзяцей аб прафесіях, захапленнях.**

**М. ЦІШЧАНКА.**

— Які прадмет табе лягчэй даецца?

— Нямецкая мова, бо амаль усе словы ёсць у слоўніку, а некаторыя я ведаю.

(Лена Г.).

— Кім ты хочаш быць?

— Я люблю, як пахне бензін аўтамабіля. Хачу стаць шафёрам-кабардзінцам.

(Валодзя К.).

— Прафесія паэта вядома мне з першага класа. Спрабаваў пісаць вершы ў сваёй практыцы. Нешта выходзіла, можа, стану паэтам. Але я хачу прыносіць карысць сваёй працай, таму хачу працаваць трактарыстам.

(Алесь Д.).

— Больш за ўсё мне падабаецца прафесія «Гіпралесгас». Там праца нескладаная: летам ездзіць па розных мясцовасцях, а зімой сядзець у цяпле і лічыць на лічыльніках ва ўпраўленні.

(Надзя М.).

Джэймс ТЭРБЕР

ЗША

— ГЭТА БЫЛА самая недарэчная памылка,—сказала амерыканка, з якой мяне звёў лёс у адным з атэляў азёрнага краю на поўначы Англіі. —Але кніжка ляжала на прылаўку разам з іншымі кніжачкамі серыі «Пінгвін»—такія, ведаеце, маленечкія томікі па шэсць пенсаў у каляровых вокладках. Я і падумала, што гэта дэтэктыў, і купіла, не зірнуўшы нават на назву. Калі потым убачыла, што гэта Шэкспір, ледзь не самлела!

Я прамармытаў нешта спачувальнае.

— Розуму не дабяру,—гаварыла жанчына,—чаму «пінгвінаўцы» гэтыя выдаюць творы Шэкспіра гэтак жа, як дэтэктывы.

— Здаецца,—уставіў я,—вокладкі ў іх рознага колеру.

— Можа і рознага, але я не звярнула ўвагі. А познім вечарам ямчэй уладкавалася ў пасцелі, наперад смакуючы кніжку, і раптам бачу: «Трагедыя Макбета для школ другой ступені»! А я ўжо настроілася на навінку Агаты Крысці ці нешта накшталт гэтага. Эркюль Пуаро — мой любімы сышчык.

— Гэта той, што з трусамі важдаецца?—пацікавіўся я.

— Што вы!—запярэчыла дама-эксперт па дэтэктыўнай літаратуры.—Пуаро—бельгіец. Вы, пэўна, маеце на ўвазе містэра Пінкертона, які дапамагаў інспектару Булю. Таксама хлопец неблагі.

За другім кубкам чаю суседка па століку пачала расказваць нейкую жахлівую гісторыю, якая трымала яе ў напружанні аж да апошняй старонкі.—нешта, помніцца, пра старога фамільнага доктара. Але я перабіў яе:

— Скажыце, вы прачыталі «Макбета»?

— А што ж было рабіць?—адказала дама.—Ва ўсім нумары не было і шматка друкаванай паперы!

— І вам спадабалася?

— Не!—рашуча адказала амерыканка.—Па-першае, я ні на момант не паверыла, што гэта зрабіў Макбет.

— Што зрабіў?

— Не паверыла, што ён забіў караля. І што ў гэтым заблытана лэдзі Макбет. Вядома, на такіх персанажаў часцей за ўсё падае падазрэнне, але менавіта яны ні ў чым не вінаваты.

— Баюся,—пачаў быў я,—што я не зусім...

— А чаго тут не разумець?—загарэлася амерыканка.—Калі б чытач адразу здагадаўся, хто забойца, усё б граша ламанага не каштавала. Шэкспір хітры, як д'ябал. Я нават чула, што некаторыя падазравалі самога Гамлета, таму наўрад ці Шэкспір зрабіў бы Макбета такім прасталінейным, як таму-сяму здаецца.

У задуменні я набіў тытунём люльку.

— Каго ж вы падазраяце?—запытаў я.

— Макдуфа,—упэўнена адказала жанчына.

— О, божа!—прашаптаў я.

— Так, так, гэта яго рук справа, няма ніякага сумнення,—прамовіла спецыялістка па кніжных забойствах.—Эркюль Пуаро адразу вывеў бы яго на чыстую ваду.

— Як жа вам удалося напасці на яго след?

— Прызнацца, не адразу. Спачатку думала на Банка. Але потым, вядома выявілася, што ён—ахвяра нумар два.

— Вунь яно што!

— А што вы здзіўляецеся? Чытача трэба агарошваць. Дык вось, пасля другога забойства я нават разгубілася—не ведала, на каго і падумаць.

— А можа на каралевічаў—Малькольма і Дональбайна? Яны ж, помніцца, уцяклі і схаваліся пасля першага забойства. Вельмі падазрона.

— Не, бо занадта,—запярэчыла амерыканка.—Той, хто ў такіх выпадках уцякае, ніколі не бывае вінаватым, паверце майму вопыту.

— Ці не выпіць мне кілішак каньяку?—прамармытаў я і паклікаў афіцыянта.

Мая субяседніца даверліва нахілілася да мяне—вочы яе гарэлі, а кубак дрыжаў у руцэ:

— Памятаеце, хто першы ўбачыў цела Дункана?—запытала яна.

Я паскардзіўся, што памяць падводзіць.

— Цела знаходзіць Макдуф,—паведаміла яна, перайшоўшы на цяперашні час.—Потым ляціць уніз па лесвіцы і крычыць: «Бязбожнае забойства ў храм святы ўварвалася і выкрала жыццё!»—Дама паляпала мяне па калене.—Усё гэта было загадзя адрэпеціравана. Вы б гэтак без падрыхтоўкі не сказалі, калі б раптам убачылі забітага чалавека, ці не праўда?—Яна ўтаропіла ў мяне зззяючыя вочы.

— Я...—пачаў я.

— Правільна! Вы б гэтак не сказалі. Калі б, вядома, загадзя не прарэпеціравалі. Чалавек невінаваты проста крыкнуў бы: «Божа мой, забілі караля!»—Амерыканка адкінулася на спінку крэсла, і ў вачах яе загарэўся пераможны агеньчык.

Я задумаўся. А потым запытаў:

— А як быць з ахвярай нумар тры? Вы ж ведаеце, шэкспіразнаўцы ўжо тры стагоддзі ламаюць сабе над гэтым галаву.

— Бо ніводны з іх не падумаў пра Макдуфа,—адказала дама-крыміналіст.—Гэта яго работа! Дзе вы бачылі, каб хоць адна з ахвяр была забіта звычайнымі душагубамі! Злачынца павінен быць заўсёды важнай персонай.

— Але як наконт банкету?—спытаў я праз нейкі час.—Як вы тлумачыце прызнанне Макбета, калі ў зале з'яўляецца здань Банка і садзіцца ў крэсла?

Амерыканка зноў паляпала мяне па калене:

— Ніякай здані не было. Здароваму, моцнаму мужчыну не мроіцца прывіды ды яшчэ ў ярка асветленай зале ў прысутнасці дзесяткаў жывых людзей. Макбет знарок рабіў гэта—некага асланяў.

— Каго?

— Жонку сваю, лэдзі Макбет, каго ж! Ён думаў, што гэта яна забіла Дункана, і хацеў прыняць віну на сябе. Сапраўдныя мужы заўсёды так робяць, калі на іх жонак падае падазрэнне.

— Але ў такім выпадку які сэнс мае сцэна, калі лэдзі Макбет ходзіць у сне?

— Такі ж самы, толькі наадварот, — сказала мая субяседніца.—Цяпер ужо яна яго пакрывае. Лэдзі Макбет зусім і не спала. Памятаеце, там ёсць аўтарская рэмарка: «Уваходзіць лэдзі Макбет са свечкай»?

— Здаецца, ёсць.

— Дык жа людзі, што ходзяць у сне, ніколі не носяць з сабой свечак! — урачыста прамовіла мая суседка. — У іх ёсць другі зрок. Ці чулі вы калі-небудзь, каб лунацікі цягалі з сабой свечкі?

— Не,—адказаў я.—Такога ніколі не чуў.

— Дык вось жа—яна не спала! Прыкінулася вінаватай, каб выгарадзіць Макбета.

— Глынуць ці што яшчэ каньячку, — сказаў я і даў знак афіцыянту.

Калі ён прынёс на падносе кілішак, я паспешліва перакуліў яго і падняўся з-за стала.

— Ці не пазычыце вы мне гэтага «Макбета» на адну ноч? Хачу яшчэ разок зазірнуць. У мяне такое адчуванне, нібыта я гэтую п'есу ніколі як належыць не чытаў.

— Добра, прынясу,—заззяла амерыканка.—Вы самі пераканаецеся, што праўда на маім баку.

Пераклаў з англійскай
Сямён ДОРСКІ.

«Літаратура и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 АТ 06787

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі—33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—33-25-25, адказнага сакратара—33-44-04, аддзела літаратуры — 33-22-04, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33 24-62, аддзела публіцыстыкі — 33-21-53, аддзела культуры — 33-24-62, выдавецтва — 32-22-19, бухгалтэрыі — 32 15-87.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Х. Д. ЖЫЧКА.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. Ц. БАЖКО, Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, А. С. ГРАЧАНІКАЎ, Ю. П. ГРЫГОР'ЕЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ, Л. Я. ПРОКША, Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.